б-ка
1532

УЗВЫШША

ЧАСОПІСЬ

ЛІТАРАТУРЫ, МАСТАЦТВА І КРЫТЫКІ
БЕЛАРУСКАГА ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАГА ЗГУРТАВАНЬНЯ „УЗВЫШША“

Инв. 1533 г.

№ 8

ЧАЦЬВЁРТЫ ГОД ВЫДАНЬНЯ

ГОСУДАРСТВЕННАЯ ОРДЕНА ЛЕНИНА БИБЛИОТЕКА СССР

МЕНСК—1930

З Ь М Е С Т

	Стар
Алесь Зарыцкі—З цыклю „Дрэваапрацоўчы комбінат“	3
Кузьма Чорны—Ідзі. Ідзі. (*роман*)	9
Максім Лужанін—Сьлівень паказвае рогі	31
В. Сташэўскі—Гарачы віхор *(п'еса)*	38
С. Дарожны—На ўдарных франтох	64
Крапіва—Хвядос—чырвоны нос	67
Ю. Таўбін—На ўвесь свой дужы рост	84
Максім Лужанін—Думкі пра поэзію Валерыя Маракова	86
В. Зубко—А. Звонак—„Каршун“	103
З. Мялкіх—М. Гольдбэрг—„На рыштаваньнях“	106

Галоўлітбел № 3426. Зак. № 434—700 экз. „Палесдрук“, Гомель.

Алесь Зарыцкі

З цыклю „Дрэваапрацоўчы комбінат“

Дзень індустрыялізацыі

Густое мядзянае рэха
Гудкоў залівае завод.
Першая зьмена
лесапільнага цэху
Пашла на агульны сход.

Кепкі, апырсканыя пілавіньнем,
Цяклі да цэхкому паводкай нястрымнай.
.. Та-ва-ры-шы лесапільнікі,
Першае пытаньне—
аб дню індустрыі.
Словы прамоўцы—
гарачая лава,
Шчырасьць сонечнчх ручаін:
— Мы ахвяруем
пролетарскай дзяржаве
Пяць баявых
ударных гадзін.
А рамшчык, кучаравы
Пінскер Ёсель
Устрасануў чорным кужалем галавы:
— Што значыць пяць?
Адпрацуем восім,
Восем напруджаных, баявых.
І сонца
тры сотні рук налічыла,
Узьнятых у парыўчым імкненьні,
І доўга барвовым вокам бычыным
Пазірала праз воблак з зьдзіўленьнем.
А на заводзе сьпявалі пілы
і пыл мэталёвы—
ляцеў з Піластаўні.
Білі аб білы мастоў
чыгуным крыльлем
Гудкі
і плылі
над забярэзінскімі кустамі.

Я сэрцам прырос

„Расьпісаў дзевятага маю
аб тым,
Што ўспалюбіў цябе,
мая ясачка,
аж загарэўсі
Пом. цыркуляршчыка
Мікола Рэўзін“.

Пісулька на бруднай падлозе
ў курылцы—
Рабочага сэрца вясновая імпрэсія.
Адчуваю, што сэрца маё загарыцца
Ад гэтага няпісьменнага „загарэўсі“
І чамусьці ўспомнілася зіма.
Сівер.
Гудок.
Грудзі на розхрыст,
Бяжым да сталоўкі
І крычыць, на хаду,
Андрэй Блімак,
Захліпаючыся марозным россыпам.
Хлопцы, за гэтыя поўгадзіны
У ўдарным парадку,
як адзін, ўсе
І пашамаць,
і пакурыць
пасьпець павінны,
Паколькі мы-авангард пролетараў БССР.
І хваля вясновая
плёхнула ў сярэдзіне,
І бегчы было гэтак лёгка
. . . . . .
Гэта з сьнежаньскай застыглай Бярэзіны
Пачуўся вясновай паводкі клёкат.
І цяпер, калі я пісульку трымаю—
Рабочага сэрца песьню вясновую,
Гэткія-ж струменьні да горла ўздымаюцца
І просіць рука—аловак.

І я адчуваю
(як ніколі),
Што сэрцам прырос
да блізкіх і простых
Блімакоў і Міколаў,

Прырос кожным
атамам
маёй істоты.

Прамова таварыша Блімака на вытворчай нарадзе

(Зварот да адм. тэхнічнага пэрсоналу цэху)

Мабыць кроў у вас
ня гэтак пяе,
Як у маіх жылах гарачых—
Кажу бяз гэстаў,—
я ня поэт,
— Я вылучэнец,
учарашні рамшчык.

Я суровую школу
варштата прайшоў
І акадэмію грамадзянскай бойкі,
І на канёх об'ектыўных умоў
Вам выяжджаць не дазволю болей.

Я бачу:
— пролетар за пяцігодку—
Кожным атамам,
кожнай жылай.
Дык дай шлях
веснавой паводцы,
Сэрца швыргні
у подых машыны.

Мы з саматужніцтвам
адвеку звыкліся,
Адвеку звыкліся браць на пуп,
А тут звар'яцелы танец „Баліндэрсаў“,
У тры тысячы вольт
заводзкі пульс.

І цяжка даецца пераход
Ад заводзіка да махіны,
Таму што старое
— аць,
два,
на
ход—

Родная нам стыхія.
І вось вам факт:
Калі ўчора
ля першай вагонкі
зламалі падачу,
Дык зьнялі зусім,—
націскай плячом,
Колікам
зноў
наварачвай.
Кажуць—
навошта для піл падвескі?
Лепш пастарому
— „бяры на кліны“,
Дык гэта-ж калецтва
— зарэз, а ня рэзка.
Ізноў з калод
пячымуць „бліны“.
Трэба нарэшце
усім зразумець,
Што гэта заводзішча,
а не завод;
Што кожны момант
—кубамэтр,
Кожная хвіліна
—пяць калод.
Адчуваеш за кожную шайбу боль—.
З табою льга жыць,
табе льга верыць.
Адкіньма сьлінявыя жарты ў бок,
Калі ад піл узьнімаюцца ветры.
Калі-ж у качагарцы
ня хопіць дроў,
Калі ў прамфінпляне прарыў,
Ты нам наконт об'ектыўных умоў
Не напявай,
не гавары.
Націскай на ўсе застаўкі,
Сэрца швырні
у подых машыны,
І мы падтрымаем запал атакі
Кожнай капляй крыві,
кожнай жылай.

Залп з засады

І куды-ж, куды-ж вы,
хлопцы, падаліся
У гэткую сьлізговіцу,
у гэткую цёмнач?
Восень ужо, восень ужо.
коні падаліста
Капытамі грукаюць
над ёўнямі.
І ішлі сасоньнікам,
і ішлі алешнікам,
Чубы
калматыя
долу ня зьвешвалі.
Тры абрэзы
і кольт,
Стынь зялеза
пад рукой.
. . . . . .
На дарозе—
цок,
цок.
Капыты,
капыты.
Палец на курок—
застынь.
І на маўклівым сходзе
цішыні
І вышыні
Апошняе слова сказаў
Залп
партызан.
. . . . . .
Ціш. Лістапад. Сухотным румянцам
Ручаіны заліў маладзік.
Толькі гадзіньнік на руцэ пазнанца
Цікае па—
ціху:
цік,
цік,
цік.
. . . . . .

Летась ён—парабак Антэк,
Учора
— улан,
сягоньня
— труп,
А ў вершах
— вайны рамантыка —
— Рокат
трывожных
труб.

А над Віслай, Віслай
Матчын лямант вісьне.
Ой па сыну плакала
Маці каля Кракава.
Плача ў Любліне:
— Ясю, мой любы.
Плача ля Ўладавы:
— сыне Ўладыславе,

Кузьма Чорны

Ідзі. Ідзі

Роман [1])

Разьдзел трэці

I

Добра занялося на дзень, як Зыдор Пніцкі пачаў варушыцца у хаце. Звыклым парадкам ён усьцягваў на сябе свае латы—закарэлыя ў зямлі нагавіцы, вечны свой кароценькі кажушок бяз воўны; укорзваўся ў лапці... Усё гэта рабілася некалькі хвілін; ён і не сьпяшаў лішне, а так усё ў яго адбывалася шпарка. З гэтае трапятлівасьці ён анучы як мае быць у аборы не ўвабраў, і яна зараз-жа павісла над ею, як сьвіное вуха. Ён прысеў да нізенькага стала, пасёрбаў з гаршка ўчарашняга квасу з грыбамі; чорныя казьлякі аж скрыпелі ў зубах яго, як ён іх дробненька жаваў. На хадзе закруціў ён на шыю вераўчаны нейкі шалік, закурыў ля чорнага прыпеку прысадзістае печы і рушыў да дзьвярэй. З печы спаўзла жонка яго, вышэйшая ад яго ростам жанчына; закручваючы зьлямцованыя за ноч валасы на галаве, яна гаварыла:

— Калі будзеш браць з сабою хлеб, Зыдорка, дык той пад настольнікам, чарсьцьвейшы.

— Ня буду браць,—адказаў ён і ляпнуў дзьвярыма.

Гэтакая гаворка адбывалася кожную раніцу: ніколі ён, выбіраючыся на работу, ня браў з сабою хлеба на полудзень, а клапатлівая жанчына кожны раз успамінала чарсьцьвейшы кавалак хлеба.

Уночы быў дождж, на няроўным Пніцкага двары стаяла вада; птушкі крычалі на стрэхах усялякіх яго дробных, спарахнелых, гаспадарчых прыбудовак; заўсёды пустая падпаветка на дровы, заўсёды з адчыненымі дзьвярыма сьвінушок... Сані, тыя самыя разваліны, што доўгія гады пад'яжджаў ён на іх усё пад станцыю, каб „абарваць з пасажыра паўрубля якога", стаялі прыпёртыя да суседняе сьцяны. Панарад—адно кола бяз шыны—стаяў пасярод двара, насупроць ганка. Зыдор мінуў усё гэта шпарка, як-бы ніякага інтарэсу яму да ўсяго гэтага ня было. Ён вышаў на вуліцу, пускаючы дым угару. Хмурнае неба вісела нізка; вуліца была пустая; за агародамі на нізкай паплавіне зьвінела дажджавая ручаіна. Зыдор мінаў пустыя хаты старога мястэчка, ішоў няроўнаю сваею хадою. Прыпыніўся ён толькі на момант ужо ў полі, насупроць вузенькае палоскі—на ёй весела руней малады засеў ярыны.

---

[1]) Гл. Узвышша №№—4-5, 6,7

Палоска была ўшыркі крокаў чатыры, з гарбом на сярэдзіне, а ля самых меж ня сышла яшчэ пасьля ночы дажджавая вада.

— Ах, якая няўдалая штука,—сказаў сам сабе паціху Зыдор,—ля меж за вясну вымакне, а на гарбе за лета высахне.

І пашоў далей, паглядаючы перад сабою ў дарогу. Дарога загарбацілася раптам і гэтак-жа адразу ўпала ўніз, і там хмызьнячок курыўся ўжо ледзь прыкметным засьцілам туману. Ядловец быў мокры, крушыньнік купчасьціўся над ім і саступаў пакрысе дарогу росламу алешніку. А там ўжо Пнівадка дала ў нос неабдымным водырам павольнае вады. Тут сьцяна хвояў высока над ею, іх прарэзала новая дарога, а з другога боку—балотная разьлегласьць. Там, у адным месцы, курэў сіненькі дымок. Раптам вырваўся за плячыма ў Пніцкага гудок. Ён азірнуўся на момант, звыкла, гэтак як і кожную раніцу, можна сказаць, усё на гэтай самай мяжы поля й хмызьняку. Адно фабрычны комін чарнеў за ўзгоркам; чорны струменьчык дыму ўзьнімаўся з коміна і раставаў у хмарным небе. Гудок крычаў доўга, і цяпер Пніцкі зусім выкінуў з памяці, з думак горб на сваей палосцы і ваду ля меж... З гэтае вясны гэта быў ужо бабскі клопат. Яна—хударлявая, бяз меры клапатлівая жанчына, ўсю вясну пятрэла адна на палосцы гэтай з плугам і драўляною бараною, агрубелым на ветры голасам падахвочваючы да работы лянога ад старасьці і голага балотнага сена каня. Зыдор агледзеў толькі панарад, з лёгкім одумам дастаў з гары кола бяз шыны і, бяз вялікае заклапочанасьці, узьдзеў яго на вось. „Бабе забаўка“—як-бы хацеў сказаць у гэтую хвіліну яго спакойна позірк. Толькі раз у яго была зьявілася думка: а што калі, акінуўшы гаспадарку, прападу на сьвеце? Гэта калі жонка сказала раз:

— Гэтая-ж работа на балоце ня вечная. Скончыцца, а тады што?

Але йначай нельга было: корпацца дзень у дзень на гаспадарцы і хадзіць дзень у дзень на работу ніхто ня мог-бы патрапіць. Дык ён і махнуў рукою. І вышла так, што нават як-бы лепш усё зрабілася. Пачалі заводзіцца ў хаце грошы, дык пачала пакрысе выводзіцца й нішчымніца. Чорствы кавалак хлеба не пагоршаў, нават палепшаў, а жонка што менш глядзела хаты, а ўсё поля, гэтак сама як раней была заклапочаная. Хата ад гэтага ня зьліняла, сьмецьця ў хаце больш ня стала, анучы з палатак не прапалі. Наадварот, неўзабаве Зыдор купіў жонцы ў коопэратыве добрую ватовую вопратку на сьвята. Сам-жа пра сябе ён ня прывык лішне дбаць. Гэтак і прайходзіла вясна. Ён і сам не заўважаў, як вельмі шпарка адвыкаць пачаў ад свае ранейшае местачковае клапатлівасьці, ад важданьня з канём, ад немачы гэтага небаракі каня. Таксама ня думаў ён, ці моцна жыла ў сэрцы яго гэтая капеечная адвечнасьць.

Цяпер, як ішоў ён, ніякія дробныя непазбыўныя клопаты ня мучылі яго. Гудок на фабрыцы прымусіў яго паддаць ходу. Ён неўзабаве мінуў масток над рэчкаю і пашоў хвойным берагам. Чуваць

было яму тут як непадалеку чмыхае ў лесе пільня, а праз хвілін дзьве, вышаў на прагаліну. Некалькі знаёмых хат туліліся да зямлі; з каміноў ішоў дым. Ля варот людзям ён даваў дзяндобры. За хатамі стаяў новы барак. Там варушыліся людзі. Людзей было шмат. Усё, можна сказаць, былі яму тут знаёмыя ўжо, твары гэтыя ён бачыў тут кожны дзень, але, разам з тым, нікога вельмі ён тут і ня ведаў. Гаворка тут была ўсялякая, людзей прысылалі некалькі раз з розных мясцоў. Чуліся тут, апроч тутэйшых сваіх людзей, украінцы, расійцы, нават заўважыў раз Пніцкі двух цыган. Палуднуючы, ён падышоў бліжэй да іх і чуў, як яны нешта гаварылі паміж сабою. Ён усьміхнуўся няма ведама чаго і падышоў яшчэ бліжэй.

— Здароў, бацю!—сказаў ён да аднаго.

Цыган цмокнуў языком і падміргнуў яму.

Тручыся паміж новых людзей, Пніцкі нават і сам пачаў часамі трапляць у тахту іхняе гаворкі. Ён пакрысе пазнаваў, што некаторыя тут таксама, як і ён, нядаўна яшчэ нічога ня ведалі, апроч гнілое саламянае страхі, ды трох якіх вазоў гною на поле з-пад аднаго худога каняняці. А былі й гэтакія, што прайшлі за жыцьцё сваё сьвет. Гэтыя былі байчэйшыя, гаварылі моваю нейкаю нязвыклаю Зыдоравому вуху. З гэтымі ён не адважваўся пачынаць яшчэ блізкае сяброўства. Былі-ж і блізкія Зыдоравы суседзі: з блізкіх вёсак, нават з самае Чарніцы. Гэтыя—некаторыя, робячы тут, страшэнна дбалі пра дамоўку, кожную капейку, як мурашкі ў свой мурашнік, цяглі дадому і ашчаджалі яе. Толькі й гаворкі ў іх было што пра гэтыя хатнія справы. Некаторыя-ж гэтак, як і сам Зыдор, з лёгкаю душою адыходзілі кожную раніцу ад свае непазбыўнае дагэтуль хатняе спарахнеласьці.

Барак быў доўгі і нізкі. Плякаты і абвесткі віселі на яго новых жоўтых сьценах, ля нізенькага ганку ціснуліся людзі. Зыдор падаўся туды.

— Здароў,—гукнуў ён знаёмаму цыгану.

Той рухава сунуў яму сваю руку.

Заглядаючы ўсім у вочы, Пніцкі пачаў прыслухоўвацца да гаворкі. Ён пачуў голас:

— Гэта пасьля можна будзе. Знайшлі час! Таварышы, цяпер пара разыходзіцца на работу. Зараз на фабрыцы другі гудок будзе.

Пніцкі згадзіўся з гэтым: калі што важнае, дык не пара гаварыць цяпер, ня ўсьпеюць. Гудок, праўда, мог быць кожную хвіліну: тут фабрычны гудок з Чарніцы быў дармовы сыгналізатар.

Тымчасам ён пачаў прыслухоўвацца да гаворак.

„Трэба ўзмацніць тэмп падрыхтоўчых работ, каб першага траўня льга было зрабіць закладку галоўнага будынку электрастанцыі.“

„І так тэмпы шалёныя, як тут яшчэ больш?“

„А табе каб абы варушыцца!“

„Што мы? Мы тут нічога. Самае важнае каб, цагельня справілася, каб быў заўсёды запас цэглы...“

Пніцкі адчуваў: найбольш налягаюць на цагельню. Што тут, чаму гэта ўсё, ён яшчэ не разумеў. Але ўжо стараўся як мага больш пачуць усяго: ён працаваў у цагельні. Абазваўся з фабрыкі гудок, і людзі засьпяшаліся; натоўп заварушыўся. Зыдор папоўз сьледам за ўсімі. Пакрысе пачалі расплывацца людзі кожны ў свой бок. Цесьляры выбягалі з баракоў, размахваючы на хадзе казённымі сякерамі; пратаптаная і выцерабленая ў гушчырні лесу сьцежка шпарка ўбірала іх у сябе. Струмень грабароў паплыў у тумановую разьлегласьць з рыдлёўкамі. Цагельшчыкі, завязваючы тут-жа бразантовыя хвартухі, пашлі на палявы лог, дзе гарбаценькія хаткі задымілі ўжо кожнадзённым ранішнім дымам. Каміны ледзь выглядалі з віхрастае саломы на стрэхах, і дым з іх ападаў адразу на растрыбушаныя платы навокал. У тумане ўзыходзіла сонца. Яснасьць кралася паволі, туман заружавеў, ласкавая ўсьмешка паплыла навокал. Гуман ападаў, на полі было ўжо зусім чыста. Цагельшчыкі зьбіраліся павольна, а там ужо раньнія пачалі работу. Пніцкі паплёваў на рукі і палез з рыдлёўкаю ў раскапанае глінішча.

„Як той казаў, каб ня схлусіць, пачнём паволі“.

І яшчэ раз паплёваў на рукі і ўсадзіў радлёўку ў размоклую за ноч гліну. Глінішча было глыбокае, на ўзровень яго галавы, толькі неба, ўсё больш і больш яснае, было відаць яму з ямы. Навокал хадзіў шум працы: з лесу стукалі сякеры, шоргала моцна ў лесе пільня: тры зьмены круглыя суткі не давалі ёй заснуць. Недзе тут і над самаю галавою грукалі, стукалі, моцна гаварылі. Укопвалі нейкія слупы, падвозілі цяжкія пакі—ён ведаў: устанаўляць—будуць машыну, якая будзе мяць гліну, рабіць цэглу, можа нават сама й капаць гліну. Што-ж гэта за прыстройка гэтакая, ён ня ведаў таксама, як ня мог выразна разабрацца, што пачало рабіцца на сьвеце тут. Цэлымі сотнямі зьяўляліся новыя людзі, зьменьвацца пачала нават мясцовасьць: балота разьбівалі на роўныя дзялянкі; незадоўга яно будзе сухое, у гэта ён верыў, бо слухаў уважна чарнявага маладога чалавека, прыяцеля новае Чарніцкае дакторкі Галены. На станцыі торп будзе пераганяцца на электрычную энэргію, іншыя кавалкі балота пойдуць пад засевы; раптам нечакана выростаць пачалі драўляныя будынкі, пакуль часовыя баракі; самы лепшы барак будаваўся муляром. Яны павінны будуць сабрацца неўзабаве, перад закладкаю галоўнага будынку. Ён сам цэлую ўжо вясну ня браўся за пугу, каб паганяць свайго зьежджанага каня, цэлымі днямі ён ня быў дома, пры ходзіў толькі начаваць, і шмат гэтакіх, як ён, суседзяй яго таксама, як і ён, уцягваліся ў новы парадак жыцьця, адрываючыся ад старога. На мяжы хмызьнякоў і поля выростаў з дошчак і бярвеньня пасёлак, дзе людзі не асталёўваліся як мае быць, а жылі толькі сёньняшнім днём, часта мяняючыся, прыходзячы сюды часамі нават як-бы з за

сьвету. Вочы яго толькі бачылі ўвесь гэты нячуваны процэс, думкі-ж толькі патроху дайходзілі да таго, каб разабрацца ў парадку яго. Усё адно, як жоўтае лісьце з крушыньніку і алешніку ўвосень цягне Пнівадка па вадзе сваёй у новую разьлегласьць, гэтак новая плынь уцягвала яго. Ён адчуваў, што гэта не на жарты, што гэта зусім і назаўсёды, і чамусьці яму было лёгка. Гэтакае можа быць адчуваньне ў чалавека, які, нічога ня трацячы, цьвёрда спадзяецца неўзабаве знайсьці штосьці добрае на сваёй дарозе.

Пніцкі кідаў гліну разам з усімі, часта паплёўваў на свае рукі, паглядаў навокал сябе. Крокаў за пяць ад яго, цераз двух суседзяй, кідаў гліну белазубы цыган. Той, відаць, яшчэ ўсё прывыкаў да новае работы, хутчэй ад ўсіх таміўся, часта выяўляў жаданьне закурыць. Пніцкі міргнуў яму, і той бліснуў зубамі, сьмяючыся. Навокал было толькі шорганьне рыдлёвак і часамі ціхія галасы людзей. Гэтак ішло да полудню, пакуль зноў не абазваўся гудок на фабрыцы ў Чарніцы. Абмываючы тут-жа ў дажджавой вадзе рукі, людзі таўкліся на адным месцы: некаторыя садзіліся тут-жа і пачыналі жаваць свой хатні полудзень; гэта былі людзі тутэйшыя; яны яшчэ ня прывыклі траціць кожны дзень дробныя грошы на гарачы абед у страўні. Гарачаю страваю яны здавольвалі сябе ўвечары дома. Але найбольш людзей бегла ў страўню. Там, патоўкшыся колькі хвілін у чарзе, яны нясьлі на сталы аберуч міскі з стравою. Сярод гэтых быў і Пніцкі.

У вялікай нізкай страўні абед падыходзіў да канца. Ужо некаторыя нават круцілі махорку ў газэтную паперу. Некалькі чалавек увайшло і спынілася ля дзьвярэй. Пніцкі пазнаў перш за ўсё Бародзіча, пасьля ўбачыў у натоўпе Мікалая Нахлябіча. „Нешта будзе", падумаў Пніцкі весела, усыпаў у паперу махоркі, пачаў круціць і апаражніў месца за сталом. Ён падаўся туды да дзьвярэй. Тут-жа у дзьверы пачалі зьбірацца знадворку яшчэ рабочыя, зрабілася цесна. Малады мясцкомавец (Пніцкі ўсіх і ўсялякіх кіраўнікоў уведаў нейк з першых дзён як мае быць) падняў руку ўгару.

„Таварышы, пачынаем мітынг. Слова мае тав. Бародзіч".

Адам Бародзіч стаў на заслон.

„...Да першага мая тэрмін не вялікі. Дык мы павінны пастарацца, каб цераз нас не адцягнулася закладка галоўнага будынку. Уся краіна чакае нашай работы і спадзяецца на нас. Мы ня проста чужыя, наняты работнікі, мы робім не на нейкага, а самі на сябе. І робячы вялікую гэтую работу, мы самі перарабляем сябе ў лепшы бок, усё сваё жыцьцё зьіначваем. Кожны з нас як ёсьць павінен быць зьвязаны з гэтаю работаю..."

— Яно правільна,—падаў голас Пніцкі, пралазячы бліжэй да Бародзіча.

— Правільна, ці ня правільна,—пачуў ён тут-жа ля сябе голас, а калі гэтак, дык павінны набавіць плату.

— А што ты думаеш,—згадзіўся Пніцкі,—можа такі й набавяць. Паслухаем, што ён больш скажа.

— ...Самае важнае гэта цагельшчыкі. Гэтымі днямі будзе пастаўлена машына, але й да яе трэба, каб не стаяла і абы як не варушылася работа. Бо калі закладка адбудзецца, а пасьля сьцен рабіць ня будзе з чаго, дык лепш і не пачынаць. Мы самі ўсё гэта ведаем ..“

— Так што цяпер на нас націснуць,—ціха сказаў Зыдор.

— Патрабаваць трэба падвышэньня,—абазваўся той, ранейшы.

— Праўду кажаш,—згадзіўся Пніцкі, гатовы на ўсё, куды яго павядуць.

Тут ён убачыў на Бародзічавым месцы Нахлябіча і поплеч з ім мясцкомаўца. Пніцкі чуў, як чыталі прапанаваньне рэзалюцыі.

„...Выкарыстаць усе сілы, каб да тэрміну скончыць падрыхтоўчыя работы...“

Як на галасаваньні рэзалюцыю ўхвалілі, заяву зрабіў Нахлябіч:

— ...Адчыненьне рабочага клюбу будзе дапасована да дню закладкі станцыі, але гатовая палова клюбу пачынае працаваць з сёньняшняга дню.

Сказаўшы, ён адразу спусьціўся на падлогу. Пніцкі стаяў ужо на самым выхадзе, у дзьверах, і Нахлябіч спаткаўся з ім. Ён сунуў Пніцкаму руку і хацеў ужо йсьці далей, але Пніцкі перапыніў яго:

— Ну як вам паводзіцца?

— Мяне перакідаюць на работу сюды, у рабочы клюб,—пасьпеў адно сказаць Нахлябіч і раптам змоўк, падтуліў плечы, сумеўся і зрабіў ад Пніцкага крок убок. Пніцкі кінуў зірк туды-ж і ўбачыў старога Нахлябіча. Той сына ня бачыў яшчэ і ўсё стрыг вачыма натоўп: то ў адзін гурт кідаў вокам, то ў другі. Пакуль малады Нахлябіч стаяў, апусьціўшы рукі, Пніцкі кінуўся да Аляксандра Нахлябіча і пацягнуў яго за руку:

— Чаго ты тут? Што ты тут робіш?.. Ага, ведаю. Сюды, сюды...

Ён прыцягнуў яго да сына, а сын маўчаў.

— Ледзьве я цябе знайшоў,—сказаў бацька.

— Чаго ты прыехаў?—адказаў сын.

— Як гэта чаго?

Пніцкі бачыў, як моцна зьдзівіўся стары Нахлябіч. Аж выпрастаўся разам на нагах і стаў яшчэ вышэйшы. Пніцкі, глядзеў і яшчэ некалькі чалавек падышло. Малады Нахлябіч бачыў, што некаторыя пільна ўглядаюцца ў іх абодвых, у яго і ў бацьку, і адразу скеміў усё. Ён ціха, але гэтак, каб усе чулі, сказаў да бацькі:

— Я цяпер нічога з табою агульнага, бацька, ня маю. Нашы дарогі разышліся. Едзь сабе дадому. Я дзіўлюся, чаго ты прыехаў сюды.

„Значыцца, не на жарты ён яго выракся“.

І думка гэтая прымусіла Пніцкага ўпіцца позіркам у старога Нахлябіча, як-бы ён яго першы раз бачыць. Але тут малады Нахлябіч пацягнуў яго за рукаў:

— Хадзем, Пніцкі.

Зыдор паслушна рушыў за ім.

— Зойдзем да мяне на адзін момант, яшчэ да работы пасьпеем.

Ён увёў яго ў маленькі пакойчык у клюбным будынку. Пніцкі ўбачыў новыя з пахучага бярвеньня сьцены, столік з паперамі, жалезны ложак.

— Пасядзі,—сказаў Нахлябіч.

А сам сеў і пачаў штосьці пісаць. Пасьля як мае быць заклеіў лісток у конвэрт і даў Пніцкаму:

— На, Зыдор, знайдзі бацьку і дай яму. Тут я яму як мае быць растлумачваю, што яго выракся. Я яго перасьцерагаў пра гаспадарку, а ён зусім іншых поглядаў трымаецца, дык нам не па дарозе. Калі ён закаранелы, дык я іншы. Так яму і скажы. Парай яму, сёньня-ж няхай едзе дадому. Тады мы будзем зноў сваімі, калі ён перачысьціцца і перамелецца.

Пніцкі хапіў у яго з рук конвэрт і рушыў бегчы, бо ўжо гучэў сыгнал станавіцца на работу. Ён на дварэ акідаў вокам усё і старога Нахлябіча нідзе ня бачыў. Ён гэтак патросься, як перапалоханы які, на адным месцы і кінуўся бегчы да сваіх глінішчаў: ён заўважыў, што стаіць адзін перад баракамі. Конвэрт ён сунуў сабе ў кішэню. Усё гэта яму зарупела страшна. І самае важнае, што непакоіла яго, дык гэта тое, што расло адчуваньне, нібы тут штосьці нядобрае адбылося, і ён у гэтым больш за ўсіх вінаваты. Гэтак ён з нецярплівасьцю прычакаў канца работы і, вылезшы з ямы, паволі пацягнуўся да ўзьлеску, дзе шмат было панакідана сьвежага бярвеньня, і адкуль разыходзіліся дарогі ва ўсе канцы работ і ў Чарніцу. „Дзе дзець мне гэты конвэрт", думаў ён. Але там яму пашанцавала: ён убачыў старога Нахлябіча пад ельнікам на бярвеньні. Той сядзеў і паглядаў то ў дарогу, то ў зямлю.

— От табе,—сказаў Пніцкі, падбягаючы пад Нахлябіча.

— Што гэта?

— Сын табе напісаў.

— Ага.

Пніцкі бачыў: Нахлябіч павесялеў адразу, як-бы прачытаў ўжо добрую навіну і як-бы ўжо нават гаварыў да Пніцкага: „я-ж гэтак і думаў, свайго Мікалая я добра ведаю".

— Такія справы, — ня ведаючы што казаць, абазваўся Пніцкі.

— Садзіся, Зыдор,—адказаў Нахлябіч, не сьпяшаючы чытаць сынаў ліст.

Пніцкі пачаў закурваць і прысеў. Толькі цяпер ён пачаў заўважаць, што ўтома гняце яго. Ён зашпіліў каўнер у рубашцы і паволі чыркануў запалкаю.

— Як жывеш, Зыдор?

— Жыву. На работу хаджу.

І тут успомніў Зыдор:

— Ну, як-жа там мой брацішак маецца, Андрэй, як ён хаця там жыве? Ой, даўно я ад яго нічога ня чуў. Каб ня схлусіць, дык я ня лішне далёка, а жывецца гэтак, што няма калі выбрацца...

— Жыве. Яго ў калгас цяпер гоняць.

— А ён?

— А ён мае розум, але нічога не парадзіць. Мусіць трэба будзе і яму пайсьці. А можа гэта раскідаецца яшчэ...

І чым гаварыў больш Нахлябіч, тым больш упэўненасьці было ў яго голасе: ён паглядаў на сынаў ліст, і гэта адганяла ад яго раней-шую зьбянтэжанасьць.

— Гаруе, небарак, Андрэй наш,—перабіў яго Пніцкі.

Гаруе. А што-ж, каб не гараваць?...

Штосьці кальнула раптам у душу Нахлябічу. Трывогі апошніх часоў пачалі выліваццa на Пніцкага галаву:

— ...А ты сам як жывеш, не гаруеш? Усе мы гаруем і робім як умеем і як нам даводзіцца...

Дык Пніцкі пачаў раптам апраўдвацца: ён і сам ня ведаў, адкуль у яго ўзялося гэтакае слова. Ён толькі адчуваў, што нешта нядобрае з „імі“ робіцца, калі сын выракся бацькі, калі бацька прыяжджае няма ведама сюды да сына, а сын з ім гаварыць ня хоча...

— Ты мяне ўпікаеш за нешта,—сыпаў Пніцкі.—Ці ты гэта брата, Андрэя нашага, ня любіш...

Адразу прачнулася ў ім крыўда на нейкага і за сябе, і за брата і за ўсё жыцьцё свае.

— Ты на мяне як-бы накідаешся за нешта, а я табе калі што думаў зрабіць нядобрае?..

— Чаго ты, чаго ты!..

Нахлябічу аж нядобра стала, што ён гэтак з самага пачатку загаварыў навучальным тонам з Пніцкім. І тут ён даў маху: ён падумаў цяпер, што, раз сын цераз Пніцкага перадае яму ліст, і раз Пніцкі стараецца ўзьвясьці яго на думку, што ніколі пра яго ён, Пніцкі, дрэнна ня думаў, значыцца перад Пніцкім сын яго ня тоіцца. І ён змоўк і разарваў сьмела пры Пніцкім конвэрт. Чытаў ён слаба, і разьбіраў гэтакім шэптам, што Пніцкі ўсё чуў.

„...Ці ты, бацька, ня ведаеш, які час цяпер? Я цябе выракся. Сам ведай, што час гэтакі. Пакуль што ня рыпайся, сам аддавай усю маёмасьць. А там будзе відаць, што на сьвеце будзе. У гэты бок усё пашло, дык ты нічога адзін ня зробіш. Маўчы і ня вытыкайся. Памятай, што час гэтакі. Гэта самае важнае, што ты павінен памятаць. А тады будзе відаць, што як і куды пойдзе на сьвеце. Сітуацыя гэтакая. Перачакай, а там усё перамелецца...“

От што пачуў Пніцкі. Ён быў сам ня свой. Ён чуў, што тут ён нешта павінен сказаць, ці нешта зрабіць, але выразна што, яму ня ясна было. Ён адно дробна адхаркаўся і моцна плюнуў сабе пад ногі. Устаў і пашоў.

— Куды-ж ты, Зыдор?—з падазронасьцю глянуў на яго Нахлябіч.

— Куды я? Ці ты-ж ня бачыш, што я з работы нядаўна і мне трэба дадому, пад'есьці, адпачываць... За дзень-жа наробішся гэтак. Ого!..

І падумаўшы, усё-ж разьвітаўся з Нахлябічам:

— Ну, бывай, Аляксандар.

Той чамусьці вельмі ветліва, як умеў, скланіўся яму, не ўстаючы з свайго бервяна:

— Бывай, Зыдорка.

Аж голас яго (заўважыў гэта Пніцкі і зьдзівіўся) патанчэў і паласкавеў.

Пніцкі пашоў у свой бок. Нахлябіч астаўся сядзець на бервяне. Пніцкім апаноўваў звычайны яго лёгкі настрой. Ён некалькі разоў азіраўся йдучы.

— Сядзіць,—гаварыў ён усё кожны раз.

Перад ім тулілася да зямлі Чарніца. Новы рабочы пасёлак жаўцеў крыху на водшыбе, а старое мястечка было бліжэй. Гучэла фабрыка, зіхацела веснавое неба, за плячыма яго, далёка ўжо, у лесе, пільня губіла свой нясьціханы кашаль.

II

Як пагалоска пра нязвычайную навіну, дайходзіў да ўсялякае шчыліны Пнівадзкага раёну новы вецер. Як шпарка, у некалькі гадзін, сохла зямля ў веснавы дзень пасьля дажджу, гэтак шпарка і неўзаметку ўядаліся ў жыцьцё сьляды гэтага новага ветру. Самая дзіўная навіна ператваралася тут-жа ў абыкласьць, жыцьцё перамолвалася, як зерне пад каменем, і самі людзі, пускаючы бесьперапынку ў ход гэты камень, малоліся пад ім. Ішла шпаркая зьмена твару зямлі.

З Пнівадзіч ішлі да Зыдора Пніцкага весткі пра брата: ён яшчэ нікуды ня прыстаў, але сам чуў, што як-бы ў новую старану неўзабаве падасца. Нахлябіч як расказаў быў тады Зыдору пра яго: „а ён мае розум, але нічога не парадзіць...“, дык у Зыдора ўсе наступныя дні варушылася думка: „чаму гэта, колькі я раней ведаю, Нахлябіч ніколі не гаварыў, што брат або я маем розум?“. Думка сьпела ў Зыдора ўпарта, яна была новая тым, што была дзейная. І праз дзён тры ён пашоў да Галены:

— Каб ня схлусіць, дык з братам я даўно ўжо ня бачыўся. Трэба хоць напісаць яму. Як той казаў, я вас папрашу, напішэце, бо ў мяне няскладна выйдзе. Пішэце, я жыў, здароў, на работу хаджу, а гаспадарку сваю кінуў. Гэтак прышлося, бо, значыцца, большы мне

цяпер выгрыш. Жонка, як можа, кешкаецца на гаспадарцы. Быў тут Нахлябіч стары, дык ён—ох што за чалавек! Я такі й раней казаў, што ён гэтакі. Усё нешта думае, а ў вочы наўрад ці гаворыць. Андрэйка, калі што якое, дык цурайся яго...

Ён гэтак захапіўся гаворкаю, што прагаварыў доўга, сам адчуваючы асалоду свае гаворкі.

Магутная паводка работы на балоце уцягвала яго ўсё больш. Ён перш за ўсё пачаў таўчыся на рабочых сходах і нарадах, а пасьля пачаў прывыкаць да новае справы, гэтак як раней да кожнадзённага пад'езду пад вагзал. І от пакрысе ён пачаў нават падаваць свае заўвагі, і часта здаралася, што трапляў якраз на патрэбнае слова.

Работа йшла на трох галоўных дзялянках. Самая важная цяпер работа была на цагельні. Далей ішла работа далёка адсюль, на другой мяжы балота, адтуль яно вымералася і разьбівалася на кавалкі. І яшчэ работа йшла ў лесе: будавалася часовая, патрэбная на рабоце, электрастанцыя.

Апошні момант, што як мае быць уцягнуў Пніцкага у клопат, гэта быў сход ля глінішчаў, перад пачаткам работы, у ясную раніцу. Яшчэ перад гэтым Пніцкі чуў быў адну гаворку: было пасьля работы, на тых самых бярвеньнях, дзе некалькі дзён да гэтага, сядзеў ён з старым Нахлябічам. Пніцкі, памыўшыся ў стаячай балотнай вадзе, крочыў да дому. На бярвеньнях сядзеў Адам Бародзіч, Курц, не калькі дзесятнікаў. Пніцкі, і яшчэ больш з ім, спыніліся паслухаць гаворку. Ён чуў, як Бародзіч, з нейкім як-бы пакрыўджаным выглядам, тлумачыў:

— У нас нават прымаўка пашла ў народзе: шавец заўсёды бяз ботаў. Гэта пра нашага тутэйшага шаўца. Можа дзе шаўцы іншыя. А наш гэтакі.

— Тэхніка йдзе ад вышэйшае культуры,—перабіваў яго Курц.— Яна ўбірае ў сябе людзей як патрэбную ей сілу, як пару, як электрычную энэргію. І гэтакім парадкам творыць патрэбныя гэтым-жа самым людзям матар'яльныя рэчы культуры.

— А людзі гэтыя самыя?

— А яны-ж заўсёды шаўцы, якія бяз ботаў.

— Значыцца, ад іх саміх нічога ня можа быць?

— Прынамсі ад гэтае масы, якая яшчэ ня мае культуры. Тэхніка йдзе ад адзінак. Гэтая і ўся культура.

— Значыцца творцы культуры і спажыўцы яе?

— Гэтак.

— Ну не. Перш за ўсё мы павінны выжыць грунт з-пад прымаўкі, што шавец заўсёды бяз ботаў. А гэта, мне здаецца, будзе тады, калі сам шавец стане гэтакі, бяз ботаў быць яму—значыцца ня жыць на сьвеце. Тады ён сам стане тварыць тое, што вы аддаеце толькі вашым адзінкам. І гэта робіцца.

— Дзе-ж яно робіцца, калі от цэглы ўсё адно ня будзе. А куток гэты ўвесь з самае найлепшае гліны. Вашы думкі пра ўдарніцтва, гэта,—мы свае людзі тут усе і сказаць думку можам, нічога ня дасьць.

— Дык што трэба?

— Выпісаць машыны і наставіць кваліфікаваных людзей. Пакуль гэта ўсё будзе, справа, вядома, зацягнецца, але затое гэта будзе верна і цьвёрда.

— А ў нас-жа жывое рабочай сілы хапае. Пакуль мы будзем мець машыны, выкарыстаем гэтую жывую сілу. Яна ўсё адно так сабе прападаць будзе, гібець гэтак, як і дагэтуль. Я-ж сам гавару, што пад нагамі ў нас сырэц, а тавару няма. Машыны мы выпішам, а пакуль, да пачатку работы, папробуем так, як і цяпер пачалі.

— Рабеце як хочаце. Мне здаецца, што ўсё адно не пасьпеем да-першага траўня.

І назаўтра Бародзіч быў з самага ранку на глінішчах. Утварылася шэсьць брыгад. Брыгадзіры, пачынаючы працу, заявілі то там, то сям таварышам:

— Цяпер за намі, не аставацца.

— Як яшчэ сам будзеш цягнуць,—гукалі навокал.

Пніцкаму сьперш было цікава, што з гэтага будзе. Пасьля ён, прыглядаючыся, сам пачаў стараццца. А адзін раз, выходзячы з страўні, спаткаў Бародзіча. Той пажартаваў:

— А вы, таварыш Пніцкі, брыгадзір?

— Не,—адказаў весела Зыдор.

— Чаму?—напусьціў на сябе хмурнае сталасьці Бародзіч.—Трэба ўсім.

Дык Пніцкі назаўтра і ўпісаўся. І пакрысе пачаў адчуваць сябе як-бы ня так, як трэба каб было тут. Гэтак пачаў ён уцягваецца ў новы парадак работы Ранейшая рухавасьць яго пачала саступаць месца сталай клапатлівасьці.

Даўно ўжо як паслаў ён той ліст да брата Андрэя. Пра Нахлябіча старога больш ён не ўспамінаў, нават калі спатыкаў Нахлябіча маладога. З кожным днём усё больш і больш Пніцкі рабіўся на будоўлі за свайго чалавека. Атрымаў ён новую спэцвопратку, і гэта яшчэ больш укараніла яго тут. У выходныя дні апратаць ён пачаў чыстую картовую жыкетку.

Пад канец красавіка прыехаў першы гурт муляроў. Чакалі другога. З тым-жа цягніком прывезьлі першую торпакапальную машыну. Яна была патрэбна часовай электрастанцыі.

Дыміліся сушыльныя печы. А няпаленую цэглу абвяваў вецер пад нізкімі паветкамі; сонца грэла яе там, дзе яна ляжала проста на зямлі. Яе пачалі ўжо звозіць на месца закладкі будынку. Старэйшыя-ж майстры баяліся ўсё, што яе мала будзе.

Раніцамі людзі пачыналі тут арудаваць: профэсіяналы цягавіта і роўна, з навакольных вёсак і вёсачак—нейк неспакойна, яны

найбольш думалі пра дзённы свой заработак, а там хай сабе тут хоць спыняць зусім гэтую работу, калі трэба будзе падзарабіць дзе, дык месца павінна знайсьціся. На полі расло, усё адно неўзабаве прыдзецца варочацца дадому. З іх найменш было гэтакіх, як Пніцкі. Ён пачаў гаварыць:

— Мы ня прывыклі да акуратнасьці. Мы яе, сказаць, ніколі й ня мелі.

— Якое гэта ты акуратнасьці хочаш?—пасьмейваліся з яго знаёмыя і суседзі на рабоце. Чарнічане й тутэйшыя вяскоўцы.

— У нас часта пад нагамі прападае, а мы ня бачым гэтага.

Людзям было крыўдна слухаць:

— Хто-ж гэтак ашчаджае кожную сяніну, як ня наш брат! Усялякі каменчык з поля добры гаспадар цягне дадому, каб даць яму лад. А ты тут гаворыш! Можа ты адзін гэтакі гаспадар, дык хто-ж табе тут вінен.

— Не, я праўду кажу.

Ён прыжмурваў вочы і доўга думаў, успамінаючы, што на гэта гаварыў Бародзіч. І нарэшце гаварыў:

— Перш за ўсё чаму мы гібелі заўсёды?

— Ня было на чым разгарнуцца.

Пніцкі зноў думаў:

— Стоячы з рыдлёўкаю, мы наўмысьня бывае раскідаем хвіліны, а з іх складаецца ўва ўсіх нас ого колькі...

Так ён вучыўся дысцыплінаванасьці.

Прыходзячы ўвечары дадому, ён садзіўся сёрбаць з хлебам поліўку, паволі курыў. Жонка расказвала яму пра сваю работу, і ён адчуваць стаў, што пачало зьяўляцца ў яго замілаваньне да гэтае спрацованае жанчыны, чаго ўжо доўгія гады ня было. Жылі яны ўжо як чужыя. Хата і непазбыўная работа толькі трымала іх разам. І часта ўсё гэта мела характар як валу ярмо.

Часта цяпер яны, адчуваючы асалоду перадвячорнага адпачынку пасьля дзённае работы, сядзелі разам у хаце ля вакна і гэтак спатыкалі яснае вясновае зьмярканьне.

Разьдзел чацьвёрты

I

У раньні вечар на ціхай вуліцы нявысокі ростам хлопец, у добрым фрэнчы, галіфэ і элеганцкіх калісьці ботах, падыщоў да драўлянага зграбнага дамка і доўга прыглядаўся на нумар яго. Нумарны ліхтарык яшчэ не гарэў, але нумар быў зусім чытэльны. Непадалёку тут званіў недзе трамвай, недзе грала вайсковая музыка, ня густа прайходзілі людзі. Хлопец пазваніў, яму адчыніла немаладая жанчына.

— Тут жыве Гарус?—запытаўся ў яе госьць.

— Тут. От сюды.

Малады чалавек увайшоў праз чысты корыдор у досыць прасторны пакой і даў „добры вечар“. Ён убачыў знаёмы твар, малады, белы, пад гладка зачэсанымі густымі валасамі.

— Не магу адразу пазнаць,—сказаў гаспадар,—недзе я вас бачыў.

— Я Балеслаў Сегенецкі.

Госьць заўважыў, як гаспадар правёў шпарка рукою па твары і адразу прыўзьняўся на сваім месцы. Але сядзець астаўся.

— Выбачайце, што я вас турбую.

— Нічога.

— Тады, як быў я ў вас, дык я заўважыў ваш адрас. І цяпер доўга ня шукаў.

— Вы гэта пра брата хочаце?

— Пра яго. Але выбачайце, я з вамі заўсёды быў шчыры, бо й вы да мяне гэтакі былі.

Гаворачы гэтак, госьць пільна паглядаў на гаспадароў твар, але не заўважаў яшчэ нічога нядобрага.

— Неўзабавае будзе суд. Справа ўжо зусім ясная. Вы-ж і тады маглі ўжо ведаць усё: яму нельга не прызнавацца, калі жывая сьведка ёсьць. Як было, ён сам усё расказаў.

Твар у гасьця раптам перасмыкнуўся грымасаю, але адразу-ж стаў спакойны. Чалавек, відаць, валодаў сабою добра.

— На колькі яго могуць засудзіць?

— Абсолютна нічога ня ведаю,—хітрыў крыху гаспадар,—я, вы-ж ведаеце, практыкант толькі пры гэтай справе.

— Выбачайце, я думаў... Вы тады гэтак са мною пагаварылі...

— Дык вы мне й ліст пасьля гэтага прыслалі,—як-бы папікнуў гаспадар.

— Я тады пісаў глупства, і бяз вашага хадайнічаньня я мог-бы пабачыцца з братам. Але пісаў на гарачую руку.

— Чаму?

— У тыя дні нас раскулачылі.

— Я-ж ужо тады гаварыў вам, як гаварыў што ведаю пра вас з ліста вашае стрэчнае сястры Галены Сегень.

Госьць змоўчаў. Гаспадар заўважаў, што ён пачаў непакоіцца з тэй хвіліны, як сказаў ён, што брат яго ўсё сам расказаў.

— Дык вы з братам бачыліся пасьля таго?

— Не... Бачыўся...

— Вы й самі ня ведаеце, ці бачыліся вы з братам!?

І гаспадар неспакойна падняўся з свайго месца. Госьць падаўся да дзьвярэй, але зноў авалодаў сабою і спакойна сеў:

— Выбачайце, я ўзнэрваваны.

— Дык вы скажэце выразна, **з-за** якое справы зайшлі сюды?

— Я думаў запытаць у вас, ці ня можна хадайнічаць, каб брата пасьля суду пакінулі на работах тут-дзе, у гэтай старане, поблізу. Я гэтага й зайшоў.

— Яшчэ невядома, што яму будзе.

З усьмешкай госьць зауважыў:

— Можна ведаць, што будзе.

Усьмешка гэтая пакрыўдзіла гаспадара:

— Дык я вам сказаў, што я тут толькі практыкант і памагаў сьледства весьці. І усё. Цяпер мая справа скончана. А цяпер от, у гэтую хвіліну, я зьбіраюся йсьці з дому зусім. Выбачайце.

Госьць убачыў ход справы. Ён устаў, памяўся крыху на нагах.

— Але ці могуць ня высылаць, а пакінуць тут, калі хадайнічаць? Вы бліжэй да справы, вы лепш ведаеце.

— Я думаю, што наўрад ці паможа што.

— Ён-жа сам прызнаўся!

— Ён мог-бы сабе й ня прызнавацца! Жывая сьведка, Зося Сегень! Як ён мог ня прызнацца?!

— Выбачайце.

— А што вы самі цяпер робіце?—ужо з адзнакамі простае цікавасьці запытаў гаспадар.

— Я? Нічога.

І госьць зноў павесялеў.

— Бацька мой памёр у самы гэты рэзрух. Ня вытрымаў... Сэрца ня стрымала.

— У вас парабкі былі заўсёды?—чамусьці запытаў гаспадар.

— Былі.

— І да апошняга часу?

— Як да апошняга?

— Ну да... Праўда-ж, у вас была Зося Сегень яшчэ нядаўна за парабчанку... Так. Так. У мяне з думак вышла... Ну, буду зьбірацца йсьці...

Госьць павольна варушыўся ля дзьвярэй.

— Бывайце... Больш я мусіць тут ня буду... Я вам напісаў быў усё, я тае гаворкі ніколі з вамі не забуду... Бывайце і выбачайце, што патурбаваў вас дарэмна.

Маўклівы цяпер Гарус сунуў яму руку і правёў цераз корыдор да выхаду на вуліцу. Там госьць яшчэ раз працягнуў яму руку:

— Дык брат пра ўсё як мае быць прызнаўся?

— Я-ж вам гаварыў!

— Я мусіць далёка адсюль паеду. Бывайце.

Гарус зачыніў за ім дзьверы і вярнуўся назад. Няпэўную думку сваю ён выказаў сам сабе ціхімі словамі:

— Як наглядаць за мною прыходзіў! Чаго гэта ён! І куды гэта ён зьбіраецца ехаць!

Сеўшы за стол на ранейшае месца, ён падпёр рукамі лоб і яшчэ ўслых думаў:

— Чаму яго ня выслалі?

І раптам адвёў рукі ад твару:

— А можа ён туляецца?

І яшчэ:

— Чаго ён дапытваў гэтак колькі раз, ці пра ўсё прызнаўся брат яго?

І пашлі моцныя здогадкі і трывожныя думкі:

„...Чаму-ж ён блытаўся, калі адказваў, ці бачыў пасьля таго, як яго выпусьцілі, брата... Значыцца, ці ня ходзіць гэта ён украдкі, ня могучы зьявіцца на спатканьне з братам?.. Ці цяпер што ў яго, ці можа?.. Ці можа?.. тое самае, на што падазронасьць падала з самага пачатку?! Чаго-ж гэта ён дапытваўся гэтак, ці пра ўсё брат прызнаўся! І падаўся гэтак зьбянтэжана да дзьвярэй, як першы раз пачуў пра прызнаньне брата!..“

Ён усхапіўся, прамаршыраваў колькі разоў па пакоі і зноў сеў:

— Ат, ліха яго бяры.

Але тут зноў захваляваўся:

— Пабратаўся, як да прыяцеля прышоў!!

Злосьць і раздражненасьць перасмыкнула яго твар. Ён шпарка захадзіў па пакоі. Хадзіў доўга і, нарэшце, дастаў з стала некалькі зьмятых лістоў. Паклаў іх на стол перад сабою, падпёрся локцямі і гэтак астаўся сядзець над імі.

II

Гадзіньнік на вежы вызвоньваў час. Балеслаў Сегенецкі спазьніўся палічыць колькі. Ён ішоў змрочнаю вуліцаю і неўзабаве вышаў на пляц. Вечар асталяваўся як мае быць. Пачынаў ісьці цёплы дождж, на сквэрыку было цёмна, толькі як прайходзіў паўз яго трамвай, рухавае сьвятло бегла па мокрых дрэвах і траве. Трамвайныя вагоны прайходзілі часта. Было змрочна. Толькі на рагох вуліц гарэла па аднэй лямпе: у той дзень штосьці сапсавалася на электрычнай станцыі. Была добра асьветлена толькі адна старана пляцу. Там трэцяя зьмена дахоўшчыкаў накрывала нядаўна надбудованы на адзін паверх дом. Ацынкованая бляха пад электрычным сьвятлом блішчэла, як чыстая вада пад месяцам. Праехала некалькі лёгкіх аўто, праехалі сялянскія фурманкі. Людзі з іх ціха паглядалі на замакрэлы брук і на раскоўзаную салому пад сабою. Прайшла колёна вучняў дэманстрантаў, і яшчэ пасьля гранула музыка і яшчэ некалькі колёнаў людзей.

Ішлі ўва ўсе бакі людзі. Натоўпы зьбіраліся на рагох гусьцей. Раптам палілося сьвятло з усіх вулічных лямпаў—электрастанцыя дала ток. Больш яшчэ ажыло ўсё. Загуло некалькі сірэн на заводах; дахоўшчыкі ўсё бразгалі над чацьвёртым паверхам ацынкованаю бляхаю; трамвайнае сьвятло ня гэтак пярэсьціла ўжо мокры сквэр.

Нечакана зазванілі ў дробныя званы ў праваслаўнай катэдры. Дзвін-цлін, дзвін-цлін... Званілі доўга, хвілін больш за пяць. Насупраць катэдральных дзьвярэй разышліся два трамвайныя вагоны, месца на хвіліну апусьцела, і чорная постаць вышла з прычыненае форткі. Прытрымліваючы крысьсе тонкае свае доўгае адзежы, постаць пашла паволі і роўна. На чорным фоне адзежы белая рука з адтапыраным пальцам была вельмі выразна белая, як мармуровая. як каменная; халодны белы колер. Другая рука трымала посах і ў тахту сваёй хады пастуквала ім аб мокры брук. Скрозь гул, скрозь трамвайны грукат Балеслаў Сегенецкій чуў гэты выразны—сухі; кароткі, ня досыць часты стук.

За цёмнай постацьцю эпіскапа вышла з царквы некалькі чалавек.

Пяць-шэсьць постацяй разышліся ва ўсе бакі, постацяй-жа тры прайшло крыху за эпіскапам. Пара людзей—мужчына і жанчына—неўзабаве адсталі і павярнулі назад. Яны былі старыя, мужчына трымаў жанчыну пад руку. Адзеты яны былі ва ўсё чорнае, мужчына быў у пляскатай летняй шапцы з шырокім круглым верхам, жанчына ў старасьвецкай дамскай шапачцы, з вялікаю шпількаю ўпоперак цераз яе. Гэтая пара йшла паволі, жанчына неўзабаве распусьціла парасонік. Яны як прайходзілі ў бакавую вуліцу, пад электрычнаю лямпаю, Балеслаў Сегенецкі ўбачыў, што ў мужчыны сівая, коротка астрыжаная барада, падстрыжаныя вусы, шырокі ўнізе твар, на вачох акуляры. І раптам заварушыўся ўвесь Балеслаў Сегенецкі. Ён, як стаяў на рагу сквэру, так рушыў за старою параю. Ён зайшоў ёй наперад і колькі раз, на хадзе, азіраўся на старога чалавека. Так ён ішоў праз усю вуліцу, дзе ўжо цямней стала, дзе пашлі платы, драўляныя тратуары, раўчукі вады ля іх. І чым больш ён ішоў, тым больш ня мог так адразу вярнуцца назад ад гэтае старое пары. Ён ужо йшоў блізка, сьледам за імі, адкідаючы ад сябе апошнюю няўпэўненасьць. Ён прыглядаўся да паходкі старога чалавека і пазнаваў гэтае прысяданьне за кожным крокам. Ён яшчэ не адважваўся зараз-жа загаварыць, але ўжо ведаў, што гэта трэба зрабіць. На драўляным мосьце старая пара сьцішыла хаду. Над мостам гарэлі дзьве лямпы. Моцнае сьвятло падала на ваду, глыбока пад мостам. Вада йшла ціхутка, і ў ёй пагойдвалася, бясконца бруілася ці багавіньне, ці вадзяное доўгае зельле.

Побач з мостам стукаў параю завод, а зельле сабе плыло ціхутка. Старая пара зусім спынілася на канцы моста. Абое абаперліся на парэнчы і гэтак пастаялі з паўхвіліны. Яны глядзелі на ваду, як бруіцца на ёй багавіньне. Жанчына старым, няроўным, голасам зашушукала:

— Калі на душы спакойна, вечна можна глядзець на гэтае багавіньне.

Мужчына змоўчаў.

— На гэтую вечнасьць... Вечнасьць плыве.

— Так,—адказаў ёй яе спадарожнік.

І тут Балеслаў Сегенецкі ад-гэтага голасу падаўся наперад. Ён ведаў, што гэты чалавек жыве недзе тут, у гэтым горадзе. І хоць раней і думкі ня было ніколі шукаць яго, дык цяпер выпадак паспрыяў гэтаму спаткаңню. „Якая тут можа быць няпэўнасьць, голас гэтакі падобны, як-бы нябожчык бацька з труны падняўся і падаў гэты голас“. Балеслаў Сегенецкі прайшоў наперад, вярнуўся і пашоў старой пары насустрэчу. Тыя йшлі паціху. Чамусьці ён не адважваўся загаварыць адразу, а прайшоў крокаў колькі поплеч, аж стары падаўзрона паглядзеў на яго. Тады ён нясьмела і далікатна загаварыў. На першыя пытаньні стары не адказаў зусім, а ўсё з недавер'ем глядзеў на неспадзяванага маладога чалавека, а пасьля цьвёрда махнуў наўкруга рукою, запрашаючы гэтым гэстам паднімацца на ганак. Тутжа, непадалеку ад моста, яны ўсе ўзышлі на высокі ганак, жанчына дастала аднекуль з свае адзежы ключ і адамкнула дзьверы. У газавай лямпе выкруцілі агонь, і Балеслаў Сегенецкі ўбачыў густа састаўленую даўнейшую мэблю, паабіваную чырвоным плюшам. Густа стаялі паўз сьцены столікі, шафачкі, на іх лямпы, збаночкі, з сухім зельлем, прыгожыя скрыначкі на пярсьцёнкі, голкі, зашпількі, брошкі... На покуці вялікая ікона нейкага сьвятога, за сталом на канапе зложаны адзін на адзін старыя альбомы... Усю гэтую безьліч дробных рэчаў разгледзеў Балеслаў, пакуль старыя распраталіся.

„... Вы, значыцца, брата майго сын?.. Я з айцом вашым даўно ня бачыўся. Мы з ім толькі перапісваліся. А як-жа, мы перапісваліся! Як вы мяне знайшлі? Адрас з лістоў ведалі? Дык я ж нядаўна перабраўся на новую гэтую самую кватэру... Выпадак. Ах, які-ж выпадак! Гара з гарою ня сходзіцца, а чалавек з чалавекам, калі суджана“...

Як гаварыў, дык праз зубы йшоў у яго шыпучы сьвіст.

„... Дык вечны пакой брату майму... А вы, а вы, малады чалавек?.. Мы з бацькам вашым жылі душа ў душу. Мы не сварыліся ніколі... Ніколі... Не... Не... Ён хоць быў з фантазіяй вялікай, але... Ён найбольш любіў паноў усадзебных, а на гарадзкіх была ў яго муха ў носе... А я іншых поглядаў... Але ўсё-ж мы з ім каб ня ладзіць, не, не“...

Балеслаў чуў сябе тут як на высьпе сярод бурнага мора. Ён праседзеў да поўначы, дзівячыся сам сабе, як ня думаючы пра ўсё, хадзіў надвечар па горадзе. А чаго Гарус, гэты практыкант судовы, ня быў спакойны, калі гаварыў са мною? Няўжо Толяк пра ўсё прызнаўся? Дык чаму-ж Гарус не затрымаў мяне адразу...“

Пілі гарбату.

„... Бярог, бярог мэблю, а цяпер прадаю, спродваю, нічога йначай не... ...А Сегень Якуб!.. У таго фантазія хамская! Ну, бедны, ну мужыком астаўся, але чаго-ж нянавісьць гэтакая!.. Не, не, у мяне з ім ня было сардэчнасьці...“

Больш ён не ўспамінаў пра гэта. Балеслаў сам ня рад быў, што патрывожыў гэтым успамінаньнем старога дзядзьку.

„... Сьвет гіне. Няма інаверцаў, палякаў, галаў, інаязычных... Усе другі за вялікую Расію адзіную... Яны прыдуць і выратуюць“...

Ён пасьля ўскінуў на плечы чорны шынель, з выцертымі рубцамі, з гузікам, абшытымі чорнай тканінай... І гэтак правёў апоўначы Балеслава на ганак. Балеслаў нават і ня зьдзівіўся, што ён мала распытваў пра яго: што ён тут робіць? як ўсё ў іх робіцца? Але ён панёс адгэтуль адчуваньне, што папаў да свайго блізкага. Ён прайшоў увесь горад і пашоў далей. Самага важнага баючыся цяпер, што Гарус толькі выпадкова не затрымаў яго, ён стараўся як мага хутчэй пакінуць за сабою найбольш разьлегласьці.

Ішоў ён больш як суткі, а назаўтра надвечар Пнівадзічы спаткалі яго чужым яму клопатам. Ён з лесу бачыў сярод разбаранаванага добра засеву ярыны тую самую дзічку, а зусім на зьмярканьні, паўз яго прайшла тады Зося. Як постаць яе схавалася ў паплавох на сьцежцы ў Пнівадзічы, ён неўзабаве й сам рушыў у той бок, але іншаю дарогаю.

III.

Старога Нахлябіча ён застаў дома, на дварэ. Той важдаўся ля сьвіронка, перасыпаючы з меха ў кадушку муку. Той зьдзівіўся, уба чыўшы Балеслава.

— Ты тут? А я думаў, што цябе даўно тут няма.

— А дзе, вы думалі, я?

— Дзе думаў?..

Ён сам ня ведаў, што казаць і нават як гаварыць з Балеславам. Пасьля спатканьня з сынам, усялякія думкі лезьлі яму ў галаву; і самая ўпартая думка, што яго мучыла, дык гэта тая, што трэба будзе невядома колькі часу быць ні за госьця, ні за гаспадара. Гаспадарка яго цяпер стала маленькая, плугамі, баронамі, коньмі арудавалі чужыя людзі. Нянавісьць і нераможная варожасьць узмацняла гэтую думку страпэнна. Калі будзе тая зьмена, дык колькі год будуць гэтакія парадкі? А што, калі будзе гэтакі закон, што зойдзе даўнасьць і ня верне ён нічога, што цяпер у яго забралі. І як трымацца цяпер, як гаварыць з сваяком Балеславам Сегенецкім? На вуліцы ён ужо сьцішэў, вельмі-ж пасьля спатканьня з сынам. „Час гэтакі, час гэтакі!“ Гэтак Мікалай сказаў, гэтак ён парадзіў. Адно толькі бяда, што людзі павінны ведаць, што сын яго выракся. Ну што за ўцеха з таго, што пасьля таго, як Пніцкі Зыдор пакінуў яго на бярвеньнях, ён дачакаўся змроку і знайшоў такі сына нішкам ад людзей у той каморцы ля рабочага клюбу? І што там яны пагаварылі як і раней! І што сын, яго казаў—„час гэтакі, час гэтакі, і трэба абрасьці карою гэтага часу, а пад карою туліць у сабе свой ранейшы агонь“. Простымі словамі сын гэтага не гаварыў, але бяз слоў бацька бачыў свайго Мікалая навылёт. Можа нават і сам Мікалай не ўсвядомліваў гэтага выразна і нават колькі-небудзь, але бацькава нутро шмат што можа

адчуць у сыне сваім. Сын быў упэўнены, што ёсьць адна рэволюцыйная праўда: акафіст рэволюцыі; той быў ўпэўнены, што гэта вялікая рэволюцыйная ідэя, а бацька гэты самы акафіст вызнаваў за самы цьвёрды манэўр. І ўжо цяпер нават ён сам зьбіраўся парадзіць Андрэю Пніцкаму: „А што, можа й лепш гэтыя колгасы. Валі, калі прымаюць і маеш ахвоту“. Дык цяпер ён ня лішне папрыяцельску зірнуў на Балеслава:

— Дык дзе-ж ты цяпер?

— А чаму вы думалі, што я дзе далёка? Дзе-ж я магу быць.

— Я падходзіў пад вас разы са два, дык там пуста. Дык я пачаў думаць...

Тут ён памаўчаў.

— А, от што, цябе, напэўна, выслаць павінны.

Балеслаў усё яшчэ разьбіраў, якім тонам гаворыць з ім Нахлябіч. Дык і маўчаў і ўсё стараўся, каб той гаварыў. А той узяўся зноў за сваю работу, і Балеслаў скеміў, што гэта жаданьне, каб хутчэй пазбавіцца яд яго. Але ён стаяў, дык Няхлябіч яшчэ нехаця падаў слова:

— А мо‘ дзесяцін пару далі табе і ты дзе асеў ужо гаспадарыць і мне ня кажаш?

— Не хачу я гэтак!—з нечаканаю і сабе і Нахлябічу ўпартасьцю сказаў Балеслаў.

— А як-жа?

— От, выдумаю што-небудзь.

Так і лезла ў яго з языка сказаць: „я ўжо выдумаў“.

Гэтак ён і пакінуў Нахлябічаў двор. Вуліца была цёмная, за агародамі яшчэ цямней было. Нахлябіч бачыў, як Балеслаў падаўся цераз агароды, і дагнаў яго:

— Чаму-ж ты ня йдзеш вуліцаю?

— Чаму вы пытаеце?

Здогадка апанавала Нахлябічам адразу:

— Ты што задумаў?

— Дзядзька...

— Чаго, сынок?

Нахлябіч спрытна схаваў штучнасьць свае ласкавасьці:

— Я... нічога не задумаў.

— Хлусіш! Ты мяне згубіць хочаш! А што, калі людзі бачылі, што ты ў мяне цяпер. А тут пойдзеш і наробіш ліха ведае чаго. Ты малады, ты куды хочаш махнуць можаш, а я што! Тады кожны скажа, што я памагаў табе, або падвучваў цябе...

— Не, не...

— Што—не, не!

Балеслаў стараўся йсьці шпарка, а Нахлябіч не адставаў ад яго, усё адно як-бы гнаў гэта ён перад сабою Балеслава. Гэтак яны моўчкі падышлі да лесу. Балеслаў пашоў шырокаю дарогаю, а Нахлябіч

астаўся сядзець пад дрэвам. Ён думаў: „калі вернецца каб што рабіць, дык ня пушчу, а туды няхай ідзе, далей адгэтуль; няхай сабе там хоць чырвонага пеўня пускае куды хоча“.

Ён сядзеў доўга. Нікога ня чуваць было, як ён пашоў назад.

З горнаю злосьцю Балеслаў думаў: „сам ты мусіць нешта думаеш тут зрабіць, калі пра мяне стараешся здагадацца. Як гэта табе на думку можа ўзбрысьці гэтакае...“

Ён ужо быў далёка ад таго месца, дзе пакінуў яго Нахлябіч. На ўзьлеску чарнела сяліба. Агонь гарэў за фіранкаю ў вакне. Балеслаў пастукаў у вакно. Сам гаспадар адчыніў яму, але з-за дзьвярэй трывожна запытаў хто. Прозьвішча Сегенецкага супакоіла яго. Адзяючы лёгкую хатнюю сутану, ён зацягнуў вакно густою фіранкаю, гатовы слухаць.

— Я рушу ў ход сказаў Балеслаў.

Ксёндз паклаў яму рукі на галаву і блаславіў яго.

„... Твой айцец перад сьмерцю на споведзі маўчаў пра свае крыўды. Калі мертвы маўчыць, дык жывы павінен гаварыць. Калі мертвы даруе, дык мы на тое жывыя! Я веру ў перамену сьвету і запанаваньне вялікай ідэі з Захаду ад нас“...

Балеслаў пашоў адсюль ціха. Да раніцы ён мог прайсьці ня многа. Ён ведаў адно: бацькавы думкі і яго носіць тут у сабе пробаш. Не, ён ня можа мірыцца з тым і з тымі, з кім праз увесь век свой ня мірыўся бацька! Нават, каб і раскулачваньня ня было!

У наступную ноч ён падышоў ціха да соннага мястэчка. Ён успомніў, што пра гэтае мястэчка ўспамінала калісьці Зося Сегень: „Тут Галена жыла крыху, як прыйшла была адтуль, куды цяпер ён накіроўваецца. Адна дарога вядзе ў розныя бакі!.. Тут-жа з Галенаю быў і Гарус“. Пры гэтым успамінаньні ён уздрыгануўся: мусіць Толяк такі пра ўсё прызнаўся, і толькі выпадкова Гарус не затрымаў яго. Але тут падскочыла іншая думка: „а можа не выпадкова, а сумысьля“. Другая думка пачала браць верх і стварала ўпэўненасьць, што Гарус, калі й не аднадумец, дык блізкі да яго чалавек. „А ўрэшце, няхай сабе будзе які хоча. Каб толькі ўдалося“.

Яму ўдалося: арка з надпісам: „Камунізм зьмяце ўсе межы“— асталася ў тую ноч у яго за плячыма.

IV.

Зыдораў брат Андрэй Пніцкі ў ясную раніцу пачаў зьбірацца на штодзённы свой клопат. Неба на ўсходзе гарэла, ясната йшла ад ружовае разьлегласьці на ім. Вясёлы дзень рынуўся ў маленькія вакенцы Андрэевае хаты адразу. Андрэй, пацягваючыся, лінуў на рукі з мядзянае конаўкі вады, намачыў ею твар, разы са два пацягнуў па ім даўно ня мытым ручніком і сьпешна пачаў усьцягаць на сябе штосьці пашытае з шарачку. Полы гэтае кароткае лёгкае вопраткі абвісалі

ўніз, з-пад іх спробавала абвісаць падшэўка. Ён падперазаўся паверсе вузенькаю папружкаю, знайшоў у сенцах пугу й тады як мае быць падаўся ў глыбіню двара. Ён гаварыў сам з сабою:

— От пакуль выберашся... От пакуль выберашся, дык і паўдня нахопіцца...

Выцягаў з пад падваротні ў хлявушку барак, абкручваў анучамі вузлы на пастронках—каб ня муляла каню...

„Пакуль выберашся... Больш тае важданіны, як работы!..

Глянуў у жолаб, загарнуў там рукою конскія за ноч недаедкі: паклычанае і зьлямцованае сена было на дне.

— Не ясі... Не ясі... Эх, ты...

І ўзьдзяваў на каня вобраць.

Выехаў ён з двара, як ўся вуліца была заліта першым сонцам. У полі калёсы каціліся ціха, дарога ня пылела. Драбіны яго то зусім хаваліся паміж двума ўзгорачкамі, то ўзьнімаліся наверх і былі зусім на відавоку. Сьвіная дарожка круцілася паміж няроўных палеткаў. Былое Сегенецкага поле ляжала унь там паўз лес. На мяжы яго й вузкіх палеткаў зазелянілася маладым лісьцём каржакаватая дзічка. Пніцкі, як праяжджаў тут, углядаўся ў яе. Яна была навокал абворана, і толькі пад самаю ею, узвышаўся кавалак узьмежка. Вылётнае ранейшае мяжы пад ёю ня было.

„От тут гэта. Ах! Што ёсьць на сьвеце... От гэтае самае месца! А Якуб Сегень моцны чалавек! Колькі ён на сваіх плячох вынес за свой век... Браты! Усё-адно як дарогі раскрыжаваліся! Ідуць і йдуць у розныя бакі...“

Тут ён мінуў першую граду лесу.

„... Бач ты, узаралі сабе, пасеялі і цяпер... Што адно будзе далей! І не пабаяліся—параскулачвалі, паразганялі, робяць сабе... Спрыяюць сабе... А дзе-ж цяцер гэты, маладзейшы, Сегенецкага панічок? Той большы, дык, эх! Як-жа гэта адважыцца, мой божа, узьняць на чалавека руку! Што бывае, што бывае... Дзе-ж гэты падзеўся, зьнік, прапаў і сьледу няма! Прапаў, як кажуць, з скураю. Недзе й канцы, і сьляды замёў. Каб хоць хто ведаў!.. Але з бацькам-як адзін былі!. Яго то павінны былі-б выслаць, каб не прапаў недзе. Але-ж у той самы дзень. Ах, які спрытны... А, чэрці іх бяры!

Ён нават пачаў сам сабе выказваць словамі свае думкі. Паганяў каня паволі, штосьці трывожыла яго, штосьці паддавала, разам з тым нейкае яснасьці ў думках і надзеях.

Пацягліся маладыя засевы ярыны, палетак быў чысты й шырокі. Ён доўга прыглядаўся на маладое зяленіва, углядаўся ў шырыню поля, як-бы першы раз гэта ён бачыць яго. І чым больш пад‘яжджаў ён пад свой палетак, тым больш мучыла яго нейкая трывога. Як згубіў ён што і толькі цяпер заўважыў гэта, як прапала ў яго назаўсёды штосьці звыклае, але й прыкрае, і ён сам ня ведае—быць вясёлым

ці сумным? Неспакой быў у яго: і конь сена ня можа добра есьці, і вузлаватыя пастронкі рэжуць гэтаму каню бакі, колькі ты іх ні абкручвай анучамі, і... усе, усе...

Забараноўваў ён запозьнены свой ячмень доўга. Стараўся, каб як мага лепш зрабіць сваю работу. Тут ужо цьвёрдая думка сьціскала яго галаву: калі ўсё ў мяне будзе добра, дык я магу сьмялей і зусім цьвёрда глядзець „ім“ у вочы. І пад канец работы гэта ператварылася ў нераможную упэўненасьць. Аж твар яго загарэўся слаўнаю чалавечаю яснотаю ў ва ўсіх рысах сваіх. Ён павольі хадзіў па сваім палётку, падняў некалькі каменьняў і вынес іх з-пад бараны на дарогу. А пасьля ўжо яму хацелася каб найхутчэй скончыць гэтую работу. Гэтак зьменьваўся ўяго ў гэтую часіну настрой. Нецярплівасьць, і раптам зноў трывога, апаноўвала ім. І нарэшце ён ужо ледзьве прычакаў канца гэтае работы. Ён успамінаў усе гэтыя дні: думка цяперашняя яго насьпявала праз увесь час пакрысе, і як мае быць сфармавала яе вестка ад брата з Чарніцы. Ліст той вельмі ўзрадаваў яго.

„Дык Зыдор, значыцца, як мае быць на работу пашоў. Уцягнуўся ў заработкі...“

Ён адчуваў, што гэтая навіна ў Зыдоравым жыцьці ахапляе не на жарты ўсё навокал і толькі ня мог яшчэ аплянаваць гэта сваімі думкамі. Ён адчуваў і нават цяпер ужо бачыць пачынаў, што і ён сам пераступіць зараз цераз нейкі парог да чагосьці новага.

Пасьля работы ён даў крыху адпачыць каню і як бачыш сабраўся з поля. Ён праехаў дарогу да яе павароткі ў другі канец далёкае яшчэ адгэтуль вуліцы і ўзьехаў на гэтую паваротку. Ён стараўся чамусьці гнаць каня як найшпарчэй. На загуменьні ён выбраў выезд пад новае, былое Нахлябічава, гумно і завярнуў туды каня.

„Так ім і скажу: от конь, які ёсьць, от барана, а от і я сам Каго тут першага я спаткаю?“

Зэнкаў бацька—калгасаўскі канюх—адгрэбаў там граблямі ад дзьвярэй салому.

— Здароў!—гукнуў яму Андрэй Пніцкі.

(*Канец будзе*)

Максім Лужанін

Сьлівень паказвае рогі

Знаёмыя твары.
— Ну так!
гэта вы!
Пасуньцеся, пане пісар!
Вось тут—
чарада
і гарадавік,
ён родны бацька ваш—
гарадавік,
ён, нават, бліжай вам—
гарадавік,
вы з ім—
па крыві
і па місе.
Калі
без вады памірaў
кулямёт,
і
чорнаю болькай гнаіўся
Юдзеніч:
вы
разам зашыліся пад
азярод
ў чырвонагвардзейскім адзеньні.
І дожджык
іржавіў вінтовак павець,
ледзь
дыхаючы праз салому,
і губы шапталі:
— Ку-ды-ы Саве-ет!
Каб як вось...
сабе-е...
жывому...
Чакатаў кулямёт.
Повен рот
крыві.
Вы вышлі,
як скончыўся лёт
эскадрылій.

На землю
ступілі.
Цяжка зямлі...
Вы ў ранцах—
(дамоў)
чаравікі нясьлі,
вы ў пазухах
(потных)
сыгнэты гнаілі.
І потым...
А гэта—
інакшы дзень,
дзень бяз вошы,
катораму твар пагалілі.
Калі
краіна стаяла ў чарзе,
вам
масла прывозілі на аўтомобілі.
Ад гэтага масла,
ў падмацованы сьвет,
Па рэйках Донбасу,
жывой паходняй,—
зьявіўся цягнік:
літара „Вэ“,
каторы цяпер
называецца шкоднік.
І каб пачаў
такі
цягнігад
па сто
(за гадзіну)
па рэйках
адшпарваць—
праз год
на транспарце:
ляжаць улад
разьбітыя цяплушкі
ды разьвернутыя шпалы.
А далей:
тэлеграмаю
з Сіці
ці
з пратэру,
па ўсёй краіне,
па сто за раз—

спыняліся
вялізманныя
турба-гэнэраторы,
выплёўваючы цьвікамі
сухоты з нутра.
І загуў Донбас!
І гневам зару
падняў на штыхі,
з Варшавай
ня узгодніўшы.
І
заместа гонорару
з пілсудзкіх рук —
алавяная пайка
Іжэўскага заводу.
Але ўсмактаўся глыбока
бруд,
выскачыў болькаю
на целе здаровым,
і усе,
што ня здолелі
адкручваць шруб,
кінуліся,
дробненькія,
да шкодніцтва словам.
Прыстрояцца на сьценцы
(як гасьне дзень),
ці
вывядуць на століку
абвугленай запалкай:
—Даволі змаганьня, бо краіна ў чарзе,
стаіць па нішчымны хлеба кавалак".
Знаёмыя твары.
—Ну так,
гэта вы!
Прымайцеся,
пане пісар!
Вас тут чарада—
і гарадавік,
вы з ім—
па крыві
і
па місе.

Вы—
рэзаць выходзіце—
без нажа,
у сэрца—
бяз мыла,
ў дарогу—
бяз шворна.

А я
свайго ворага
тады-б паважаў,
калі-б ён—
прасьцей,
за горла.

Мы
будзем біцца тады да крыві:
куляй,
штыхом,
прыкладам,
зубы сьціскаць,
рот крывіць,
ня ведаючы спагады.

Пакіньце!
Даволі!
Які амбарас?
— Што-о?
— Сьлівень паказвае рогі?
Пакіньце!
Даволі!
шкада аб вас
псаваць абцасы,
сьмяціць падлогу.

Калі
краіна стаіць у чарзе:
па тысячы тон мэталю,
па тысячы тон руды,
па мільёны комбайнаў,
Калі
з
бэтону
і
сталі
будуюцца гарады—

а, ну—
адгэтуль!
Далей!
Ня рушце адданых і дбайных.
Далей ад будоўлі,
куцыя,
ня вартыя
кулі чэкіста
і словы поэта!
Выходзіць
прыбіральшчыца
Рэволюцыі,
нясучы сьвежыя,
толькі зьвязаныя
метлы.

Сьмешная гэральдыка

Першы верш—
нарадзіўся поэт.
Першая кніжка—
знайшоўся крытык.
Гэтаму—
зьвінець.
Таму—папялець.
Аднаму—
вада,
Другому—
карыта.
Першая радасьць—
цягнік на Менск.
Першы морак—
паштовая скрынка.

У комплексе
артэрый,
нэрваў,
вен:
аднаму—
хлеб,
другому—
скарынкі.
Сьмешная гэральдыка:
мама й тата.
Дзіўная гэральдыка:
запылены том.
Старая гэральдыка:
сялянская хата.

Калі мой продак
і быў
хвастаты.
дык гэта
ня значыць,
што я з хвастом.
Я
ўмею плаваць,
як кожная з рыб,
я ўмею лятаць,
ня падаць на коўзкім.
І, як другія мае сябры,
Ня хочу,
ня буду
поўзаць.

Хто можа поўзаць—
той хоча кусаць.
Рэспубліка нас гадуе.
Калі
я змарўся
каля
прысад,
Рэспубліка мне даруе.
Яна назначала шляхі барацьбе,
бадзёрыла крыльле,
сьцішала вычур.
Яна мне паказвала свой альфабэт,
калі забываўся літар.
Я вырас з малодшых
і самых меншых,
настойна і ўпарта,
як трава,
цераз брук.
І непапраўна адціснуты ў вершах
факсыміле вуснаў
і
аўтэнтык рук.
Ня знойдзецца болей,
чым я гавару,
болей таго,
што патрэбна для эпохі.
Зару
за рукі
бяру.
Каб—
ня мокла,
ня сохла
Нараджэньне—
Кастрычнік.
Рэспубліка—
плян.
Фініш—
наступнае.
Старт—
упартасьць.
Я ведаю ў твар вастравокае заўтра,
хвалю, якою скалыхнецца зямля.

В. Сташэўскій

Гарачы віхор [1])

П'еса ў 4-х актах, 16 карцінах

А С О Б Ы:

Булач, начальнік аднага бандыцкага атраду. Рослы, гадоў 36.
Сіверын, палкоўнік былое царскай арміі.
Масьлецкі, афіцэр польскай арміі.
Крулік інтэлігент-беларус.
Ракіта, былы прапаршчык—пісар Булача.
Пірэ, прадстаўнік Антанты.
Пербала, памоцнік Булача.
Алёша, вартавы ў Булача.
Сьпірыдон, прызёмісты, пажылы булачовец.
Гніда, актыўны бандыт, п'янчуга.
Пісар. пісар, былы дзяк.
Гурбацкі, шляхціц-кулак.
Кабіляцкая, фольварковая пані.
Жанчына.
Польскі жаўнер
Яшка Баравік } контрабандысты.
Саладухін }
Галінскі, ваенком і член бандыцкага комітэту.
Рубковіч, бандыт для сувязі з Галінскім.
Дубок, чырвоны камандзір.
Грыбцоў, сэкратар павятовага комітэту кампартыі.
Крэйд, начальнік павятовае міліцыі.
Сівец, з павятовага выканкому.
Саўчанка, старшыня павят. політбюро.
Міра, супрацоўніца політбюро.
Аксеня, настаўніца прыгараднае школы.

Сяляне, чырвонаармейцы, булачаўцы.

---

[1]) На ўсебеларускім конкурсе ў лютым 1930 г. гэтая п'еса (дэвіз—„Эпоха)" аднесена да рэпэртуару вандроўных тэатраў і прэм'явана першай прэміяй.

АКТ 1

Карціна І

Невялічкі чысты пакой. Масьлецкі, Крулік і Сіверын.

Масьлецкі. Зараз такі момант, што мы павінны аддаць усе свае сілы, прыцягнуць на свой бок як мага больш людзей. Лёзунг—незалежная Беларусь павінен лунаць над кожнаю хатаю. Я ўпэўнен, што голад у Саветах прывядзе да нас не адну тысячу чырвоных салдат і такім чынам...

Крулік. Дазвольце вас перабіць, пане Масьлецкі, мне здаецца, што справа не ў адных людзях, ня ў фізычнай чалавечай сіле. Патрэбна больш выразная мэта нашае барацьбы.

Масьлецкі. Барацьба з бальшавікамі—гэта і ёсьць сама мэта. Што-ж тут нявыразнага?

Сіверын. Важна перамагчы, зьнішчыць іх, а далейшае вырашыць сам вялікі рускі народ.

Крулік. Вялікі рускі народ, ды што мне вялікі рускі народ? Я беларус. Я павінен ведаць, што будзе мець беларускі народ.

Масьлецкі. Незалежнасьць.

Сіверын. Поўную незалежнасьць і самастойнасьць. Я рускі і я аддаю ўсе свае сілы на тое, каб ня даць Беларусь у рукі такіх рускіх, якімі зьяўляюцца бальшавікі. Калі мы, скажам, сёньня даб'емся гэтага, на гэтым, я думаю, што і ўсе мы не закончым свае работы, бо я паўтараю—і рускі народ таксама чакае вызваленьня.

Масьлецкі. Зусім слушна, мы павінны будзем яго падтрымаць.

Крулік. Ну што-ж, я буду змагацца, буду біцца за Беларусь. Калі вы шчыра жадаеце вызваленьня Беларусі, я з вамі, калі-ж вы будзеце крывіць, я буду супраць усякага рускага, супраць усякага паляка.

Масьлецкі. Праўду кажучы, у Беларусі такіх супольных шляхоў больш з Польшчай, чым з Расіяй.

Сіверын *(пра сябе)*. Ну, гэта мы яшчэ пабачым. А-а, так аб супольных шляхох з сёньняшняй Расіяй я сам не хачу гаварыць. (*Уваходзіць Булач*).

Булач. Усё спаўняецца, усё ідзе так, як я заўсёды казаў—гісторыю робяць ня толькі людзі, але і час. Час—гэта ядроны качан, вялікі стратэг. Цяперашні час як найлепш спрыяе сформаваньню нашых баявых сіл. Нашага палку прыбывае.

Масьлецкі. Цікава, можа маеце якія неспадзяваныя навіны?

Булач. Я вам прадстаўлю сьвежанькага камандзіра Чырвонае арміі. Дазвольце?

Масьлецкі. О, калі ласка.

Сіверын. Давайце яго сюды.

Масьлецкі. О, бачыце, будуць прыбываць.

Булач (*расчыняе дзьверы*). Калі ласка, заходзьце сюды, (*Уваходзіць Ракіта*). Знаёмцеся—камандзір Чырвонае арміі Ракіта.

Ракіта. Дабаўце—былы.

Масьлецкі. Так, вельмі прыемна.

Сіверын, Вы, напэўна, афіцэр рускай службы?

Ракіта. Я? Так, былы.

Сіверын. Выбачайце, у нас, хоць, праўда, не з надворнага боку, чыны захоўваюцца. Вы былі паручыкам ці?..

Ракіта. Прапаршчыкам.

Сіверын. Ну, нічога, значыць будзеце падпаручыкам.

Масьлецкі. Скажэце, якім чынам вы трапілі да нас? Як гэта вы вырваліся з пекла?

Ракіта. О, гэта вы праўду сказалі, што пекла. Я быў у Дарагабужы. Там тысячы каманднага складу. Голад страшэнны. Адносіны страшэнна някультурныя. Паверыце, у такіх умовах я ня мог заставацца. Я шукаў выпадку, каб наблізіцца да нэйтральнае зоны, да мяжы.

Масьлецкі. Так, так.

Ракіта. Іншы раз мне хацелася кінуцца куды-небудзь у рэчку, каб і не вярнуцца адтуль.

Масьлецкі. Чуеце, панове?

Ракіта. І вось, нарэшце, знаходжу выхад.

Сіверын. Правільна. Афіцэр павінен знайсьці выхад.

Ракіта. Чую я, што наша сапёрная частка хоча паслаць некалькі чалавек у камандыроўку—купіць пілы.

Масьлецкі. Што значыць пілы?

Ракіта. Пілы, звычайныя пілы, што пілаваць.

Сіверын. Ну, ну.

Ракіта. Давайце, кажу, камандыроўку мне ў Менск,—гарантую, што пілы будуць. Даюць. Еду. І вось прыехаў.

Сіверын. А з піламі-ж як?

Ракіта. Пілуюць яны і бяз пілы.

Масьлецкі. О, гэта вы праўду сказалі.

Сіверын. Што зрабілі з вялікае магутнае Расіі, госпадзі, госпадзі!

Крулік. Вы беларус?

Ракіта. Так, тут недалёка мая вёска, у якой я быў настаўнікам.

Булач. Адным словам, гэта чалавек наш. Я крыху ведаю яго. І мы можам даручыць яму формаваньне атраду.

Сіверын. Бясспрэчна.

Крулік. Я хацеў бы ведаць іх погляды на стварэньне незалежнае Беларусі.

Ракіта. Вы мяне пытаеце?

Крулік. Так, вас.

Ракіта. Ды я думаю, што з гэтага нічога ня будзе, і язык гэты..

Крулік. (*Стукнуў кулаком па стале*). Даволі! Прыплыло шчасьце.

Масьлецкі. Пачакайце, пачакайце.

Крулік. Якога-ж вы чорта прышлі сюды.

Булач. Супакойся, дай чалавеку ўсьвядоміць сябе. Кожны з нас перажывае якую-небудзь фортуну.

Сіверын. Вы хацелі сказаць мэтаморфозу.

Булач. Так, гэтую самую морфозу. Я бяру Ракіту на свой баявы вучастак.

Ракіта. Я, уласна кажучы, ня думаў, ня меў на ўвазе іці з кім бы ні было ваяваць. Я супроць вайны. Я хачу спакойна займацца сваею працаю.

Масьлецкі. Якою?

Ракіта. Ды хоць бы настаўнікам.

Крулік. Рускім?

Ракіта. Ну рускім, а якім-жа?

Крулік. А можа-б вы па турэцку вылажылі нам лекцыю. Чорт вазьмі.!

Масьлецкі. Чакайце, чакайце, панове. (*Званок тэлефона. Масьлецкі бярэ трубку*). Я слухаю. Хто гаворыць? Ага, пан ротмістр. Слухаю. Так. Так. Што? Выехаў? Даўно? Ага. Добра. Добра. (*Да ўсіх*) Панове, э-э (*Да Ракіты*). Мо' вы дазволіце пакуль што нам застацца... Вы там пабаўцеся ў садку там, калі ласка...

Ракіта. Слухаю. (*Выходзіць*).

Крулік. І прыцягне Булач усякага чорта. Гэта-ж такая цаца, якая ні нашым, ні вашым.

Масьлецкі. Так, гэта непаразуменьне. Панове, праз некалькі хвілін у нас будзе пан Пірэ. Я кораценька інформую вас: я даклад-ваў яго прысутнасьці аб усіх нашых плянах, аб усіх мажлівых у бліжэйшы час опэрацыях, я даў яму добрую характарыстыку вас, як начальнікаў баявых вучасткаў. Ён надзвычайна тонка выслухаў усё, кіўнуў галавою і пажадаў бачыць нас асабова. (*Чуваць гудок і грукат аўтомобіля*). Ціха, ціха... Пад'ехаў. (*Папраўляе на сабе адзеньне і выходзіць сустракаць. Усе ўстаюць, папраўляюць на сабе адзеньне, асабліва Сіверын і Булач. Масьлецкі расчыняе дзьверы і камандуе*). Панове! (*Уваходзіць Пірэ*).

Масьлецкі. Дазвольце прадставіць: палкоўнік рускае службы Сіверын, а гэта наш новы энэргічны, таксама вайсковы—Булач і вось прадстаўнік прогрэсыўнай беларускай інтэлігенцыі—Крулік.

Пірэ. Аба ўсіх вас я маю некаторае ўяўленьне. І мне вельмі прыемна бачыць вас пэрсональна, бачыць людзей, якіх гісторыя прызвала да вялікай агульналюдзкай справы. Практычна: на вас ускладаецца невялікая частка вялікай задачы. Вось гэты момант, пакуль аформляецца мір Польшчы з Саветамі, трэба скарыстаць, і мажліва ўдасца сформаваць незалежны беларускі ўрад даволі цікавае формацы Актыўныя дзеячы бясспрэчна зоймуць у ім належныя пасады.

Булач. Будзем старацца!

Пірэ. Так, гэта-ж у вашых інтарэсах. Пазьней каму-небудзь з вас прыдзецца паехаць у сталіцу вялікіх дзяржаў, ну, скажам, у Парыж і ад імя беларускага ўраду завязаць дымплёматычныя зносіны.

Булач. О, гэта я разумею.

Крулік. Пачакай, выслухай.

Пірэ. (*Да Булача*). Вы, вось, здаецца, вайсковы?

Булач. Так точна! У царскай службе меў дзьве нагароды. Фэдфэбэлем дастаў Георгія, а з ім перавялі мяне ў прапаршчыкі. Прапаршчыкам выслужыў падпаручніка, далей рэвалюцыя не дала ходу.

Пірэ. Так, прашу з сёньняшняга дня лічыць сябе не прапаршчыкам і не падпаручнікам, а паручыкам.

Булач. Пакорна благадарым! О, гэта я разумею, а то, ведаеце, ваюеш ліха ведае за што.

Пірэ. (*Да Круліка*). А вы?..

Крулік. Я змагаюся не за чыны, а за свой беларускі народ. Ад усякіх нагарод я зараней адмаўляюся. Для мяне вышэйшаю нагародаю будзе бачыць яснае сонца ў сваім ваконцы. Бачыць вольную працу брата на сваёй зямельцы, чуць вольную песьню сястры-жняі і вясёлы гоман крынічкі, бору...

Пірэ. Так, даволі поэтычна.

Булач. А я хіба супраць сонца ці песьні?

Пірэ. Практычна: на Мазыршчыне і Гомельшчыне нашы опэрацыі разьвіваюцца пасьпяхова. З сёньняшняга дня актыўна пачынаем тут..

Масьлецкі. Зусім слушна.

Булач. Правільна.

Пірэ. Конкрэтна (*Адчыняе чэмаданчык. Да Масьлецкага*) вось вам на гэта, тут даволі дастатковая сума, рабеце, за гэтым астаноўкі ня будзе. (*Разьвітваецца. Да Сіверына*). Жадаю посьпеху! (*Да Булача*). Жадаю посьпеху, паручык Булач! (*Да Круліка*). І вам бачыць сваю краіну сонечнай і шчасьліваю. (*Хоча йці*).

Крулік. Прашу прабачэньня. У мяне яшчэ ёсьць запытаньне.

Пірэ. Ваша запытаньне зразумела бяз слоў. Пане Масьлецкі, дайце адказ.

Масьлецкі. (*Перадае Сіверыну грошы*). Мы-ж усе за незалежную Беларусь.

Сіверын. (*Перадае грошы Круліку*). Так, нашы думкі, пакуль што, не разыходзяцца.

Булач. Сюда! (*Масьлецкі кідае яму дзьве пачкі грошай*). Вось яна морфоза чалавечая.

Сіверын. Фортуна. (*Сіверын, Масьлецкі і Крулік зьнікаюць*).

Булач. (*Ступіў два крокі наперад*). Сёньня я гэрой. Вянок эўрапейскай славы на маёй галаве. (*Пад музыку выходзяць дзьве жанчыны, робяць пластычныя рухі і кладуць на галаву яго вянок*).

Карціна II

Пакой валаснога праўленьня, беспарадак. Каля стала стаіць Пербала. За сталом Ракіта. Каля дзьвярэй вартавы Алёша. Булач ходзіць па пакоі і дыктуе:

Булач. Пішы (*Счакаўшы*). Ага, пішы: яшчэ раз назначаю сябе комэндантам м. Сьляпое.

Ракіта. Мы першы раз пісалі не назначаю, а абвяшчаю.

Булач. Пішы: абвяшчаю. Не адзін чорт, ці пнём аб саву ці савой аб пень. Дабаў толькі: комэндантам і начальнікам гарнізону. Няхай сукіны сыны ведаюць, што я тут не адзін. Ага, слухай, Пербала, пусьці па вуліцы чалавек 5 конных з пікамі, няхай дыфэлююць.

Пербала. Слухаю, будзе пушчана 8 конных з пікамі.

Булач. Ня 8 сказана, а 5, што за ядрона... Скажы, каб ноччу далі некалькі выстралаў. Павінна адчувацца, што стаіць гарнізон. (*Пербала вышаў*).

Булач. Што ты там напісаў?

Ракіта. Яшчэ раз абвяшчаю сябе комэндантам і начальнікам Сьляпойскага гарнізону...

Булач. Сьляпойскі гарнізон, дурацкая назва. Ну, ладна, возьмем Менск, тады паправім. Пішы: і яшчэ раз загадваю ўсім быўшым афіцэрам ці чырвоным... адным словам, можа каторыя зьбеглі і каторыя знаходзяцца ў ваколіцах гарнізону на 10-вёрстным кругу, на працягу 36 гадзін зьявіцца да начальніка гарнізону на рэгістрацыю. (*Увайшоў Дубок*).

Вартавы. Уваход забараняецца! Трэбуецца коратка далажыць, па якой справе.

Дубок. А каму далажыць?

Вартавы. Ды хоць бы мне.

Булач. А, каго бачу, во малайчына, прапусьці! Здароў, Мікола! Сядай, во малайчына!

Дубок. Ня маю, браце, часу, вось шукаю, тут недзе чорт нейкага комэнданта прыгнаў, на рэгістрацыю загадвае зьявіцца.

Булач. Ты што—варона ці політычная няграматнасьць?

Дубок. А што?

Булач. Подпіс пад загадам чытаў?

Дубок. Чытаў.

Булач. Ну, што там?

Дубок. Ліха яго ведае, не разабраў.

Булач. Ага, тут у сваёй мясцовасьці падпішы разборчыва, дык ніводзін і ня прыдзе. А вось возьмем Менск, тады, браце, у друкарні друкаванымі літарамі падпішамся Бу-лач.

Дубок. Нічога не разумею.

Булач. Што ты не разумееш? Я—комэндант і начальнік гарнізону. Будзь спакойны, з бальшавікамі справа будзе скончана. К чорту. Абрыдла з імі цацкацца!

Дубок. Ага, правільна.

Булач. Беларусь будзе самастойнаю дзяржаваю, будзе ліцца вольная песьня, і сьвяціць жняя цьфу,—сонца.

Дубок. Ага.

Булач. Завядзем дыплёматычны контакт са ўсёй Эўропай, Францыяй, Англіяй (*У колідоры гоман. Да Ракіты*). Выйдзі, разьбяры там, калі ёсьць якія справы (*Ракіта выходзіць*). Дык вось, браце, мы будзем мець мажлівасьць паехаць у Парыж, Вэнэцыю і г. д.

Дубок. Ага. А скажы ты мне, ты у Вілейцы быў?

Булач. У Вілейцы? Не.

Дубок. Ты-ж глядзі, каб не давялося.

Булач. А што?

Дубок. Ды так, прышыбла цябе трохі.

Булач. Ну, ты свае жарты кінь. Я з табою гавару патаварыску, а магу і афіцыйна.

Дубок. Ну, вось я-ж і кажу, у Вілейцы ты мог бы паправіцца.

Булач. Кінь! Ты за Беларусь?

Дубок. За Беларусь.

Булач. Ну, ды якога-ж ты чорта разважаеш? Станавіся за работу дзеля сваёй бацькаўшчыны.

Дубок. Хто-ж цяпер у Вас старшы, ты ці Балаховіч?

Булач. Навошта такое пытаньне—Балаховіч ці я? Усёроўна, ці Балаховіч ці я. Важна ідэя. Даволі кацапам наводзіць тут свае парадкі, разводзіць свой бальшавізм, мабілізаваць нашых людзей і расстрэльваць у Чаке! (*Уваходзіць Ракіта*). Ну, што там?

Ракіта. Чатыры хлопцы пытаюць адносна паступленьня на службу да нас.

Булач. Скажы, каб добра накармілі іх, выдайце па 3 рублі і залічыце ў сьпісы 4 е роты 1-га батальёну. Во, бачыш, як у нас!

Ракіта. Там яшчэ бацюшка скардзіцца, што салдаты паляць царкоўны плот і сьсеклі бярэзіну.

Булач. Скажы, няхай прыдзе са скаргаю тады, як будуць паліць царкву і вешаць яго на бярэзіне. Людзі зубамі вырываюць сабе незалежнасьць, сапраўдную слабоду, а ён лезе з нейкім трухлявым плотам. Пачакай, скажы яму так: салдаты, якія палілі плот, будуць расстраляны (*Ракіта выйшаў. З крыкам праціскаецца жанчына, вартавы яе ня пускае*).

Вартавы. Ня цісьніся, кажу, бо я таксама магу паціснуць!

Жанчына. Што ты мяне паціснеш. Не такія ціскалі, ня страшна. Пусьці, кажу табе! (*Увайшла*).

Булач. Што яшчэ табе?

Жанчына. Мне падавайце самага старшага, каторы тут з вас?

Булач. Кажы, у чым справа.

Жанчына Чаго гэта да мяне столькі салдат наперла? Што гэта—малое мястэчка, мала хат? Мала таго, што ў хаце рязьмясьціліся як

дома, дык яшчэ і лезуць усюды.

Булач. Куды яны лезуць?

Жанчына. Туды, куды ня трэба. Мая спадніца не для таго, каб кожны лапаў.

Булач. Ну, дык чаго-ж ты хочаш?

Жанчына. Забірайце вашых салдат з маёй хаты, бо я ім галовы пасьсякаю.

Булач. Ой, глядзі, каб я часам не адсек табе язык.

Жанчына. Ага-а-а. Па салдатах відаць і начальнік.

Булач (*Гукае вартавому*). Пакліч Пербалу!

Вартавы. Слухаю. Пербалу—сюды. (*Ускаквае Пербала*).

Жанчына. Во, гэты шчарбаты таксама не дае праходу жанчынам.

Булач. Гэтая жанчына распаўсюджвае чуткі аб бальшавікох. Наводзіць паніку ў нашым войску.

Жанчына. Што тут чуткі, калі аб гэтым усе гавораць, ну што, хіба-ж яны далёка?

Булач. Арыштуй яе.

Пербала. Вы арыштаваны, прашу за мною.

Жанчына. Пашоў вон, смурод ты! Я не да цябе прышла!

Пербала. Выходзь!

Жанчына. Што ты командуеш? Ва фронт станавіся перада мною, сукін сын! Цьфу на цябе. (*Плюнула і пашла. Пербала за ёю*).

Булач. Вось чортава баба!

Дубок. А ў цябе тут даволі весела. Я так сабе і ўяўляў. І хоць ты пад сваім загадам і не разборчыва падпісваешся, аднак я ужо ведаў, што комэндант і начальнік гэтага гарнізону—Адам Булач. Вось я і прышоў на дармовае прадстаўленьне.

Булач. Слухай, у мяне цярплівасьці многа, але можа не хапіць.

Дубок. І тады што?

Булач. І тады пабачыш што. Я табе кажу патаварыску, мне няма калі жартаваць. Цяпер кожная хвіліна дорага. А вось станавіся ў рады, разаб'ем чырвоных, організуем сваю самастойную дзяржаву, спаткаемся дзе-небудзь у рэсторане ў Менску, Варшаве ці Парыжы і тады, калі захочам, пажартуем. Цяпер я табе раю, станавіся за работу, калі хочаш, каб на тваёй бацькаўшчыне (*нібы з захапленьнем*) была вольная песьня і сьветлае сонца...

Дубок. Гэта цікава.

Булач. А мо' ты хочаш зноў вярнуцца да чырвоных?

Дубок. О, не. Я браў водпуск, каб туды больш не варочацца.

Булач. Значыць, ты са мною?

Дубок. Так, ты крыху мяне з'агітаваў, ты ніштаваты агітатар.

Булач. Вось гэта і дрэнна, што прыходзіцца траціць час на агітацыю такога сьвядомага, адукаванага беларуса, як ты.

Дубок. Ну, добра, скажы ты мне, якую-ж ты мне дасі работу ў сваім войску?

Булач. О, гэта я разумею. Нарэшце такі. Цяпер мы можам гаварыць з табою душа ў душу, Мікола, пячонка ў пячонку, Мікола... Пачакай (*гукае*). Дайце сюды Пербалу!

Вартавы. Будзе Пербала (*гукае*). Пербала! (*Ускаквае Пербала*).

Булач. Дзьве бутэлькі добрае самагонкі.

Пербала. Даю 3 бутэлькі добрае самагонкі.

Булач. Вось, разумееш, чалавек заўсёды перабольшвае. Мы яму і назву прыдумалі такую, эўропейскае слова, па нашаму будзе пераўвялічэньне, пабольшаньне.

Дубок. А-а Гіпэрбала.

Булач. Пербала, я-ж кажу.

Дубок. Гіпербала, гі.

Булач. А на што тое гі? Пербала і ўсё. Зараз прынясе. А галоўнае, грошы ў нас ёсьць.

Дубок. На самагонку хопіць?

Булач. Хопіць і на кулямёты і на ерапляны.

Дубок. Ну, што ты?

Булач. Так, так.

Дубок. І дзе ты іх дастаеш?

Булач. Дастаём.

Дубок. Ну, усё-такі?

Булач. Як ты думаеш, у Эўропе грошы ёсьць?

Дубок. Ну, ёсьць.

Булач. Значыць ёсьць.

Дубок. Дык ты саўпраўды маеш сувязь з Эўропаю?

Булач. Чудак ты, Мікола. Мы маем сувязь з самымі буйнейшымі эўропейскімі дзяржавамі: Францыяй, Амэрыкай, Англіяй.

Дубок. Ага, Амэрыка, па-твойму, таксама Эўропа?

Булач. А што-ж гэта Азія (*Пербала прынёс 3 бутэлькі*).

Дубок. Ну, добра. Якое-ж ты мне дасі назначэньне?

Булач. Я лічу, што ты можаш быць маім памоцнікам па арганізацыйнай часьці.

Дубок. Ды што ты?

Булач. Яйбогу. Організацыя валасьцей, паветаў, губэрняў і рэспублікі, сваёй рэспублікі сваімі сіламі ў сувязі з Эўропаю. І паняесецца тады вольная песьня...

Пербала. Дазвольце далажыць, екстраная естахвета ад палкоўніка Сіверына.

Булач. Давай сюды (*Да Дубка*). Чуеш, у нас, браце, і палкоўнікі трымаюць фронт, ды я сам паручык (*Чытае, захваляваўся, лапнуў сябе за грудзі, наліў шклянку самагонкі і п'е. Дубок уважна глядзіць*). Морфоза праклятая! А яшчэ палкоўнік...

Дубок. Грубіяніць?

Булач. Адступае, чорт бы яго ўзяў. Тут трэба наступаць, а ён падмазаў пяткі, палкоўнік... (*Ускаквае Булачовец*).

Булачовец. Начальнік команды пытаецца, што рабіць, чырвоныя прабіраюцца з правага боку на бальшак, а з левага праз лес праскакалі будзёнаўцы.

Булач. Ну, дык што-ж, даць бой: пяхотаю направа, кавалерыяй налева! (*На дварэ шум, гоман*).

Булачовец. Ды іх больш чым палагаецца.

Булач. Што?

Булачовец. Іх больш чым нас.

Булач. А што там за шум? (*Пербала падбег да вакна*).

Пербала. Чаго вы загулі?

Галасы. Адступа-а-а-е-м!

Булач. Што?

Пербала. Адступаем, крычаць.

Булач. Хто даў такі загад? (*Выбягае*). Хто тут бунтуе? (*За ім выбег Пербала і Булачовец. На дварэ гоман. Уваходзіць Ракіта*).

Ракіта. Вось, знаеце, гісторыя, ах...

Дубок. Трывога?

Ракіта. Так... Усё яно так. А вы што, паступілі да нас на службу?

Дубок. Паступіў.

Ракіта. Няшчасны вы чалавек.

Дубок. А вы?

Ракіта. Я тым больш. Можа хто любіць розныя авантуры, дык таму і добра, а я гэтага ня люблю.

Дубок (*Рашуча*). Дык чаго вы сядзіце тут? Кідайце ўсё к чорту. Ідзеце да чырвоных, мажлівасьць ёсьць.

Ракіта. Для мяне няма мажлівасьці, я з Чырвонай арміі прышоў сюды.

Дубок. Ах, так. Так... З якое часьці?

Ракіта. Я быў у Дарагабужы, там страшэнны голад і такія някультурныя адносіны. Паверыце, што, уцякаючы адтуль, я ня думаў іці ні ў якое войска, ажно ўшчамілі мяне тут, і я цяпер ня ведаю, што рабіць, пусьціць сабе кулю ў лоб не адважуся. А вы, здаецца, таксама былі ў Чырвонай арміі?

Дубок. Я таксама... быў... (*Уваходзіць Булач*).

Булач. Праклятая морфоза! Зьбірай манаткі. Адступаем.

Ракіта. Значыць, загаду расклейваць ня будзем?

Булач. Якога загаду?

Ракіта. Што пісалі.

Булач. Зьбірай хутчэй паперы, чорт бы цябе пабраў! Ён яшчэ думае аб расклейцы загаду. Тут табе зараз так могуць бальшавікі наклеіць, што ты не пазнаеш самога сябе (*Хутка апранаецца*). А ўсе-ткі шкада пакідаць ворагу свайму (*Да Дубка*). Вып'ем, браце, і пойдзем на новыя позыцыі (*Выпіў*), а пасьля з новымі сіламі.. У нас ёсьць

свае людзі і ў бальшавікоў у адным блізкім павеце камісар наш. (*На дварэ гоман, крыкі. У такой убегі Пербала*). Што там яшчэ за ліха— рэжуць каго ці што? (*Бярэ адну бутэльку ў кішэню*).

Пербала. Гэта нашы хлопцы запасаюцца пакупкамі ў крамах і так па хатах, каб на дарогу, ну, а яўрэі, вядома, любяць пакрычаць.

Булач. Заставы заняліся?

Пербала. Заняліся.

Булач. Ну, Мікола, адступаем разам.

Дубок. Разам.

Булач. (*Да Пербалы*). Давай сыгнал і команду. Я іду (*Да Дубка і Ракіты*). А вы тут складайце канцэлярыю (*Пайшоў. На дварэ гоман, крык, сыгнал*).

Дубок. (*Да Ракіты*). Хутчэй забірайце, дрэнь пакідайце. Сакрэтныя дайце сюды. (*Ракіта перадае частку папераў*).

Ракіта. Вось, усяго гэтыя (*Дубок бярэ*). Куды іці, куды іці я ня ведаю? (*Забегаў па пакоі і вышаў. За сцэнаю крык, шум*).

Дубок (*Схапіўшы паперы*). Я ведаю, куды іці. (*Вышаў у другія процілеглыя дзьверы*).

Карціна III

Крэйд. Што вы нападаеце на міліцыю? Міліцыя не праваліла ніводнае опэрацыі. Нельга-ж кідаць якіх пяць-шэсьць чалавек супраць арганізаванае банды ў сорак штыкоў.

Галінскі. Калі патрэбна, дык і адзін павінен пайці.

Міра. Я не нападаю, але лічу, што да гэтае пары нейк нядбала адносіліся да выбрыкаў булачоўцаў. Мы ня можам дапусьціць, каб варожая рука вырывала з нашых радоў вясковых работнікаў.

Галінскі. А што-ж мы не пасылалі атрадаў?

Міра. Пасылалі і начальнікам атраду назначалі варону.

Дубок. У чым справа?

Міра. Я не пра цябе. Быў-такі твой папярэднічак.

Галінскі. Адсюль вывад?

Міра. Усе сілы кінуць на ліквідацыю банд.

Галінскі. Дзіўлюся. А хто кажа, што ня трэба? Хто? Чаго крычаць? Я заяўляю, што фронт бандытызму—сур'ёзны фронт і на такім фронце могуць быць і перамогі і правалы.

Крэйд. Правільна.

Міра. А я кажу, што правалаў не павінна быць!

Галінскі. Ну, вось, гавары ты з ёю. Можа-б ты заняла маю пасаду ваенкома і старшыні камісіі па барацьбе з бандытызмам?

Дубок. Давайце аб справе.

Крэйд. Давай, Галінскі, заданьне.

Галінскі. Аб заданьні я і хачу гаварыць, а тут я чую нейкія ўпікі.

Міра. Я ні ў чым цябе ня ўпікаю.

Дубок. Давай. Галінскі.

Галінскі. У нас ёсьць даныя, што ў Брадзецкім лесе зьявілася даволі значная група бандытаў булачоўцаў, ня менш 80 штыкоў. Мажліва, што недалёка дзе ў другім месцы яшчэ знойдзецца гэтага дабра. Усё гэта паказвае, што яны зьбіраюцца прарабіць сур,ёзную опэрацыю (*Дубок разгортвае і разглядае карту*) і, як мне здаецца,—налёт на горад.

Міра. Ну-у?

Галінскі. Мажліва, што яны наскочаць на мястэчка Шоры, а таксама на станцыю Кладкі, каб спаліць ссыпны пункт. Але ў найбольшай небясьпецы ўсё-такі горад.

Дубок. Горад? На такую рызыку яны ня пойдуць.

Галінскі. Якраз яны нічым не рызыкуюць. Ночы хопіць, каб уцячы ня толькі ў нэйтральную зону, а і далей. Я прапаную: забясьпечыць штыкамі ўсе пункты з галоўнымі сіламі ў горадзе.

Дубак. У мяне ёсьць трошкі іншыя меркаваньні: мала таго, што мы пашлем сілы і будзем абараняць горад ці мястэчка. Нам трэба прасачыць іх месца і напрамак і разьбіць.

Міра. Правільна.

Галінскі. Сто раз правільна. А як конкрэтна?

Дубок. Зараз-жа паслаць некалькі конных міліцыянэраў, каб зьвязаліся з 3-4 вёскамі і далейшаю іх маршрутнаю станцыяю. Праз гадзіну туды-ж на станцыю адправіць на грузавіку дваццаць чалавек з вартавое роты з кулямётамі.

Галінскі. Праз лес едучы, наробяць грузавіком столькі гуку, што гэтым самым якраз можна папсаваць справу.

Дубок. Ну, таварышы, на станцыі з 3 раёнаў развёрстка, гэта ня жарт. Я са сваім атрадам пайду ў напрамку мястэчка Шоры, таварыш Крэйд з часткаю конных міліцыянэраў выедзе на бальшак у напрамку да старога млына—вось яго вучастак.

Галінскі. А горад на каго пакінеш?

Дубок. А ў горадзе застаецца частка вартавое роты і міліцыя. Вось мае меркаваньні.

Крэйд. Я згаджаюся з т. Дубком. толькі ў мяне малавата конных, усяго дзесяць чалавек.

Дубок. У цябе разьведачная работа і сувязь.

Галінскі. Я лічу пасылку да мястэчка ўсяго твайго атраду немэтазгоднай, гэта значыць аддаць туды фактычна усе лепшыя сілы. Я лічу неабходным частку твайго атраду накіраваць для аховы нашага маста.

Дубок. Я аднаго не разумею—на нас ніхто не наступае, а мы з свайго гораду хочам стварыць нейкую крэпасьць. Я глыбока перакананы, што налёт рыхтуецца на мястэчка.

Міра. І я так думаю.

Галінскі. А мне дазвольце думаць крышку інакш і даць вам загад: 10 чалавек з твайго атраду пашлю для аховы маста, гэта катэгорычна.

Дубок. Слухаю. Пашлю 10 чалавек.

Галінскі. (*Да Крэйда*). Ты з коннымі міліцыянэрамі выяжджаеш на бальшак. (*Да Дубка*). Ты...

Дубок. Я іду ў мястэчка.

Галінскі. Ну, добра, раз табе так хочацца.

Дубок. Што значыць хочацца? Гэта неабходна.

Галінскі. Возьмеш дваццаць штыкоў.

Дубок. Мала!

Міра. Немажліва.

Галінскі. Даволі!

Міра. Мала!

Галінскі. Ну, тады бяры столькі, сколькі табе трэба, і адказвай за ўсю опэрацыю. Я не магу адказваць. (*Звоніць тэлефон. Слухае Крэйд*).

Крэйд. Чакайце. Так. Гаворыць Крэйд. Выслаць атрад?

Галінскі. Хто звоніць?

Крэйд. З мястэчка Шоры. Просяць атрад.

Дубок. Ну, вось бачыце!

Галінскі. Дай трубку. Гаворыць Галінскі. У чым справа? Так. Ага. А хто наводзіць паніку? Што? Усім заставацца на месцы. Атрад будзе тады, калі гэта патрэбна будзе. Што? Я ведаю. (*Палажыў трубку*). Трусы няшчасныя! Зараз даю загад вартавой роце.

Міра. Тады я таксама пайду з табою, Дубок, у мястэчка.

Галінскі. Гэта-ж для чаго?

Міра. Бо там мала людзей.

Галінскі. А ты іх па дарозе родзіш?

Міра. Можа і раджу.

Дубок. Я табе ня раю іці.

Міра. Што значыць ня раю? Сказала—значыць іду, і проста толькі паведамляю цябе аб гэтым. (*Міра, Дубок, Крэйд выходзяць*).

Крэйд. Каб былі лішнія коні, я ўзяў бы цябе, Міра, з сабою. (*Вышлі. Галінскі ў момант прадумаў. Падбягае да дзьвярэй*).

Галінскі. Дубок, вярніся на хвілінку. (*Уваходзіць Дубок*). Я згодзен з табою, што мястэчка і станцыя са складамі — найбольш небясьпечныя пункты, і таму лічу патрэбным: на мост пасылаем з вартавое роты, на станцыю паедзеш ты, а з атрадам у мястэчка іду я.

Дубок. Чаму ты сам хочашь іці?

Галінскі. Раз лічыце, што гэтае месца найбольш небясьпечнае, я сам павінен быць там.

Дубок. Ладна. Я згодзен.

Галінскі. Валі на станцыю. (*Дубок пайшоў. Галінскі прачыняе бакавыя дзьверы, адтуль высоўваецца чалавек*). Чуў?

Чалавек. Чуў.

Галінскі. На мястэчка іду я. Са мною два кулямёты. Даю пароль. (*Вярнуўся Дубок*).

Дубок. Так я і хачу запытаць: пароль будзе агульны для ўсіх атрадаў.

Галінскі. (*Зьбянтэжана*) Дубок... пароль... Я дам. (*Піша і перадае*). Вось так.

Дубок. А ты вазьмі з сабою чалавек пяцьдзесят.

Галінскі. Так, так. Яж вось зараз званю. (*Бярэ трубку. Дубок выйшаў. Галінскі палажыў трубку. Піша пароль, перадае чалавеку і нібыта па тэлефону гаворыць*) Дайце вартавую роту. Роту.

Заслона.

АКТ II

Карціна I

Вечар. Далёка відаць аганькі гораду. З боку будынак вясковае школы. Галінскі і Міра вядуць атрад па барацьбе з бандытызмам. Спыніліся.

Галінскі. Вось што, хлопцы, я думаю, што мы пойдзем лепш не праз вёску, а па загуменьню. Тут ёсьць невялічкая дарожка. Пойдзем ціха. Ты вядзі, Міра, а я на хвілінку забягу ў школу да знаёмых.

Міра. Толькі-ж не надоўга.

Галінскі. Ну, што ты, я хутка, а калі што, ты там у канцы, вёскі спынішся. Я даганю.

Міра. Май на ўвазе, што мы і так крыху позьнімся.

Галінскі. Нічога. Ну валеце. (*Атрад пайшоў. Галінскі падыходзіць да ганку і стукае ў дзьверы*).

1-шы чырвон. (*2-му чырвонаармейцу*). Да мілае свае стукаецца.

2-гі чырвон. Ну?

1-шы чырвон. Хвакт. Спрытная настаўніца. Часта ў яго бывае.

2-гі чырвон. Ну?

1-шы чырвон. Хвакт.

Аксеня (*За дзьвярыма*). Хто там?

Галінскі. Я.

Аксеня. Хто?

Галінскі. Раз—два.

1-шы чырвон. О, чуеш? Раз—два і ў дамкі (*Пайшлі*).

Аксеня. (*Прачыніўшы дзьверы*) А, я зараз. (*Галінскі адышоў ад дзьвярэй і ўглядаецца ў той бок, куды пайшоў атрад*)

Галінскі. Пашлі. (*Прыкра ўсьміхнуўся*). Вечар цёмны. Яшчэ цямнейшай будзе ноч. Гарачая ноч. Ха-ха. (*На ганку зьявілася Аксеня*).

Аксеня. Ну, дзе ты?

Галінскі. Я... я тут.

Аксеня. Ты з кім тут? З салдатамі?

Галінскі. Так. з атрадам.

Аксеня. Куды ты?

Галінскі. Біць бандытаў.

Аксеня. Што гэта ты сам, ты ня мог так, як раней, паслаць каго-небудзь?

Галінскі. Пасылаў, а цяпер іду сам. Трэба-ж калі-небудзь падставіць і сваю галаву.

Аксеня. Ну, ну, пакінь такую размову, пакінь.

Галінскі. Што-ж тут дзіўнага? Вось разьвітаюся з табою, ступлю некалькі крокаў, а там дзе-небудзь, за плотам, сядзіць булачовец, трахне, і мяне няма.

Аксеня. Коля, ну пакінь, я не хачу гэтага чуць.

Галінскі. Сеня. (*Схапіў і цалуе*).

Аксеня. Коля, ты як-небудзь асьцярожным будзь. (*Садзіцца на лаўку*). Я цябе прашу.

Галінскі. Ну, як жа асьцярожна, не хавацца-ж мне за кусты, не ў маёй гэта натуры. Якраз сёньня прадстаўляецца мажлівасьць разьбіць вялікую групу бандытаў, і я павінен гэта зрабіць. Так, я сваё зраблю. Толькі я хачу, каб ты мяне зразумела.

Аксеня. А ты іх шукаеш ці ўжо ведаешь, дзе яны знаходзяцца, дзе будуць праходзіць?

Галінскі. Прыблізна ведаю.

Аксеня. Страшна, Коля (*Туліцца да яго*). Можа сюды прыдуць, можа мне пайці начаваць да каго?

Галінскі. Э, не, ты можаш спакойна спаць салодкім сном, мая Сенечка.

Аксеня. Ня буду я спакойна спаць. Як бы прадчувала маё сэрца, я сёньня ўвесь дзень нейкая неспакойная. Як толькі сьцямнела і ў горадзе запаліліся агні, я доўга стаяла і глядзела на іх, а яны то нейк празрыста засьвецяцца, то раптам цьмяна. Я ўспомніла цябе... і сэрца нейк трывожна забілася, так, як ніколі.

Галінскі. Эх, Сеня, якая ты слаўная! Толькі з табою я адчуваю сябе добра. А так нікога не хацелася-б бачыць, так усё абрыдла...

Аксеня. Што ты, Коля?

Галінскі. Дрэнна, Сеня.

Аксеня. Чаму табе дрэнна? Ну ты многа працуеш, але-ж затое ты комісар, маеш вялікія правы, маеш мажлівасьць весьці вялікую адказную працу, ну і маеш пэўную пашану.

Галінскі. Ад каго?

Аксеня. Ну ад усіх.

Галінскі. А к чорту з такою пашанаю, што мне іх пашана?.. Але аб гэтым ня трэба... Усё добра, усё добра, Сеня.

Аксеня. Не, ня зусім добра. У цябе нейкая няпрыёмнасьць. Так Коля? Скажы

Галінскі. Не, нічога, глупства. Усё пройдзе, усё будзе добра.

Аксеня. Ну вось так ты і кажы. Такую развагу я люблю слухаць. А ўсё-ткі я яшчэ не разгадала цябе так, як бы мне хацелася. (*Галінскі занепакоена паглядзеў у бок*). Што, табе трэба іці? Так? Ідзі.

Галінскі. Так трэба іці. Ну. (*Хоча разьвітвацца*).

Аксеня. (*Кінулася яму на грудзі*). Коля, я не хачу. Я баюся, каб цябе не забілі.

Галінскі. Баішся? А скажы, Сеня, вось калі мяне не заб'юць, а жывым захопяць бандыты, жывым, і мне прапануюць альбо страшэнную пакутную сьмерць, альбо быць з імі і рабіць тое, што яны робяць, штоб ты хацела, каб я выбраў?

Аксеня. Я не хачу, Коля, ні таго, ні другога.

Галінскі. Гэта не адказ. Падумай і скажы.

Аксеня. А так можа здарыцца?

Галінскі. Так часам здараецца.

Аксеня. Гэта страшна, я баюся, Коля! Я баюся нават падумаць аб тым, што ты там... разам з бандытамі...

Галінскі. Ну, значыць, сьмерць, пакутная, дзікая сьмерць.

Аксеня. Не. Коля, не! Я не хачу! Я!..

Галінскі. Бывай. (*Хапае яе, цалуе і адыходзіць. Аксеня некаторы момант стаіць як скамянелая, пасьля апускаецца на лаўку*).

Карціна II

Лес. Далёка чуваць перастрэлка. На сцэне нікога няма. Перастрэлка ўзмацняецца. З вінтоўкаю выскаквае чырвонаармеец. Паглядзеў ў адзін бок. другі і гукае сваіх.

Чырвонаарм. Сюды, сюды, тут пройдзем. (*Выстрал, і ён нахіляе галаву. За ім выскакваюць другі, трэці чырвонаармейцы, пасьля Міра*).

Міра. Чакайце, стойце. Дзе камісар? Хто з вас бачыў Галінскага?

Чырвонаарм. Ня відаць было. Яго напэўна ўлажылі недзе.

Чырвонаарм. Ён напэўна адступае з тэй нашай часткаю.

Міра. Ціха. Давайце адступім яшчэ крыху і там заляжам. Як з патронамі?

Чырвонаарм. Ёсьць. (*Чуваць кулямёт. Усе прыпалі да зямлі*).

Чырвонаарм. Перапаўзайма. (*Пачынаюць паўзьці. Раптам у тым баку, куды яны паўзьлі, галасы: „стой!". Чырвонаармейцы кінуліся назад, а ззаду выскачыла некалькі булачоўцаў*).

Булачоўцы. Стой, стой! (*Схапілі чырвонаармейцаў і Міру*). Папаліся! Шукайце, мо' тут блізка яшчэ прытаіліся. Кажэце, многа вас тут, а? (*Да аднаго чырвонаармейца*) Кажы, а то ўсаджу штык у бальшавіцкі твой жывот!

Чырвонаармеец. Многа

Булачовец. Сколькі?

Міра. Палічэце

Булачовец. Ага, што? (*Прыглядаецца*). Ого, спаднічка. Забірай, братва, іх у штаб, там мы ранічкай палічым, добра палічым і палічымся. А ну, пашлі. (*Павялі*).

Карціна III

Лес. Стаянка Булача. З боку адна палатка. На авансцэне стаіць вартавы Алёша, усьпёршыся на вінтоўку, якую ён паставіў руляю на пень. Воддаль чуваць гоман, сьвіст, бразганьне. Вартавы задумаўшыся глядзіць у адну кропку. Некаторы час на сцэне нікога няма. Пасьля зьяўляецца збоку Сьпірыдок. Ён нясе бярэмя чырвоноармейскага адзеньня: штаны, шапкі, бацінкі. Кідае пасярод сцэны і разглядае.

Сьпірыдок. Нічога людзкага няма.
Вартавы (*Глянуў на яго*). Абадраў?
Сьпірыдок. Што?
Вартавы. Абадраў?
Сьпірыдок. Не абадраў, а трахвеі праціўніка.
Вартавы. З мёртвага цела?
Сьпірыдок. А нашто каб прападала? (*Прымярае будзёнаўку*)

(*Ідзе Гніда*)

Гніда. (*П'яны пяе на мотыў „Яблычка"*)

Эх ты, маці мая,
Ды прачыстая,
Водзіць сіла мяне,
Ды нячыстая.
Водзіць сіла мяне,
Ды нячыстая,
Эх ты, маці мая,
Ды прачыстая.

(*Убачыўшы салдата ў будзёнаўцы*). Вой! а ты хто? (*Раптам ззаду Сьпірыдка сталі два чырвонаармейцы. Гніда аслупянеў. Дрыжачым голасам ён гаворыць*). Гэта ня я вас забіваў... Гэта нехта другі... Не я, дальбог, ня я.

Сьпірыдок. (*Глядзіць на яго*). Ты чаго гэта божкаеш?

Гніда. Я... я больш ня буду.

Сьпірыдок. Ня будзеш піць? (*Зьняў будзёнаўку, чырвонаармейцы зьнікаюць*). А што ты будзеш рабіць, га?

Гніда. Гэта хто, гэта ты Сьпірыдок?
Сьпірыдок. А ты думаў хто?
Гніда. Я? гыг-гі, а дзе тыя тры чырвонаармейцы?
Сьпірыдок. Якія, што ты забіў?
Гніда. Ага, тыя.
Сьпірыдок. Ляжаць у кустох, дзе-ж?
Гніда. А хто-ж гэта тут стаяў?
Сьпірыдок. Дзе?
Гніда. Ды вось тут, дзе ты стаіш.
Сьпірыдок. Я і стаяў.
Гніда. Няўжо ты, Сьпірыдок?
Сьпірыдок. А хто-ж другі?
Гніда. І... і... прачыстая твая маці, Сьпірыдок. Сьпірыдок, ты быў утрох асобах, у трох ліцах.
Сьпірыдок. Я быў адзін, а табе траіцца.

Гніда. Нічога, няхай траіцца, толькі каб не палохала. А ты напалохаў, прачыстая твая маці! *(Прышоў Пербала)*.

Пербала. Сьпірыдок, Сьпірыдок!

Сьпірыдок. Ну, я Сьпірыдок.

Пербала. Управіўся, закапаў?

Сьпірыдок. Пакуль што падрыхтаваў яму і разьбіраю (*Паказвае на адзежу*) вось гэта барахлішка.

Гніда. І мяне напалохаў.

Сьпірыдок. Нічога няма на іх людзкага.

Пербала. А навошта ты зьдзіраеш рознае барахло, клаў бы ў гэтым іх адзеньні.

Сьпірыдок. Ды яно мо' і так увайшлося-б, але і мёртваму ў адзеньні ляжаць нязручна.

Пербала. Кідай к чорту ўсё гэта! Шапкі толькі можаш пакінуць для разьведкі. (*Пайшоў*).

Гніда. (*Пяе*). Эх ты маці, мая ды прачыстая... (*Да вартавога*). Алёшка! Ты што стаіш? Стаіш, Алёшка, на варце? А я ня люблю стаяць. Ня люблю стаяць, ня люблю сядзець, ня люблю ляжаць. Іду і іду да канца, а раз дайду да канца, значыць канец. Алёшка! Вось я ноч ня спаў, а скажы зараз налёт, я зноў паімчуся, зноў буду гуляць, разьбіваць, душыць!.. (*Сьпірыдок, сабраўшы адзеньне, пайшоў*).

Вартавы. Скажы, вы многа ў гэтую ноч забілі людзей у мястэчку?

Гніда. Ня ведаю. Я толькі ведаю, колькі я. Я дваіх: мужычка, дурня, што лаяўся, і адну маладую яўрэячку. Ну і тут траіх чырвоных таксама. Эх, Алёшка! Як наляцелі мы спачатку на Рэўком, ну там нікога ня было, а пасьля пашлі па жыдох. Зьвінела ўсё! Прачыстая твая маці! Грошы, гадзіньнікі, сурдуты!.. (*Прышоў Пербала*).

Пербала. А дзе Сьпірыдок? Чаму ён пакінуў ў кустох аднаго чырвонага? (*Гукае*) Сьпірыдок, Сьпірыдок! (*Да Гніды*) А ты ішоў бы, паспаў бы крыху пасьля працы.

Гніда. Я спаць? Вы будзеце піць, а я спаць? Папробуй палажыць!

Пербала. Я не кладу, я толькі раю.

Гніда. Не магу спаць, ня буду спаць, я буду хадзіць, хадзіць.. (*Зьяўляецца Сьпірыдок*).

Сьпірыдок. Клікаў?

Пербала. А чаму ты пакінуў адзін труп? Прыбяры, бо скора прыдзе начальнік.

Сьпірыдок. Ня можа быць.

Пербала. Ды я-ж толькі што наткнуўся.

Сьпірыдок. Значыць, аблічыўся... (*Пайшоў*).

Гніда. (*Да Пербалы*) Піць скора будзем?

Пербала. Прыдзе Булач, тады за яго здароўе цяпнем па конаўцы (*Пайшоў*).

Гніда. Правільна. А ёсьць дурні, якія ня могуць конаўкаю. А я п'ю, вядром буду піць, цэбрам, купацца буду ў самагонцы. Э-эх! (*Заскрыіітаў зубамі*). Алёшка, што гэта нешта пячэ маё нутро? Нейкі страшна пякучы агонь ліжа маю вантробу. Вогненным шылам коле мне ў сэрца!.. А я таксама калоў... Яны былі прывязаны вяроўкай да дрэва так, у рад: адзін, два, тры... А вочы іх глядзяць, спачатку шэсьць, а пасьля іх многа, многа, і ўсе ўтаропіліся на мяне. А я, прачыстая іх маці, нічога не баюся! (*У гэты момант праз сцэну*) ў *другі бок Сьпірыдок нясе ці проста валачэ забітага чырвонаармейца*). Вось, вось глядзі, якія вочы. Забіты і глядзіць, а я яго калоў гострым штыком ха-ха-ха, а кроў цвыр, цвыр х-ха-ха-ха! А зямля п'е, і я п'ю..

Вартавы. (*Крычыць на Гніду*). К чорту адсюль! Ты, шалёны сабака! Ідзі адсюль, бо я цябе застрэлю! (*Ляснуў замком вінтоўкі*). Ідзі, бо палажу на месцы! (*Зьяўляецца Булач*).

Булач. А што тут такое?

Гніда. Я ня ведаю. Я калоў...

Вартавы. Ён лезе да мяне, а я на варце. Я вартавы і... і не падпушчаю.

Булач. (*Да Гніды*). Ляж, пасьпі. Чуеш? Ідзі пасьпі, ты змарыўся.

Гніда. Мяне спаць? За што мяне адпраўляеш спаць, калі я хачу жыць?

Булач. Ну даволі, супакойся! Жыві, а хто цябе душыць?

Гніда. Душаць і гарачыя вогненныя гвазды заганяюць у маё сэрца, і яно гарыць, гарыць, гарыць... (*Зьяўляецца Пербала*). Пайду вып'ю, прачыстая яго маці! Вып'ю... (*Пайшоў*).

Булач, (*Да Пербалы*). Ну, як там камісарша?

Пербала. Маўчыць. Трэба што-небудзь рабіць, бо нашы хлопцы выпілі і могуць папсаваць, а можа і разарваць, а з гэтымі гатова, Гніда прыкончыў іх.

Булач. На што? Чаму?

Пербала. Такі быў ваш загад, сказалі пакінуць толькі камісаршу.

Булач. Ага. Давай яе сюды.

Пербала. Слухаю. (*Крычыць*). Гэй, хлопцы, давай сюды камісаршу!

Булач. (*Закурвае, падыходзіць да вартавога, глядзіць на яго*). Ты граматны?

Вартавы. Я граматны.

Булач. І добра ці так сабе?

Вартавы. З пачатковае школы.

Булач. (*Садзіцца на пень, над якім стаяў вартавы. Крыху счакаўшы*). Даўно стаіш?

Вартавы Амаль усю ноч.

Булач. Ідзі. Выпі там. *Вартавы пайшоў. З крыкам і сьвістам п'яныя булачоўцы вядуць Міру. Булач моўчкі сядзіць. Як толькі прывялі, ён ускочыў і крыкнуў*). Ціха! Спакойна! (*Яны сьціхлі*). Даволі скаліць

зубы. Спакойна! (*Зноў усе змоўклі, толькі дзіка пераглядаюцца. Пісар з паперaю і алоўкам стаіць ззаду. Ён нарыхтаваўся запісваць дапрос*). Ну, як вы сябе адчуваеце ў нас? (*Міра маўчыць. Булач глянуў на яе*). Дайце крэсла. (*Булачовец падстаўляе ёй палатнянае паходное крэселка*). Я спадзяюся, што мы пагутарым, можна сказаць, патаварыску. Сядайце. Вас мобілізавалі ці вы самі добраахвотна? (*Міра маўчыць*). Сядайце. Я раіў-бы вам адказваць на мае запытаньні. Так будзе лепей для вас. Ня думайце, што мы зьвяры, што ў нас няма сумленьня ці далікацтва.

Міра. Калі ў вас ёсьць сумленьне, дык вы зрабеце тое, аб чым я папрашу вас.

Булач. Калі ласка, калі ласка.

Міра. Я папрашу вас хутчэй застрэліць мяне!

Булач. Ды што вы, што вы! Гэтага я зусім і ня думаю рабіць. Я вельмі высока шаную гэройства чалавека, а ў тым ліку і жанчыны, і асабліва жанчыны, а ў вас гэройства ёсьць. Ведаеце, што нам такая жанчына вельмі патрэбна, такая жанчына будзе мець у нас вялікую пашану і поўны дастатак. Перадайце кубак віна. (*Пербала падносіць ёй віно*). Прашу! (*Міра ня берэ*). Віно добрае. І вы такім чынам падмацуеце сябе. Прашу!

Міра. Я піць ня буду.

Булач. Вы мо' думаеце, што тут што-небудзь прымешана. Дык вось вам з гэтае самае бутэлькі першым выпʻю я. (*Налівае сабе і пʻе*). Цяпер вы павінны выпіць.

Міра. Я піць ня буду.

Булач. Вы будзеце піць! (*Да Пербалы*). Паднясі ў губы (*Пербала хоча ліць у рот*).

Міра. З бандытамі я ня пʻю.

Пербала. З намі яна ня пʻе.

Булач. (*Усхапіўся*). А хто бандыт? Га? Хто?

Міра. Ты—першы бандыт!

Булач. (*Спачатку ня ведае, што рабіць, пасьля*). Леце ёй у рот! (*Два хапаюць яе і трымаюць, а Пербала льле віно ёй у рот. Міра баронiцца і выбівае з рук кубак*).

Пербала. Усё.

Булач. Што ўсё? Леце ёй з бутэлькі.

Міра. (*Да ўсіх*). У каго з вас ёсьць хоць капля чалавечнасьці, застрэль мяне, каб гэты зьвер хутчэй напіўся крыві. (*Яе схапілі за галаву і пачынаюць ліць віно*).

Булач. Стойце, ціха! Скажы ты мне, вось ты пашла лавіць нас Вось калі-б ты злавіла мяне, каб я папаўся ў твае ручкі, штоб ты са мною зрабіла?

Міра. Прыстрэліла-б цябе, як гадзіну.

Булач. Так! А я з табою зраблю крышку інакш. Хлопцы, бярэце яе, вядзеце ў кусты... (*Булачоўцы хапаюць яе, адпіхаючы адзін другога*).

Адзін. Куды ты піхаеш, я ў лесе злавіў яе.

Другі. Ня лезь, у зубы дам!

Трэці. Пашлі вы!

Чацьверты. Ня тузай так! (*З крыкам і сьвістам адыходзяць. Булач Стаіць і дзіка ўглядаецца ў адну кропку. Пісар глядзіць у той бок, куды павялі Міру, і хоча няпрыкметна пайці. Пербала заўважыў*).

Пербала (*Да пісара*). Ты куды?

Пісар. Я нікуды. Я хацеў бы паглядзець збоку для інтарэсу.

Пербала. Не, стой тут.

Булач (*Нібы апамятаўшыся*). Га? Што такое?

Пербала. Усё ў парадку, пане паручык. (*Падышоў вартавы — Алёша*).

Вартавы. Пане паручык, дазвольце, я пайду прыстрэлю яе.

Булач. Калі гэта патрэбна будзе, я скажу. (*Да Пербалы*). Глядзі, Пербала, каб не разарвалі, няхай далікатна. (*Булачовец прывёў двух чалавек*).

Булачовец. Прымайце двух.

Пербала (*Да пісара*). Прымі, браток, а мне трэба іці.

Пісар. Я пайду замест цябе, а ты прымі.

Булач. Што там?

Пербала. Кантрабанда.

Булач. Давай сюды. А ты (*Да пісара*) схадзі і скажы, каб былі далікатны.

Пербала. Не паслухаюць яго.

Булач. Мяне паслухаюць. Ступай. Давай сюды гэтых. (*Пісар пашоў. Выходзяць Яшка Баравік і Саладухін*).

Яшка. Маю гонар прывітаць галоўнага начальніка нашае нэйтральнае зоны пана Булача.

Булач Ну?

Яшка. Гэта мой кампаньён з Масквы Сідар Іванавіч Саладухін.

Булач. Маскаль?

Саладухін. Розныя бываюць.

Яшка. Не, ён мірны чалавек. Так, як і я.

Булач. Ну, што ў вас?

Яшка. Просім падтрымаць з нашым інтарэсам.

Булач. А той раз удалося?

Яшка. Слава богу, сышло.

Булач. Богу? А я тут ні пры чым?

Яшка. Ну, вы само сабой. Вы для нас, можна сказаць, першая божаская інстанцыя.

Булач. Які тавар хочаце правезьці?

Яшка. Прыблізна той самы, ну і яшчэ сёе-тое.

Булач. Канкрэтна.

Яшка. Канфэкты? Фі, хто гэта будзе вазіць гэтае глупства.

Булач. Я пытаюся, што гэта такое тое-сёе?

Яшка. А, а? Ну, скажам, какаіну і яшчэ што-небудзь такое тонкае.

Булач. Калі думаеце правозіць?

Яшка. Заўтра.

Булач. Ладна. Прапусьцім і паможам. Давай.

Яшка (*Дае залатыя пяцёркі. Ён кідае іх у руку*). Вось так, пане.

Булач. А ну, падкінь яшчэ штучак дзесяць больших.

Яшка. Яшчэ? Слухаю (*Да Саладухіна*). Палажы сюды яшчэ дзесяць па дзесяць.

Саладухін. Дзесяць па дзесяць? Будзьце ўважаемы (*Дастае па аднэй дзесятцы, адлічвае і дае Булачу*). Будзьце ўважаемы. (*Яшка падыходзіць да Пербалы, да булачоўца і дае ім грошы*).

Булач. Слухай, ты там у Маскве? Скажы, ці доўга вы там будзеце трымаць і пакланяцца Леніну?

Саладухін. Затрудняюся сказаць.

Булач. Купцоў у вас многа там, а ніводзін дурань не возьмецца, каб зьніштожыць якою бонбаю.

Саладухін. Дзействіцельна. Затрудняюся толькі сказаць.

Яшка. Я думаю, што бальшавікі самі скора пазводзяцца мірным парадкам.

Булач. Ты так думаеш?

Яшка. А як я магу думаць? Ваяваць з роду не ваяваў.

Булач (*Да Саладухіна*). А ці чуў ты ў Маскве што-небудзь пра мяне? Што там кажуць?

Саладухін. Я ня ведаю, ці знойдзецца такі чалавек, які-б ня ведаў вашага імя. Кожны з вялікай нецярплівасьцю чакае, калі вы са сваім войскам увойдзеце ў Маскву. І тады патрыярх Ціхан сваёю ўласнаю рукою ўдарыць у звон Хрыста спасіцеля.

Булач. Ага. Ну, а ты што будзеш рабіць?

Саладухін. Затрудняюся сказаць вам у точнасьці, але радасьць будзе выказана поўнасьцю.

Булач. Ага. А калі ўзяць вяроўку, разумееш?

Саладухін. Разумею: пяньковую вяроўку.

Булач. Ну, вось. У вяроўцы два канцы.

Саладухін. Точна два.

Булач. Робім дзьве пятлі, адну для цябе, а другую для твайго Ціхана. Перакідаем на асінавы сук. А асіну знаеш?

Саладухін. Ды так...

Булач. Ну, вось. Скажы мне цяпер, каторы з вас каторага пераважыць.

Саладухін. З-затрудняюся сказаць.

Яшка. Хе-хе, пан Булач любіць пажартаваць.

Булач. Ну, ладна, выкатвайся.

Яшка. Так. Да пабачэньня, пане.

Саладухін. Будзьце ўважаемы.

Яшка. Залаты чалавек.

Булач. Падрыхтуйце што-небудзь шаўковае. Ну і кілёграмаў дзесяць какаіну.

Яшка. Эх-хе-хе, шкада, што зрабілі вузкую нэйтральную зону Каб шырэйшая, дык гэта-ж такая была-б сымпатычная дзяржава.

Саладухін. (*Спыняе яго*). Пачакай, я ўспомніў. (*Падыходзіць да Булача*). Прашу вас, калі дазволіце вашага дазволу, прывезьці вам падаруначак-гадзіньнічак Паўла Бурэ на 12 каменьчыках.

Булач. На дванацацці?

Пербала. Ёсьць на 24-х.

Булач. Прывязі на 24-х.

Саладухін З-затрудняюся, але пастараюся. Будзьце ўважаемы З прыятнасьцю канешне і ўсё такое. (*Пашлі*). (*Са сьмехам ідуць балачоўцы. У Гніды скрываўлены твар*).

Адзін. Эй ты, на чым трымаецца твая галава?

Другі. На аднэй жылцы, ха-ха-ха!

Трэці. Як тыгра, грызла яна яго. Во, папаўся наш Гніда.

Булач. Чаго вы, што здарылася?

Адзін. (*Паказвае на Гніду*). Во, глядзеце, недагрызак стаіць.

Булач. Што гэта з табою?

Гніда Пагрызла мяне, сволач, і чуць не выкалупіла вока. (*Усе сьмяюцца*). Застрэліць яе трэба, дазвольце мне, я распару яе. (*Ідрышоў Пербала*).

Пербала. Камісарша ледзьве дыхае.

Булач. А каецца ці не? Просіцца?

Пербала. Не, ды што з таго? Прыстрэліць бы яе, як і тых, ды і ўсё. Няхай ўжо не пакутуе.

Гніда. Дазвольце мне, я, я хачу страляць, я закалю...

Булачоўцы. Ого, расхрабрыўся, ха-ха-ха, бясшыйны, ха-ха-ха!

Булач. Чакайце, вось ён. (*Паказвае на Алёшу*). Ён хацеў прыстрэліць яе. Бяры абрэз і прыконч.

Алёша. Я не магу.

Булач. Што?

Алёша. Цяпер я не магу.

Булач. А тады?

Алёша. Тады я мог, а цяпер ёсьць такія, якія прагнуць гэтага, дайце ім. Гляньце, як гараць іх вочы.

Булач. У іх гараць, а ў цябе астылі?

Гніда. Дазвольце мне, я пастрадаў...

Булач. (*Да Алёшы*). Ты чым пакрыўджаны?

Алёша. Я? Нічым.

Булач. Ну, дык і не раскісай, а будзь такім, як і ўсе. Плюй на ўсё. Жыві, гуляй. Правільна, братва?

Усе. Правільна. (*Падыходзяць яшчэ булачоўцы*).

Усе. Правільна.

Булач. Няхай жыве наша вольная ідэя!

Усе. Ура! Ура!

Булач. Стой. Колькі раз казаў не уракаць гэтае расійскае ура.

Усе. Віват! Віват!

Булач. Правільна. Давай сюды пазнанкі, са мною вып'ем!

Пербала. Колькі загадаеце?

Булач. Бутэлек шэсць.

Пербала. Давай сюды дзесяць!

Адзін. А што-ж рабіць з камісаршаю?

Другі. Яна чуць дыхае.

Булач. Чуць дыхае? (*Панурыўшы галаву*). Выкапайце яму, пастаўце яе ў яму і прысыпце да галавы.

Гніда. Перш закалоць, яй-богу прачыстая маці!

Булач. Даволі. Сказана. Ну, налівай ў свае конаўкі (*наліваюць*) і вып'ем за нашу такую, як бы сказаць, грандыёзную жысьць. Рэволюцыя разьвязала нам жысьць, а бальшавікі завязваюць, а я ім кажу, пасьвішчаце, пакуль зловіце. Братва, сапраўдная слабода дзе? У нас.

Усе. У нас.

Булач. Што хочам, тое і робім.

Усе. Правільна. (*Выпіваюць*).

Сьпірыдок (*Падыходзіць з рыдлёўкай да Пербалы*). Дык як сказалі? Закапаць яе па галаву?

Пербала. Па галаву, па шыю ўкапай. А потым я прыду. (*Сьпірыдок пашоў*).

Булач. Дык вось такая наша жысьць: каб ня дымець, каб не сьмярдзець, як той, што быў у нас Ракіта і інш., а гарэць вялізарным, зыркім, пякучым агнём. Вып'ем за пякучы агонь!

Адзін. Пячэцца, ліха ей.

Булач. Ды гаркнем наш гармонік.

Усе. Гармонік, гармонік! (*Два ці тры гармонікі даюць акорд. Булач садзіцца. Адзін пад акомпанімэнт гармонікаў запявае*).

Маці мне піша—
У сьлёзах паміраю.
А я тут на гармоніку
Гармоніку іграю.

Прыпеў з бубнам:

Гармонік, гармонік
Гармонік мой грае. } два разы

Су-у-у-пакойся,
Сьлёзы ня ў модзе.
Твой сын ў зялёных па лясох
Гуляе на слабодзе.

Прыпеў:

Слабода, слабодушка
Гармонік мой іграе. } два разы

Булач. Эх, і малайцы-ж вы, хлопцы!

Усе. Віват!

Булач. За ўдалую сёньняшнюю ноч!

Усе. Віват!

Булач. Напішу ў Парыж вялікі рапарт. Я чакаю, што хутка павінен зьявіцца наш найлепшы прыяцель, і вось, ён расьпішацца на маім рапарце: Га-лін-скі. Давай гармонік. (*Сьпяваюць далей*).

Я-а-а прыду,
З зялёнага лясу
Гадзіньнічкі. пярсьцёначкі,
Гасьцінец прынясу.

Адзін булачовец (*Крыкнуў*). Комісар Галінскі ідзе!

Булач (*Схапіўся*). Ідзе? (*Зьяўляецца Галінскі*).

Галінскі. Я тут.

Булач. Ты тут. А мы чакаем. Ах! (*Абняў яго і цалуе. Пербала падносіць кубак гарэлкі*). Эх, дружок, бяры кубак (*Да ўсіх*). Вы бачыце хто ў нас?

Усе. Віват!

Галінскі. (*Падняў руку*). Чакайце. Дайце мне глянуць на вас (*Абводзіць вачыма ўсіх*). П'ю. За ўсіх вас і за вашага атамана.

Усе. Віват.

Булач. Давай гармонік. (*Пачынаюць з прыпеву*).

Гармонік, гармонік
Гармонік мой іграе, } два разы

Я-а-а прыду,
З зялёнага лясу
Гадзіньнічкі, пярсьцёначкі.
Гасьцінец прынясу.

Прыпеў:

Гадзіньнічкі, пярсьцёначкі
Гармонік мой іграе } два разы

Булач. Здорава?

Галінскі. Малайцы. (*У гэты час пачуўся стоін Міры*). Ціха, што там?

Пербала. Там канчаецца камісарша, хе-хе...

Галінскі. Міра?

Пербала. Яна. Прысыпалі ў яму, сама канчаецца.

Булач. Давай песьню! (*Галінскі крыху зжахнуўся. Пербала наліў яму яшчэ кубак. У часе прыпеву ён павольна падносіць яго да губі, углядаючыся ў адну кропку перад сабою, пачынае піць*).

Як-жа вальготна
У зялёным лесе,
А толькі сэрцу не стае
Маёй мілой Алесі

Галінскі (*Выгукнуў*). Аксені!

Прыпеў:

Аксеня, Аксеня
Гармонік мой іграе. } два разы

Заслона.

Сяргэй Дарожны

На ўдарных франтох

Старонкамі новых
Напісаных кніг,
Пра дні
На руінах старога,
Цябе я адзначу
У вершах маіх,
Мая баявая эпоха!

Цябе апавітую
У копатны дым,
Цябе—будаўнічую нашу,
Я сэрцам сагрэю,
Аддам на уздым
Акордаў ударнага
Маршу!

Нам трэба змагацца,
Змагацца, як сьлед,
У клясавых бойках на фронце—
За вугаль,
За нафту,
За сьвежы хлеб,
За кожны гэктар на балоце!
Ты чуеш, як вецер
На струнах антэн...
(Глухое гучаньне такое...)
У ім тысячай тэмм
Разьвінаецца тэмбр
Кожнага
Семірадкоўя!

Гудуць правады,
Гудуць правады,
Сурова гамоняць турбіны:
— Мы са сьцюдзёнай
Дняпроўскай вады
Сонца дамо краіне!

Мы ўсе свае сілы
Зьліем у адну
Магуту заводаў і фабрык,

Мы грукатам працы
Сустрэнем вясну,
Здабытую ў бойках
Ударных!

Гудуць правады,
Гудуць правады,
Распалены хмурыя домны:
— Мы выплавім тысячы тон
Руды,
Патрэбных на
Перабудову!

І чуецца грукат
Ударных рот:
...„Самі праложым дарогу".
— Гэй, прыналяжам,
На поўны ход,—
...„Дружна, таварышы, ў ногу!"
І...
Там, дзе калісьці
Адны балаты,
Вада ды гушчар непрабудны—
Магутным оркестрам
Гудуць правады,
Гудуць правады Асінбуду.

За імі
Далёка хвалюецца Сож,
Шумуюць нясупынныя воды,
І высіцца Гомель
Каменны уздоўж,
Асілкамі дымных заводаў.

Працуе краіна,
Гудуць правады,
На фронце ударным
Атакі—
Бабруйшчына б'ецца
За творчы уздым,
Барысаў—за добрую
Якасьць!

Ля кожнай машыны
Нябачаны спрыт,
У кожнага пэўны свой
Клопат:

Мазыршчына ломіць шэры граніт,
Бабруйшчына сушыць балоты!

Адзіная мэта,
Адзіны дэвіз—
Змагацца, змагацца, змагацца,
Каб з кожным ударам
Бліжэй камунізм,
Народжаны ў бойках
І працы!

Чуеш,
Ніводнага кроку ў хвасьце,
Мускул і сэрца—
На варту!
У домнах, рэтортах,
Капальнях расьце
Наша сапраўдная вартасьць!

Менск. 25 X—30 г.

Крапіва

Хвядос—чырвоны нос

Працяг [1])

Вось плыве Хвядос, плыве,
А куды—не ў галаве:
Ў сузіраньні патануў
Сьвежай рані, лятуноў.
Вось узьняўся рой лятучы.
Неўзабаве хтось гукае.
Не пазнаць, што голас штучны—
Прыгажосьць у ім такая.
Пра Хвядоса тут гаворка,
Ён і сам мог дагадацца:
Да яго народ навокал
Стаў уважна прыглядацца.
Федзя пільна гукі ловіць,
Праклінае вынік горкі:
Ня чуваць ні ў водным слове
Гукаў матчынай гаворкі.
А па радыё тым часам
На кароткай моўнай хвалі
Навіну сусьветным масам
Пра яго перадавалі:
„ ... Мэдыцыны дасягненьні!
Зноў над сьмерцю перамога!
Шчыра мы вітаем гені
І нябожчыка жывога!
Сёньня ў Менску, а дзевятай,
Быў Хвядос засьпіртаваны
Няўміручым Набгаратай,
Для жыцьця адратаваны.
І цяпер жывы пакойнік
Вышаў нават на прагулку,—
Праяжджае ён спакойна
Па Сатурнаўскім завулку.
Грамадзяне шчасьце мелі
На Хвядоса любавацца
На дванаццатай панэлі,

---

[1]) Гл. „Узвышша“ №№ 6, 7 за 1930 г.

На дзялянцы трыста дваццаць...
. . . . . .
Праз хвіліны дзьве ці тры
Чуе Федзя, сам ня свой,
Крыльляў шум над галовой:
„Хай ты, думае, згары,—
Тут яшчэ які птах-дзядзя
Проста мне на карак сядзе
Ці, як некалі гракі,
Нумар выкіне такі".
Толькі-толькі ён нагнуўся,
Белы птах ўвачу мігнуўся,
І спусьціўся твар у твар
Побач з ім на тротуар
Ды з усьмешкаю вясёлай
Вабіць чорнымі вачамі.
Забабонныя анёлы
Побач з ёй былі-б сычамі—
Выглядала гэтак міла
Ў беласьнежным штучным пер'і.
Ды вось крыльлі адшпіліла
Непатрэбныя цяпер ёй
І пусьціла праз хвіліну
Апарацік фоно-кіно,
Каб Хвядоса рухі й гукі
Занатоўваць для навукі.
Над Хвядосам тэй парой
Птахаў гэткіх цэлы рой.
Той на дол на момант стане,
Той узьнімецца ў паветра,
Да Хвядоса з прывітаньнем
Падлятаюць на паўмэтра,—
Белай, шумнай чарадою
Так кружыцца маюць звычай
Часта чайкі над вадою
Над прынаднаю здабычай.
А Хвядосу недзе дзецца
Перад тым крылатым зборам,
Каб прымеў, то зьбег бы, здэцца,—
Няпрыемна нек і сорам,
Калі круцяцца над каркам.
Вось ён зьлез і крочыць паркам
Па дарожцы між прысад,
Не ўглядаецца назад,
Шпарка шпарыць, хоць ня снедаў,

А за ім дзяўчына сьледам
Вось між шолаху вяршын
Чуцен роўны шум машын.
За прысадамі—будынак.
На пляцы перад фронтонам
Разьляглося з сотня сьвінак—
Што ні дзёдзя, дык і тона.
Быццам пешчаныя дамы
У Сухуме альбо ў Сочы,
Паўкладаліся‘ радамі —
Загарэць на сонцы хочуць.
Бачыць гэтакіх сьвіней
Не здаралася раней
Федзю нашаму ніколі,
Як ён пасьвіў іх у полі.
Той вунь містэр-іоркшыр,
Ці яго мадам-сьвіньня,
Як удоўж, дык так і ўшыр—
Проста з добрага каня.
Зацікаўлен дужа Федзя,
Да відовішча ён ласы,
Каб папесьціць ды разгледзець,
Пералез цераз балясы.
З ласкай цёплай ён да дзёдкі,
Як да роднай, здэцца, цёткі:
— Не зважайце, што сьвіньня,
Вы-ж мне нават мо‘ й радня:
Я-ж калісьці з вашым продкам
(Белы быў з лычом кароткім).
Малады як быў і дужы,
У аднэй купаўся лужы.
Бруднай шмат было вады,
Ды я п‘яны быў тагды,
А цяпер вось і цьвярозы
(На вачох Хвядоса сьлёзы)
Вельмі рад, што вас сустрэў я...“
Стаў ёй чухаць падчарэўе,
А яна—„бяз задніх ног“—
Так пяшчотна: рох ды рох.
Не заўважыў нават Федзя
Праз сьвіную гэту ласку,
Што з „раднёю“ разам едзе
Сьвінабойні проста ў пастку.
Вось сталёвая рука
Згрэбла спрытна вяпрука,

Аглушыла кухталём,—
Скура коціцца кулём.
Разьвітальны віск пачуўся—
Аж тагды Хвядос прачнуўся,
Завішчаў ад жаху так,
Як у плоце падсьвінак;
Перапуджаны бяз меры
Шмаргануў якіясь дзьверы,
Там стуліўся у куток...
Як асвойтаўся чуток,
Аж пад ложачках зассала:
Што вянгліны, здору, сала!..
Паляндвіцы, кумпякі...
Смачны дух ад іх такі.
Самі робяцца кілбасы,
Самі валяцца на пасы,
Самі едуць да варот,
Чуць ня лезуць самі ў рот.
І кіруюць рухам цэлым
Чалавек мо з пяць у белым,
На пляцоўках угары
Націскаюць вагары.
У варотах зьмена плыні,
З якой зноў—не надзівіцца:
Самі лезуць тут у скрыні
І кілбасы й паляндвіцы,
Хітрым шэрагам прылад
Самі рухаюцца ў склад,
Так імчаць, аж вецер дзьме.
Ды Хвядосу ненаўме
Ні конвэйеры, ні вышкі,
Калі граюць марша кішкі—
Чалавек сто год ня сьнедаў.
Смачнай ежы шмат навокал
Так прывабна песьціць вока,
Пажывіцца-ж як—ня ведаў.
„Каб было куды пакласьці,“—
Сам сабе падумаў Федзя,—
„То ня грэх было-б і ўкрасьці,
Ды схаваць, хоць трэсьні, недзе“.
Сам пры гэтым аглянуўся,
Над конвэйерам нагнуўся
Ды цішком паўкілбасы
Залажыў сабе ў трусы
І, як высьлізнуў за дзьверы,

Свайму шчасьцю сам ня верыў.
А дзяўчына там была,
Цікавала ўсё з-за сала,
Апаратам зазьняла
І ў блёкноцік запісала.
Задзівіла яе троху,
Што ў мінулую эпоху
Мелі звычай людзі ежу
Запіхаць сабе ў адзежу,
Што для гэтага яны
Скарыстоўвалі штаны.
. . . . . .
Федзя мерыўся ўжо есьці—
Так нязручна ежу несьці;
Аглянуўся—вось яна:
Каля дрэў бачком, бачком.
„Ах ты, думае, шпана,
Надакучлівы сачком!
Яшчэ, думае, халера
Клікне міліцыонэра...“
І зьбянтэжаны Хвядос
Далей сьнеданьне панёс,
Хоць, ня еўшы, ногі млелі,
У трусох аж да панэлі.
Калі сеў там на канапцы,
Стала ежа выпінацца.
Гэтым часам людзі скоса
Паглядаюць на Хвядоса
Ды ня могуць раскумекаць—
Што за шарж на чалавека?
Вось да нашага „калекі“
Падышоў вучоны некі,
Антрополёг мо‘ ці доктар,
Зацікавіўся, паторкаў.
Вось за ім яшчэ другія
Падыходзяць да Хвядоса,
Штось насвойму ўсё гавораць
Ды ў пухліну пальцам поруць.
Тут паперы ўжо благія—
Небарак наш толькі носам
Бязупынна хліп ды хліп:
„Вось дзе, думае, я ўліп.
Што ‘та будзе?.. Што ‘та будзе?..
У турму яшчэ пасадзяць...
Моцна зганьбяць ды асудзяць,

Як грамадзкае пазадзьдзе.
Тут няма куды дзявацца—
Трэ‘ ў пакражы прызнавацца.
Што-ж—загіну, дык загіну...
Прабачэньня папрашу...“
І бяды свае прычыну
Выпхнуў ён праз калашу.
Разам з сьнеданьнем бяз слоў,
Хто з Хвядосам толькі ехаў,
Ад нястрыманага сьмеху
Пакаціліся далоў.
Быццам чэрці казыталі,
Да паўсьмерці рагаталі,
Аж да сьлёз, да хрыпаты,
Падарвалі жываты.
А ў Хвядоса дык ад жалю
Нават губы задрыжалі:
Сорам вельмі, горна ўдовойчы—
Аж сьлязой набеглі вочы.
Сьмяючыся, людзі бачаць—
Штось Хвядос пачаў тлумачыць
Ды паказвае на рот.
Дагадаліся нарэшце—
Гэта-ж ён так хоча есьці.
Супакоіўся народ,
За свой сьмех аж ім нялоўка,
Паказалі дзе сталоўка.

Да сталоўкі Федзя крочыць,
А сумненьні яго точаць,
А чарвяк яго грызе:
„Пастаіш яшчэ ў чарзе...
Прапаўзеш чаргу жывую,
Дай жа кніжку паявую...
Калі й здарыцца табе—
Чым заплаціш за абед?..
А ні грошай, а ні кніжкі,
А ўсё граюць марша кішкі...
Хіба мо‘, каб пастараўся,
Накармілі-б напавер...
. . . . . .

Неаглядная тэраса,
А над ёй яшчэ паверх.
Навакол тае тэрасы

Карунковыя балясы.
Каляровыя кілімы
Разаслаліся за імі,
Іх убор у поўным цьвеце,
Іх узор мітусіць вецер.
На тэрасе ў гэтай раме
Крэслы доўгімі шарамі.
Апроч іх... але што гэта?
Ні народу таго валу,
А ні касы, ні буфэта,
Ні сталоў, ні пэрсоналу.
Ціха, чыста ўсё прыбрана—
Знаць, абедаць яшчэ рана.
Вось Хвядос на крэсла сеў
Разглядацца па крысе.
Як прывыкла вока трошкі,
Бачыць ён—ля крэслаў дошкі.
На тых дошках кнопкі, кнопкі,
А пад імі літар кропкі.
Што на дошках так прыгожа
Пазалотай цісьнена,
Разабраць Хвядос ня можа—
Ня пры ім напісана.
Ён сядзіць і думку песьціць—
Як усё-ж бы тут пад'есьці?
А пакуль ён марыў гэтак
З прыкрай млявасьцю у целе,
Штук пятнаццаць авіэтак
Да сталоўкі падляцелі.
З іх юнацкі сьмех пачуўся,
Галасоў вясёлых гама.
Рад Хвядос наш: „Павучуся,
Пагляджу, як будуць шамаць.
Сам сабою тут, хоць трэсьні,
Не дастанеш нават крошкі".
Увайшлі, занялі крэслы,
Нахіляюцца да дошкі.
І за столікам тут столік
Апускацца сталі з столі.
На сталох на гэтых страва
Дражніць нос прынадным пахам.
„Ах, дык вось у чым тут справа!
Ну, цяпер мы—адным махам.
Ежа валіцца, як з неба,
А я ўсё сяджу ды кісну.

Нават грошай тут ня трэба—
Зараз кнопку вось націсну.
Ды якую-ж толькі выбраць,
Каб таран ня трапіў часам?
Добра будзе, калі з рыбай...
Яшчэ лепей, калі з мясам...
Хоць ня ганьба й тарану...
Вось я гэту таркану!“
Цісьне Федзя кнопку пальцам:
„Ох, каб, здэцца, гуска з шмальцам“.
Зараз (на табе) і стол
Ля Хвядоса стаў на дол,
І пасуда на стале,
Толькі... ежы не стае,
А ў пасудзіне відно,
Мусіць, нейкае віно:
Такі колер ружаваты,
Такі кубак дужаваты,
Можа, нават з паўзбана—
Не шкадуюць тут віна.
Як паднёс Хвядос да губак,
Плюнуў зноў назад у кубак,—
Ну які-ж бо дурань стане
Піць ваду для паласканьня,
Хоць пахучая такая?..
Зноў ён кнопку націскае:
Гэта нейкая ўжо страва—
Ня-то мяса, ня-то рыба.
„Ну, а з чаркай як жа справа?
Падражнілі толькі хіба?
Ператоркаю ўсе кнопкі,
А ня выйду я бяз стойкі
Там якой бы гаркаты хоць“.
І пачаў ён кнопкі тыкаць
Пальцам, локцем, кулаком.
Стала ежа тут валіцца,
Сталі стравы тут хваліцца
Маслам, мёдам, малаком.
Але вось на сёмай кнопцы
Прыкрасьць зноў чакала хлопца:
Раптам зьверху дзьве рукі—
Мэталёвыя крукі
Стол схапілі ды панесьлі,
А Хвядос ні з чым на крэсьле.
— Эх, дарэмна ежай грэбаў,

Толькі сам сябе караю—
Ежы гэтакай навала.
А цяпер спачатку трэба.
Вось пачну з другога краю...“
Тут яму пашанцавала:
Тройчы кнопку як парнуў,
Дык і стол назад вярнуў—
Кубак пеннага віна,
Птушка, мёд, садавіна.
Ля пітва і каля ежы
Ўзяўся Федзя, як належыць,
Не прасілі яго ласкі—
Еў і піў, аж чуб намок.
А пасьля такой папаскі
Любата—пусьціць дымок;
(Каб сюды старыя порткі,
Там было чуток махоркі...)
. . . . . .
Ногі йсьці ня маюць сілы,
Галава—ў бакі на карку:
— Эй... Таварыш... Слухай мілы...
Будзь хлапцом... дазволь цыгарку...
Што? Шкадуеш?.. Эх ты сссукін...
Не даеш... мы самі... купім...
Дзе ўзялася зноў дзяўчына:
—Вось хачу я запытацца,
Што, скажы мне, за прычына?—
Раптам ты пачаў хістацца,
Глупства ўсякае гаворыш,
А, здаецца, і ня хворы-ж?
— А... бабец... загаварыла...
Як цябе?.. Макрына?.. Клава?..
Выпіў я... сьвіное рыла...
І бужу... І маю права...
— Ты віна піў, праўда, ў волю,
Ды віно-ж без алкоголю...
— Быць ня можа... Цётка, маніш...
Але ўрэшце... сапраўды!
Хмелю, здэцца,— а ні званьня-ж,
Галава ў бакі ня водзіць,
Вось і ногі роўна ходзяць—
П'яны, значыць, ад вады?!
Выбачайце за абразу,
Ня было-ж мне так ні разу.
Гэта, значыць, па прывычцы,

Так сказаць—рэфлекс умоўны:
Я-ж кульнуў тры кубкі поўных—
Як тут, думаю, ня ўпіцца?
— Я ня крыўджуся, дарма,—
У адказ яму дзяўчына,—
Бо цікаўлюся й сама
Кожным гэтакім учынкам.
Выўчыць маю, бач, на мэце
П'яніц прошлага сталецьця,
Іх паводзіны і густы.
Пра людзей такога складу
Кніжак я чытала многа,
А цяпер вось вельмі рада
Бачыць п'яніцу жывога,
І тым больш, што беларус ты.
Беларуска й я таксама
І завуць мяне - Мальгрэта.
Прадзед мой, казала мама,
Часта нюхаў зельле гэта,
Хоць ня так, як ты, вядома.
Ну дык вось і будзь, як дома,
Не саромейся ні крышкі,
Толькі выбач на кілішкі,
Бо нідзе ня знойдзеш тут ты
Сабе гэтакай атруты.
На цыгаркі, каб прышлося,
Зноў жа прыдзецца прабачыць.
А цяпер скажы, Хвядосе,
Што-б ты ў нас хацеў пабачыць?
— Столькі знойдзецца жаданьняў,
Што й здаволіць не бяруся.
Добра-б глянуць, як сяляне
Ў нас жывуць на Беларусі;
Пабываць і каля нас там,
Каля роднай, значыць, вёскі—
Ці ліпіць яшчэ колгас там,
Ці распаўся на палоскі;
Мо' стаіць яшчэ там хата
Ці мая, ці хоць бы й жонкі;
Можа праўнук майго свата
Ці ня цісьне самагонкі;
Ці ўрадзіла ў яго збожжа,
Ці мо' голыя засекі;
Ці ня дасьць ён трохі, можа,
На цыгаркі самасейкі.

Завітаць хацеў бы ў госьці
І да вашых пролетараў—
Я-ж таксама ў маладосьці
Пра комуну часта марыў.
Комунізму вось ці многа,
Ці ўсё ёсьць яшчэ ваганьні;
Ці ня трэба дапамога
Ім у клясавым змаганьні,—
Дык і я магу пад кіпець
Там якога Чэмбэрлэна.
Перад гэтым толькі выпіць
Дзеля сьмеласьці нядрэнна.
Гэта, скажуць мо', драбніца,
Ды ня піўшы як жа біцца?
— Так, нішто з цябе ваяка—
Выдраць лысаму валосьсе,
Ды, шкада, вайны ніякай
Для цябе не засталося.
Паміж кім яна й магла быць,
Ты вось толькі раскумекай.
Сам спазьніўся троху, мабыць,
Нават больш, як на паўвека,
І калі-б працёр ты вочы,
Дык пабачыў бы, што ў нас
Ні буржуяў, ні рабочых,
Ні дзяржаў няма, ні кляс,
А ні розьніцы старое
Паміж горадам і вёскай;
Зьніклі бойкі, зьнікла зброя,
І міліцыя, і войска—
Іх ня стрэнеш болей зноў ты:
І дрэдноўты й звышдрэдноўты,
Кулямёты і гарматы,
Агнямёты і гранаты,
Штык, наган і стрэльба з шашкай,
Горы рознай броні цяжкай—
Тон мільярды гэтай сталі
Для машын мы скарысталі
— Пачакайце... Стойце... Годзе...
Нешта цямлю я пагана...
Ну, а як-жа Бэндэ ходзіць?
І няўжо ён без нагана?
Зноў жа й жонку чым угробіць,
Калі з ёю жыць дадзела?
І што ў вас Калента робіць

Без вайсковага аддзелу?
Як тут маецца лёрд-Вілка?...
Выбачайце, зноў памылка.
Так і пруся—фу-ты ну-ты!—
За лёрд-Вілкай па дарозе,
І ня пройдзе ні мінуты,
Каб я глупства не змарозіў.
Факт забыўся нават просты—
І няўцям нек яно мне,
Што пашоў сто дваццаць шосты,
Што сябры даўно ў труне.

. . . . . .

Ну, бяз войска мо‘ й ня дрэнна
(Я пра нашу зноў гаворку),
А міліцыю—дарэмна,
Без яе не выпадае:
А як брудна ў панадворку,
Хто вас штрафам абкладае?
Каго клікнуць, як дзе ў садзе
Вам у лбе праломяць дзірку?..
Яно й так другога дзядзю
Часам варта ўзяць за шкірку.
— Наварочаў страхаў груды,
Толькі страхі ўсё старыя:
Выратоўвае ад бруду
Нас усіх санітарыя.
Тут здароўе—мера й вера.
У грамадзтве нашым новым
І без міліцыянэра
Кожны згодзен быць здоровым.
Бачыў ты хоць дзе няўклюду
За ўвесь час тут? Ну дык во як:
Ні аматараў да бруду,
Ні ахвотнікаў да боек—
Сьпяць даўно ў зямлі сырой
Людзі з псыхікай старой.
Звычак тых маглі-б трымацца
Толькі выradкі ў народзе,
Ды здаровае грамадзтва
Гэтых выradкаў ня родзіць.
Пра жанок твае заўвагі...
З імі зноў зусім слабы ты:
Жонка, муж, нявестка, швагір—
Словы гэтыя забыты.

Не паверыш мо‘ адразу—
Ні сям‘і няма, ні сваркі,
А ні іх даўнейшай базы—
Шэрай хатняй гаспадаркі.
І „угробіць“ рэч старая.
Больш ніколі й не кажы так:
Гэта ўражаньне стварае,
Як агідны перажытак
Тых часоў яшчэ агідных,
Калі жонку муж валтузіў,
Калі грызьліся па тыдню
За няўшыты ў пору гузік;
Ненавідзелі да скону
І жылі да сьмерці разам,
Моцна быў так „шлюб законны“
Лахманом супольным зьвязан.
Ну, а мы жывём сягоньня
Маладым жыцьцём супольным
Толькі ў шлюбным „беззаконьні“,
Аб адным каханьні вольным.
Над жанчынаю дашчэнту
Рэшткі ўсе апекі сьцёрты.
— Хто ж вам плаціць алімэнты?
Ці ўсё робіце аборты?
— Ад тваіх, Хвядос, пытаньняў
Стогадовай вее цьвільлю,
Быццам шлюць мне прывітаньне
Твае жонкі з-за магільля,
Што калісьці моцна гэтак
Да сябе ты іх прыгортаў,
Што плаціў ты ім на дзетак,
Што памерлі ад абортаў.
Ня ў прыклад жанком калішнім
Мы ня ходзім тут, як шчэпкі,
Нас цяпер ад дзетак лішніх
Выратоўваюць прышчэпкі.
А калі захочам мець іх,
Ня стыкаемся з бядою:
Паасобку родзім дзеці,
А гадуем грамадою.
Вось у вас рабіў народ
Дык якраз наадварот.
Але досыць, сам пабачыш,
Бо ўсяго не растлумачыш.
Ты-б хацеў у падарожжа—

Мы нядаўна гаварылі...
З пасажырскім гэта можна,
Ды зручней на аўтокрыльлі:
Што захочаш, тут паглядзіш,
Дзе захочаш, там і сядзеш,
Зноў узьнімешся ў гару там,
І ня прыдзецца лічыцца
З установленым маршрутам,
Толькі трэ' лятаць наўчыцца.
Зараз зоймемся мы гэтым,
Можа й пойдзе ў нас на лад,
А цяплей каб быць адзетым,
Накіруемся на склад.

Магазын—Меншвеяў дваццаць,
Прадаўцоў зусім няма там:
Хто прыходзіць адзявацца,
Мае справу з аўтоматам.
На пляцок абы хто стаў,
Аўтомат абніме стан,
Без капрысаў, без скандалаў
Зьніме мерку дасканала—
Як прыяцеля сустрэне
І пакажа нумарок,
Што ў вітрыне на дзьвярох,
Дзе вісіць тваё адзеньне—
Там фасонаў розных шмат.
Цяжка йсьці, дык—калі ласка!—
Завязе цябе каляска,
Гэтак сама аўтомат.
З магазыну што забрата,
Усё падлічыць рэгістратар.
Ён, вядома не „колежский",
Ён бяз гузікаў, бяз цэшкі,—
Яму чына не стае,
І мундзіра ён ня носіць,
Ён і хабару ня просіць.
Падхалімнічаць ня можа
І паперы ня псуе.
Не савецкі ён ізноў жа,
Да прагулаў няпрывычны—
Апарат ён электрычны.

. . . . . .

Калі наш Хвядос зьявіўся,
Аўтомат аж задзівіўся,
Ды спыніўся ў задуменьні:
Стан то стан, але пытаньне,
Што да стану тут прыстане?
Дзе-ж узяць яму адзеньне?
Колькі ён людзей ні мераў,
Ня было такіх разьмераў.
Падабраць тут цяжкавата.
З дапамогаю Мальгрэты
Быў Хвядос усё-ж адзеты,
Праўда, трохі мешкавата,
Ды няма што выдумляць —
Прачакаўся лётны пляц.

Неўзабаве Федзя ўбачыў
Вялізарны пляц дзіцячы.
Апараты-авіэткі,
Аўтокрыльлі на пляцы.
Паміж іх сям-там модэлі
Нярухомыя сядзелі.
Ля машын натоўпам дзеткі,
І дзяўчаткі і хлапцы.
За чародкаю чародкі,
Быццам восеньню шпакі,—
І ня сьнілі іхі продкі
Цацак-забавак такіх.
Тыя ў конікі гулялі,
Асядлаўшы верхам палку,
Сьмела гэтыя з рулямі
У надхмар'е мкнуцца змалку.
Вось вучобаю заняты
Юных птахаў эскадрыльлі—
Быццам тыя птушаняты
Распраўляюць свае крыльлі.
На той бок узорных кратаў
(Смуглай бронзы з серабром)
Сотні лётных апаратаў
Прытуліў аэродром
Рознастайнасьцю багатых:
Пасажырскія гіганты,
Цяжкавозы грузавыя,
Даўгалёты прызавыя,

Быстралётныя спортсмэнкі...
Выпінаў бы доўга зенкі
Наш Хвядос на ўсё на гэта,
Каб ня клікнула Мальгрэта.
Тут гэрою прывітаньне
З першай спробаю лятаньня.

. . . . . .

Падабралі—прышпілілі
Да Хвядоса аўтокрыльлі
І яшчэ на кожны бок
Адмысловы паплавок,
Каб лягчэйшым было цела.
Каб ня падала, ляцела.
Вось моторык завялі.
Тыя крыльлі мах за махам
Ды зрабілі Федзю птахам—
Аддзяліўся ад зямлі,
Ногі служаць за рулі.
Пад апекаю Мальгрэты
Залунаў ён у паветры
Так, як бусел той, але—
Што вышэй, то ўсё бялей.
Ня было так з ім ніколі—
Нават нос зьмяніў свой колер
Праз дзесятак некі мэтраў
Стаў прасіцца птах з паветра,
Зчырванеў пры гэтым густа—
Паабедаў, мабыць, тлуста.

. . . . . .

Толькі ўсьпеў Хвядось прыбегчы,
Хочуць зноў яго запрэгчы.
Ён і сам ужо ня рад,
Але каб ня здацца трусам,
Быць адважным беларусам,
Храбра лезе ў апарат.
Зноў моторык задрыжаў,
Зноў паўзе па целе жах,
Зубы ляскаюць, і птаху
Дрэнна стала зноў ад страху.
Здагадалася Мальгрэта,
У вачох усьмешкі іскры,

— Не да густу табе гэта?
Ну, тагды на пасажырскім.
Ты лятаць—сьмяльчак адпеты,
Ды шкада, што сьмеласьць тая,
Яшчэ ўзьняцца не пасьпеў ты,
А яна ўжо й вылятае.

Ну, нічога, мы нагонім,
Паляцім яшчэ сягоньня.

(*Далей будзе*)

Юлі Таўбін

...На ўвесь свой дужы рост..

Вуграсты гарадок
на вузенькай рацэ
стаіць, як парадокс,
ці проста, карацей,—
агледзеўшы яго
выпадкам ці знарок,
даешся дзіву, што
і тут жыве народ.

А ў гарадку—вясна...
Бульвар—бівак бяроз.
Там паўстае яна
на ўвесь свой дужы рост.
І гурбамі шпакоў,
і змовамі дзяцей
разбураны спакой
зімовых сонных дзей.
Іскроў ня кроў,—а вар
на станцыі ў прыпар;
і вочы—два на два,
і сьпёка плавіць твар.
Пакуты дым—баляст.
Ёсьць—сонца мутны бляск,
І вучні сёмых кляс
выходзяць пагуляць
пад сьценьню ціхіх ліп...
Тут расказаць маглі-б
пра краявід сяліб,
вясновы зык і ўсхліп;
пра выгляд хісткіх хат,
пра сьціплы маладняк;
пра першае „каха...“,—
Ня здадзены залік,
Пра плёткі з-пад балей,
Пра даль... і так далей!...
— Але даўно да нас
вялі падобны сказ,—
як Пушкіну Данзас
сьмерць у руках працяг,
як Байранаў баркас

са зграяю бадзяг
ля грэцкіх гор прамчаў...
... Час тарчы і мяча...
Твой сьпеў даўно пасьпеў.
І высьпець, і, насьпех,
апасьці, як насьпеў.
У дні вялікіх сьпек
ён страціў сьвежы пах
і трунамі прапах.
Ў хадзе штодзённых дзей
прыпала нам прасьцей
глядзець на ўсё вакол...
... Тут скончыў я абзац
і выглянуў з вакон
пад рэзкі крык гракоў,
што аздаблялі пляц.
Дыхнуўшы, вецер зьнік...
Адказны працаўнік
Сьпяшаўся на раён,
і намагаўся ён
як-небудзь падагнаць
упартага каня;
і вучняў шэсьць ці пяць
прайшло—падзеі дня.
Ўзялі сабе яны
за тэму для размоў
ды спрэчак,
і вясны
з-за парасьляў-ляскоў
пачуў я сьпеў—і змоўк...
Ў суседні колектыў
прывезьлі трактары—
быў мітынг. І мотыў,
тым любы, што стары
і вечна новы ўсё-ж,
даносіўся з ляска...
— „Паў-стань, пракляцьцем ка...
... і барабанаў дрож...
Ўздымалася рака,
Як на радзіме Сож...
і рвалася труба—
„ні бог, ні цар, ні ба...“
і тэнор пачынаў
„Інтэрнацыянал“.

Максім Лужанін

Думкі пра поэзію Валерыя Маракова,

пра „Вяршыні жаданьняў“ і „Счастливый домик“ ды наогул пра музыку, які ня чуе свае музыкі

Вясною, перад сьвітаньнем, на хваёвых галінах,—вялікія чорныя птушкі—пяюць глушцы.

„Затакаваўся, як глушэц“.

Гэта прыказка.

Вясною на кожным плоціку, старанна напружыўшы тонкія нягеглыя шыйкі,—шэрыя, жоўтыя, белыя,—прабуюць голас чырвонаграбенчыкі-пявункі.

„Птушанята ўбіраюцца ў пер‘е“.

Гэта павінна зрабіцца прыказкаю.

І пад час глушцовага сьпеву б‘юць птушку паляўнічыя наўсторч.

І пад час нехлямяжага кукірэканьня можна ўзяць у рукі захопленага сьпевака.

Тады толькі ён адумаецца.

Яны ня чуюць.

Пяюць, але ня чуюць.

Найвялікшае няшчасьце Бэтговэна ў тым, што ён ня чуў сваіх апошніх рэчаў.

Бывае так, што жывы чалавек, захоплены сваёю маладосьцю і прыгожым злучэньнем гукаў, пяе, закінуўшы галаву, і нічога ня чуе.

З яго даволі песьні.

Добра, калі гукі гэтай песьні, радасьць маладосьці супадаюць з рухам прогрэсыўных чыньнікаў гісторыі.

Але часта-густа ўздымаецца з уяўнага хараства мэлёдыі чорная галава і сычыць:

— „Ты—мой сьпявак. Гэта мана, шчо я скончыла сваё жыцьцё. Глядзі, як у мяне спакойна і прыгожа. А ці-ж прыгожае гэта ня ёсьць найлепшае жыцьцё? Ты ня маеш права бачыць нічога, апрача прыгожага. Я не дазваляю табе прыслухоўвацца да таго, што вынікае з гэтага прыгаства“.

Поэт!

Мастак!

Творца!

Намажы ўсе свае сілы і стрэлам лучным і звонкім—удар!

І закінь чорны труп далёка ад таго месца, дзе будаваць мешновыя дамы.

Каб ня труціў цябе пах.

Пах соцыяльнага атачэньня, якому трэба згінуць.

Якое прабуе падмяніць грамадзкае жыццё проста прыгожым. Бо дрэнна таму музыку, які ня чуе свае музыкі.

— Валеры Маракоў!

Кожную ноч да раніцы, ці наадварот, пішу я вершы.

Упарта.

Мне цяжка іх пісаць.

Перамагаць сілу традыцый, сілу поэтычнага руху, узьнятага да мяне.

Выкідаць атрускі старых сьветапоглядаў.

Змагацца з формаю і матэр'ялам.

Змагацца за дыялектыку.

Змагацца за жывую песьню маладое клясы.

„Вынаходзіць Амэрыкі" на працагу месяцаў, каб пасьля падпаліць імі печ.

Раскідаць парванае ў шматкі, калі голас ня пэўніцца, калі ён зьбіваецца на паўтона.

Я супроць твайго слова „любоў".

Я таксама супроць твайго спакою, бо мне больш дарагі спакой, які патрэбен пасьля васьмігадзіннага працоўнага дня.

Але ты муляр багаты маладосьцю.

Глядзі, каб ня сорамна нам было азірацца ў зялёных будучыніных прасторах поэзіі.

Давай разам!

Трэба яшчэ паклікаць Уладзімера Хадыку

І

Поэт—гэта суб'ект, які пераламляе праз сьветаадчуваньне свае клясы,—гістарычныя тэндэнцыі эпох, ці другімі словамі:

характарныя для пэўных эпох вытворчыя дачыненьні,—клясавыя супярэчнасьці ды ўвесь рознастайны матэр'ял, варты апрацоўкі, на погляд яго, як мастака, погляд абумоўлены клясавымі дачыненьнямі.

Да гэтага прылучаецца пытаньне мастацкае апрацоўкі. Поэт, у залежнасьці ад свае здольнасьці. павінен зрабіць форму твору неадчувальнаю у тым сэнсе, што твор уплывае сумаю ўсіх сваіх якасьцяй. Творы, што становяць новую форму, маюць посьпех толькі пры органічнай адпаведнасьці яе са зьместам.

Сапраўды: вартасьць найвялікшых тэхнікаў поэтыцкае мовы наўрад ці зьмяшчаецца ў тым, што ўспрымальнік поруч з дасканаласьцю зьместу заўважае алітэрацыю, трапны оксюморон ды іншыя прыналежнасьці формальнай збруі. Наадварот, права на існаваньне тых ці іншых прыёмаў мастацкае творчасьці можа быць апраўдана толькі ў тым выпадку, калі іх нельга адлучыць ад зьместу, калі яны вымагаюцца матэр'ялам, канечна патрэбны для організавальнага ўзьдзеяньня.

Бо для мастацкага твору найбольш галоўнае сіла ягонага ўзьдзеяньня.

А гэтая сіла дасягаецца тады, калі думцы да твару тое адзеньне, у якое яна апранена.

Трапляюцца творы, з якіх выпраменьваецца сіла вышэйзгаданага ўзьдзеяньня ў нечаканых і незразумелых, хаотычных, на першы погляд, формах.

Але:

„Мы не павінны стаяць, злажыўшы рукі, і даваць хаосу разьвівацца, куды хочаш. Мы павінны зусім плянамерна кіраваць гэтым процэсам ды формаваць ягоныя вынікі". (У. І. Ленін да К. Цэткін)

З гэтым мы і пераходзім да разгляду кніжкі Валерыя Маракова „Вяршыні жаданьяў", з яе бурным юнацтвам, бунтоўнаю маладосьцю вясёлым сяброўствам.

II

Апрача лірыкі у зборніку зьмешчаны дзьве рэчы—„Адноўленая зямля" і „Таварыш Нюрын", памерам большыя за лірычныя вершы.

Аўтар не вызначае іхнага жанру, ды яны і не ўкладаюцца ў вядомую нам тэматычную аправу поэмы.

Цяжка вызначыць іх за ўдалую спробу перайсьці на эпос. Вартасьць іх хутчэй у тым, што яны наскрозь лірычны, фактычна зьяўляюцца працягам маракоўскае лірыкі ды павяваюць, передаюць маладосьць, нясталасьць юнака-поэты і імкненьне тварыць, гэтае імкненьне, характарнае для творчасьці Валерыя Маракова. Самае-ж галоўнае, што яны даюць ключ да ўразуменьня, разгляду ды выяўленьня клясавай накіраванасьці ўсяе поэтавай кніжкі.

Гэта больш датычыцца „Таварыша Нюрына", бо „Адноўленая зямля" ўсё-ж такі факт нізкапробны, да некаторай ступені факт не літаратурны. Гэта хутчэй матэр'ял для дасьледчыка.

Як і заўсёды, у „Адноўленай зямлі" Маракоў вышаў пагуляць, расказаць, як і звычайна, пра сваё юнацтва, з уласьцівым яму пасывізмам: „стаяў і марыў"; пасьля—стрэў дзеда, наіўна ўгаварыў яго пасядзець: „сядзь-пасядзі, тут родны край". Мотывіроўка, вядома, слабенькая, але-ж трэба пачаць твор.

Калі „дзядок устрос (?) сівымі валасамі" і ўздыхнуў, поэт папрасіў: „раскажы, дзядок, поэму!" — „кажы, кажы, мой любы" — словамі

аўтара. Дзеду зусім не хацелася расказваць; ён паплакаў ад старасьці, пасумняваўся, ці варта гаварыць: „ты малады... І мо' ня ўцяміш ты",— паплакаў з ім і чульлівы поэт. Нарэшце: „... йтак (?) расказаў жыцьцё сваё стары".

Да вядомае тэмы—нездаваленьне на заводзе ў стары час, рэволюцыя, паўстанцтва—ня зусім выразна там што і да чаго,—Маракоў не дадаў нічога новага. Нават лірычныя мясьціны неяк не ўдаліся, здаюцца паўторанымі, запазычанымі.

Прыкладам так:

„... Дзе сэрца краю Мураўёў
на жах,
на крыўду ўсёй Эўропы
мячом Расіі пракалоў.
(„В. Ж.", бал. 47).

Эўропа не жахнулася, наадварот, яна амаль што не зацікавілася Мураўёўскаю лютасьцю ў дачыненьні да Беларусі. Каб паказаць гэта, зусім ня трэба паўтараць:

„на тонкай сасьне беларускіх гаёў.
павесіў душу Беларусі.
(Т. Кляшторны. „Ветразі", бал. 106).

Зусім непатрэбна паўтараць захаванае згадкі пра „нацыянальнага гэроя" Каліноўскага, бо дарэчы яго не „калолі мячом" і ня „вешалі на сасьне". Праўда, павесілі, але проста на Лукіскім пляцы.

Далей дзед абвяшчае, што „я ня сумую, я горды", мусіць, забыўшыся, што кагадзе плакаў, і расказвае пра сына Антося, які „павадыр (тр. правадыр,—павадыр у сьляпых) і бунтар", „садануў дырэктару ў сьвіную морду" і быў пасаджаны ў турму.

Пасьля, у час рэволюцыі, калі сяляне зусім законна пажадал павесіць пана і, не падумаўшы, намеркавалі „панскі маёнтак спаліць",— Антось незразумела зьяўляецца ў вёску і гэтак-жа незразумела памірае ад панскае кулі.

Дзед вышаў непраўдзівы і зьліўшыся з поэтам,—хутчэй трэ' было чакаць аўтарскага зьліцьця з Антосем—гэты дзед гаворыць, як найлепшы агітатар, неўласьцівыя яму, нават у пляне аўтаравага заданьня, словы:

„Мы сёньня зрываем буржуйскую маску"
(бал. 56)

ці:

„Таварышы, сьмела і горда...
— Ура!"
(бал. 56)

ці:

„І адчуў ў той дзень праклятый,
аб чым шаптаў і пеў(?) закат(?).
(бал. 62)

Антось застаўся нявыразны, напорнасьці колектыву няма, аўтар у паставе нясталага юнага (сьмешнае запытаньне: — „табе шкада, дзядок, памершых?), а дзед, хоць у ягоных вачох і „стагодзьдзяў мудрасьць“, паслужыў аголеным прыёмам для напісаньня няўдалага твору.

Тры асобы: аўтар, Нюрын і комсамолка Натальля Кулік, формуюць „Таварыша Нюрына“.

Дружакі Маракоў і Нюрын у пасялковым клюбе (трэба здагадвацца, што пасёлак рабочы, бо яны абудва муляры) выбралі сабе „даму сэрца“ Натальлю Кулік. Яна, як і трэ'было чакаць, аддала перавагу Нюрыну, як больш сталаму. З аднаго боку, які сэнс выбіраць поэта, што ў час спатканьня гаворыць штосьці няўцямнае,—а з другога боку, Натальлі Кулік не выпадае лагадзіць Маракова, бо зьнікне драма, „страшная трагічная драма“, такая страшная, як быццам на анонсах кіно „Спартак“.

„Драма“ разьвінаецца.

Але калі дзед застаўся прыёмам, дык існаваньню Нюрына й Кулік можна даць веры. Успрымаецца, што „сам я ўвесь дрыжаў , а вось ужо ў тым, што „не гавары ніяк... Нікому... На шчоках лёг стыдлівы(!) жар (ці ня вугальле часам?)“,—дазвольце пасумнявацца. Непадобна нешта... ня вяжацца са зьместам.

Поэт прабуе правесьці між сабою і дзяўчынаю соцыялнае разьмежаваньне, быццам яна ня вызнае яго за тое, што ён муляр, але-ж і Нюрын муляр. Толькі мабыць лепшы, бо ў задуманага поэта, напэўна, неаднойчы валілася цэгла на галовы, бо на рыштаваньнях—

„абліты глінаю і вапнай,
я сонцу гімн злажыў—
(бал. 69)

а каб рабіць добра, трэба рабіць толькі адну справу.

Нюрын „качая буйной галавой“ („ківаў мне буйнай галавой“—у поэта) сарамаціў Маракова, упэўняў, што трэба кінуць вершы. Гэта не памагло.

„Драма“ пасуваецца далей. Маракоў адчувае сябе ўжо больш поэтам, як муляром, але ўсё-ж такі, калі „пакрыўдзіла горка яна“, плюнула ў сэрца“, ён кінуўся на ратунак да працы, да Нюрына, да свайго супарата ў каханьні, прычыннага ў няшчасьці. Гэта крыху ненатуральна, гэтак не здараецца, але Маракову можна дараваць, бо ён знайшоў правільнае выйсьце з душэўнага тупіку, накіраваўся да працы, праўда, як пабачым далей, ня з мэтаю ўславіць гэтую працу.

Тэматычнае кола новых заданьняў поэты, калі ён пашоў „зноў шукаць вясны“, ня выходзіць за аправу ягонай „драмы“ з Кулік:

„І пашоў я поэмы складаць
пра каханьне,
юнацтва і радасьць“...
(бал. 78)

Гэта кола не прымацоўваецца да новага, не знаходзіць працоўнага асяродзьдзя. Юнацтва для юнацтва.

Выслухаўшы поэта, Нюрын „пахіліўся нізка да долу", паставіў крыж на Натальлю Кулік, няхай ня крыўдзіць таварыша, бо мы „шукаем жаданых сьветлых берагоў", і палез ізноў на рыштаваньні.

Поэта-ж ня прывабіла праца. Разьвязаўшы балючае пытаньне, ён пашоў ізноў гарлапаніць песьні пра сваё неабсяжнае юнацтва і аддаў—жорсткі—зусім нечакана комсамолку Кулік „некаму панку", не згадаўшы пра выхаваўчы ўплыў ячэйкі, не клапоцячыся пра моты-віроўку, каб толькі захаваць сяброўства з Нюрынам.

Сяброўству Маракоў аддае шмат увагі. Вясёламу радаснаму сяброўству. Яно шчыльна нітуецца з ягоным культам маладосьці і грунтуецца на маладосьці.

Мулярства мала зьвязвае сяброў.

А самае-ж галоўнае, каб дасягнуць адваротнага.

Праўда, яшчэ ёсьць імкненьне да „жаданых сьветлых берагоў", трэба думаць новых берагоў, але яны не акрэсьлены і невядома, якія гэта берагі і чым яны адрозьніваюцца ад старых.

Сяброўства для сяброўства, маладосьці для маладосьці—дыялектыка не вызнае.

Усё павінна мець грунт.

III

Дзе-ж вы, мае дарагія?
Дзе-ж ваш раскінуўся стан?
„Вяр. жад,", бал. 34

Маракоў ахвотна перагукваецца з іншымі поэтамі. Можна было-б згадаць ня зусім ахайна зроблены пераклад з Есеніна—„што-ж ты прызадумаўся (!), раскудравы (?) мой?"; і—радкі, што зусім паўтараюць „Анну Снегину"—„быў той вечар жывы і нязвыклы, як дзяўчына пад майскай (?) зарой",—ды шмат чаго, што сьведчыць пра лёгкасьць Маракоўскага рэзонаваньня на чужыя галасы.

Як і Пушкін, бласлаўляючы „Евгения Онегина"—

„...лети же к невским берегам,
новорожденное твореньне,
и принеси мне славы дань,
кривые толки, шум и брань"—

Маракоў кажа:

„Ляці-ж у сьвет,
нясі поэту
і шум і лаянку ў газэтах"...
(бал. 82)

Пушкін—поэт зусім чужы Маракову. Ад Маракова далёка крыштальная акавіта Пушкінскай поэзіі, ён хутчэй захапляецца бунтоўным Лермантавым (верш „Цыганка") ці нават Надсонам.

Надсон—гэта поэт сама найбліжшы Маракову. Тая-ж пашана да маці, нават культ яе, пашырэньне гэтага культу праз перанясеньне адзнак маці, па інэрцыйнай традыцыі нашаніўства, на бацькаўшчыну, на Беларусь.

Ад Надсона поэт бярэ надрыўнасьць ягонай вясны, не зважаючы на тое, што вясна Маракова, у шматлікіх пунктах падобная да Надсонаўскае, куды здаравей і маладзей.

Літаратурная надрыўнасьць, перанесеная мэханічна, заўважаецца адразу, яна не пераконвае.

„Верым мы
толькі першым надзеям, утратам“
(бал. 14)
„Ты гаворыш, што сэрца прастыла“...
(бал. 12)
„Тут так хораша, промняў так многа“...
(бал. 33)

Гэткіх радкоў льга прывесьці шмат. Сказанае ў іх не кранае і не пераконвае, гучыць штампавана, зусім ня верыцца, што сапраўды хораша, бо гэтае „хораша“ адчуў яшчэ Надсон, а не Маракоў.

А тымчасам, як глыбока ўражаюць радкі, што ідуць з глыбіні істоты, ад адчуваньня бязвыходнасьці:

„Вочы туман засьцілае,
ў гэтым тумане вясна...
нейчая зорнасьць былая,
нейчая казка адна“.
(бал. 34)

Яны ўражаюць, бо сапраўды адчуты, зьявіліся ў выніку глыбокага перакананьня, што нікне вясна, што адчуваецца яшчэ „былая зорнасьць“, ад якой трэба адыходзіць, тымчасам як новае яшчэ не дасягнута, што казка—„нейчая“, не прымацаваная, і таксама ў тумане.

Прыкры налёт літаратуршчыны зьніжае мясьціны, дзе поэт ўзвышаецца да надзвычайнага напружаньня лірычнага голасу. Бо пераконваць іншых у тым, чаго не адчуў сам, немагчыма.

„...Такою дзіўнаю гаворкай,
такою ласкавай красой,
як гэта даль,
як гэта зорка,
над гэтай буйнай паласой“—
(бал. 68)

гаворыць поэт, і радкі гэтыя сапраўды павяваюць сваею ўласнаю маладосьцю, і таму прыкра ўражае;

„хтось кінуў ружы на закаце (!),
жывой і сонечнай рукой,
і, нібы казачная маці,
ноч навявала ім спакой“,
(бал. 68)

Ох, гэтыя „ружы“! О-ох! гэтыя „закаты“! Іх так многа ў кніжцы, а пра іх зусім няварта пісаць, хоць-бы таму, што ад частага ўжыванья яны канчаткова абяззубелі, страцілі эмоцыяльную сілу і зьяўляюцца сродкам звычайнай мовы. А калі згадаць, што любаваньне „ружамі“ і „закатамі“ ўласьціва гітарным паненачкам прыгараду, зусім крыўдна робіцца за поэта. Трэба гадаваць зьнявагу да апошленага хараства.

А гэтая „маці“! Яна далёка ня казачная. Яна вылезла з аднайменнага надсонаўскага вершу суцяшаць дзіцёнка, вылезла паўз волю поэты, з глыбіні ягонай сьвядомасьці, адчыняючы нам стары куток поэтавай існасьці.

Надсон блізкі сваяк Маракова. І таму апошняму трэба сьцерагчыся свайго браценіка, як пораху ад запалкі.

Калі мы будзем разважаць, што прылічае творы Маракова да катэгорыі поэзіі, дык міжвольна згадваюцца марксавы словы пра грэцкае мастацтва:

„Мужчына ня можа зноў зрабіцца дзіцёнкам, ня робячыся сьмешным. Але хіба ня радуе яго наіўнасьць дзіцёнка, і хіба не павінен ён імкнуцца да таго, каб на вышэйшай ступені аднаўляць сваю сапраўдную існасьць, і хіба ў дзіцячай натуры ў кожную эпоху не ажывае яе ўласны характар у яго нявышуканай праўдзе?“ (К. Маркс „Да крытыкі політычнае эканомііі“).

Яшчэ зборнікам „Пялёсткі“ Маракоў увайшоў у поэзію. Увайшоў менавіта тым, што здолеў „уласны характар“ маладое натуры ў яе непасрэднасьці ўлажыць у песьню. Ён прынёс нам сваю інтонацыю маладосьці, вясны, сяброўства. Гэтым і тлумачыцца дужасьць поэта.

Але калі надышоў час стала і выразна акрэсьліць сваю грамадзкую позыцыю, Маракоў пачаў бравіраваць маладосьцю. Яна зрабілася плашчом, у які закручваўся поэт усе зрывы, хістаньні ён захацеў ахінуць маладосьцю. Ён ня можа, сталеючы, захаваць апорнае свае творчасьці—інтонацыю маладосьці, „ня робячыся сьмешным“.

Маракоўская філёзофія „пазнаў і я, што ёсьць прырода“—не сягае вышэй узроўню сямігодкі. Поэт увесь час жыве і дыхае прыродаю, а спавяшчае пра ўсьведамленьне гэтае апошні.

Ня кожную ваду канечне трэба перагатоўваць для ўжыванья.

Волат-вада, пакарачаеўску, нарзан.

Перагатаваны ён робіцца прыкраю мікстураю, саланаватаю на смак.

Некаторыя ўпарта пнуцца перагатаваць Маракова, ня ведаючы яго ўласьцівасьцяй.

„Дзесяць старых панн дзьмуць на яго, каб зрабіць яго геніем. І губяць рабочых“ (У. І. Ленін да К. Радэка).

Тым часам Маракову трэба захаваць сваю маладосьць як нельга надалей.

Гэтым не адмаўляецца выхаваўчы ўплыў.

Наадварот.

Маладосьць павінна набыць грамадзкія функцыі

Неправедзены ў ванны нарзан толькі клякоча і пеніцца.

Перагатоўваць ня трэба.

Рабіць юнака бяззубым дзядком.

У беларускай літаратуры даволі дзяцей з дачаснымі маршчынамі.

А поэту нятрэба ператвараць поэзію ў бясконцае апавяданьне пра юнацтва.

Гэта нудна.

Трэба, каб моладасьць ня была прыёмам уцяканьня ад сучаснасьці, трэба шырэй разгарнуць тэматыку і, у рознастайных пытаньнях будаўнічага дня, захаваць маладую інтонацыю.

Маладосьці трэба не дачасная старасьць, а клясавы грунт, ня шырма ад бvдаўніцтва, а шчыльнае зрастаньне з рабочым днём на рыштаваньнях соцыялістычнай будоўлі.

Пакуль што гэтага няма. Можна меркаваць, што няма сьвядома. У „Пялёстках“ Маракоў спавясьціў, што яму ня трэба нічога радзіць, што „жыцьцё пракрычыць“, пра што сьпяваць. Калі „жыцьцё пракрычыць“,—будзе позна. Ды ці будзе яно крычаць для Маракова? А гаворыць яно вельмі выразна. Словамі „жыцьцё пракрычыць“ Маракоў паказвае неканчатковае ўсьведамленьне задач поэзіі. Поэт павінен быць настолькі разьвітым, каб чуць тады, калі гаворкі няма, калі йдзе насьпяваньне процэсаў.

Такім чынам маладосьць Маракова нітуецца з тымі соцыяльнымі грунтоўкамі, што чакаюць, пакуль „жыцьцё пракрычыць“, якія бачаць нашыя посьпехі, але не адчуваюць іх.

Разрыў паміж установкаю і сьветаадчуваньнем.

Пра гэта далей, а тут трэба згадаць Уладыслава Хадасэвіча.

Справа сваяцтва не абмяжоўваецца Надсонам. Можна меркаваць, што Маракоў столькі-ж чуў пра Хадасэвіча, як і апошні пра Маракова. Калі-б Валеры прачытаў ягоныя вершы, дык напэўна не захапіўся-б.

Аднак сваяцтва. І вельмі глыбокае.

Юры Тынянаў зусім слушна заўважае, што верш Хадасэвіча нэўтралізуецца вершаванаю культураю XIX ст.

Ад формалістага нельга вымагаць большага за гэтае азначэньне. Для нас яго мала. Бо Хадасэвічу „порой целые ряды заветнейших мыслей и чувств оказываются неизʻяснимыми иначе, как в пределах пушкинского словаря и синтаксиса“ (Вл. Ходасевич. „Статьи о русской поэзии“, бал. 116). Гэта адно паказвае ўжо, на якой адлегласьці

знаходзіцца аўтар ад нашага сучасься, ад якога часу ідуць ягоныя „мысли и чувства“, калі патрабуюць пушкінскага слоўніка.

І вось з гэтым поэтам міжвольна, вядома, перагукваецца Маракоў.

Яны падобны ад назваў кніжок да паасобных тэм і радкоў.

„Вяршыні жаданьняў“ В. Маракова;
„Счастливый домик“ Ул. Хадасевіча.

Абедзьве назвы павяваюць чымсьці дасягнутым, назначаюць якуюсьці мяжу імкненьняў.

Дзе-ж знаходзяцца „Вяршыні жаданьняў“?

Паслухаем аўтара:

„Мы імкнемся туды,
дзе вясной
расьцьвітаюць вяршыні жаданьняў,
дзе забыты з табою мы даўно
непагодамі бур
і туманаў.

(бал. 14)

„З табой“—гэта з дзяўчынай, якою „захмялела галава“, далёка ад „непагод“ і „бур“, г. зн. далёка ад жыцьця, у якім няўхільны буры,—у цішы, у супакоі—расьцьвілі вяршыні жаданьняў.

Калі для каго гэта й ёсьць вяршыні, для нас тут няма нават і ўзгорачка, гэта проста ляное балотца мяшчанскага супакою.

„Краіна жыцьця“, у якую едуць „па возеры шчасьця“ ў Маракова—гэта тая-ж самая „страна безмолвия“, якая кліча ў „Счастливый домик“ Хадасэвіча—„спокойно жить и мирно умереть“.

Гэта тая-ж самая „мирная домашняя трудовая (каб-жа сапраўды „трудовая“!) жизнь“, „молитвенное смирение обитателей дома“, „поместье с лесом и садом“ з „Колеблемого Треножника“ таго-ж Хадасэвіча.

Там, „на вяршынях“, „хвойнік і Сьвіслач да сябе заклікаюць пажыць“ (!).

Толькі „пажыць“, выключна!

І вось з гэтай прычыны: „годзе песень, разгулу, трывогі, хоць хвіліну адну так пажыць!“—Маракоў адмаўляецца ад песьні, пра якую у кніжцы „На залатым пакосе“ казаў: „відаць, у жыцьці нікога не спаткаю, каго змагу, як песьню, палюбіць“, ён аддае гэту песьню за хвіліну маленькага супакою.

Гэта-ж не змаганьне, ня стомленасьць пасьля працы вымагаюць здаровага сну і адпачынку, гэта соцыяльнае асяродзьдзе, мяшчанства,—поэтавы вяршыні якраз супадаюць з імкненьнямі гэтай праслойкі: „потише да полегче“,—гэта яно патрабуе вуснамі Маракова—„хоць хвіліну адну“.

Гэта тое-ж асяродзьдзе, якое ў „Счастливым домике“ кажа:

„Только нужно жить потише,
не шуметь и не роптать“,
(„Сч. домик“, бал. 45)

якое прымушае Хадасэвіча атоежсамлівацца з цьвіркуном за печчу:

„Для жизни медленной, безропотной, запечной,
судьба заботливо соединила нас“.
(„Сч. дом.“, бал. 44)

Гэта асяродзьдзе, ідэалам якога зьяўляецца „рай“, дзе па Хадасэвічу:

Заяц лапкой бьет по барабану,
бойко пляшут мыши впятером.
Этот мир любить не перестану,
хорошо мне в сумраке ночном.
(„Сч. дом.“, бал. 67)

і па Маракову:

„Над прасторам ніў і над квяцістым лугам
бубянцом ахвота празьвінець“.
(„Вярш. жад.“, бал. 29).

ці:

Мне ўсё адно... Я толькі рады,
што зноў пабачыў
сінь нябёс,
падгніўшы дом...
(бал. 36)

Вось чаму настойліва просіцца на паперу думка.

Калі Маракоў кажа:

„Я знаю шчасьце—верыць і змагацца,
ісьці, гарэць, ўпівацца барацьбой...
(бал. 6)

калі ён парываецца супроць старога, хто паручыцца, што гэтыя парыванні ня згінуць марна, што хада ў новы прастор і імкненьне „ўпівацца барацьбой“, не накіраваны, так як у Хадасэвіча, на тое, каб

„и новый мир создать в слезах,
во всем—подобие былого.
(„Сч. дом.“. бал. 37)

Імкненьні Маракова не акрэсьлены цьвёрда. Мы амаль нічога ня ведаем больш за „жыць“, „ісьці“, „змагацца“, „гарэць“. Як жыць? куды ісьці? за што змагацца?“ з якой прычыны гарэць?—для нас покуль што нявыразна.

Пашукаем яшчэ. Уважлівей перачытаем кніжку.

Бо соцыяльнае асяродзьдзе душыць Маракова.

І так нечакана, здавалася-б, знаходзяцца далёкія сваякі.

IV

Ці-ж ёсьць высьце? Ці шукае яго поэт? Ці заўсёды ён атоеж-самліваецца з Хадасэвічам?

Маладосьць, вясна, сяброўства назначыліся як галоўнае ў творчасьці Маракова яшчэ ад часу напісаньня першага вершу.

Адтуль-жа пачалося і славутае „гарэньне".

Гэта яно дало майстром дасьціпнага слова прычыну да падлічэньня, колькі разоў „гарэў" Маракоў.

З тэй-жа крыніцы выцякла і ўяўленьне аб поэце, як аб „неопалимой купине".

Гарыць і не згарае.

У „Вяршынях жаданьняў" „гарэньне" ператварылася ў „паланець", „ісьці", „тварыць", ці адгукнулася ў прызваітых формах: „гарэць імкненьнем юных і жывых", ці зусім бязмэтна: „зноў згараць у траве з травой".

Па сутнасьці гэтая зьява становіць падсьвядомае пабуджэньне парваць сувязь з затхлым атачэньнем, кінуць выклік супакою праз згараньне, праз агонь, пабуджэньнем, якое часамі выліваецца выразна:

„Я не хачу мяшчанскай ціхай спальні".
(„На зал. пакосе", бал. 25)

Але гэтае „не хачу" застаецца толькі выгукам. „Мяшчанскай спальні" не супроцьстаўляецца тое, чаго хоча поэт. Гэтая спальня застаецца, кажучы ягонымі словамі, вабным, „прыгожым домам" — „хай не адчыняць мне ў прыгожым доме дзьверы".

Протэст зьяўляецца таму, што дзьвярэй могуць і не адчыніць, і зусім лёгічна вынікае расслабленая канцоўка вершу:

„Дармо!... і ў полі можна начаваць".

„Вяршыні жаданьняў" як быццам пачынаюць назначаць усьведамленьне таго, што зьяўляецца „прыгожы дом".

„З балота бруду і мяшчанства
ўсё-ж бачыў полымя зарніц.
Я гадаваў ў сабе
Паўстанца
і новым дням схіляўся ніц...
(„Вярш. жад.", бал. 75)

Гадуючы ў сабе паўстанца, Маракоў яшчэ ня здолен будаваць. Ён схіляецца ніц перад новым, бо яно сьлепіць яго сваёю навінёю, яно далёка і недасяжна.

Поэт яшчэ на раздарожжы: „дзе-ж родны дом мае душы?".

У „Пялёстках" Маракоў рэкомэндаваўся вяскоўцам. „На залатым пакосе" гэтыя мотывы зьмяняюцца гарадзкімі, на поле ён ужо выходзіць адпачываць з гораду, бо ў горадзе „хрыпла гудок прагучэў",

і ад гэтага гудка „сэрца скранулася, стала“, наогул-жа гудкі зьяўляюцца „крывавай пагрозаю“. У „Вяршынях жаданьняў“ поэт выбіваецца на муляра. Але і для муляра горад чужы: „мяне ніхто тут ня прытуліць сярод тупіц і між зьвяроў“. Цяжка адрасаваць гэтыя словы „балоту бруду і мяшчанства“, яны хутчэй працягваюць традыцыі „Залатога пакосу“.

Постаць поэты складаная. Але рознастайнасьць вядзе да адзінасьці. Вясковая лінія „Пялёстак“ пераможана „прыгожым домам“ „Залатога пакосу“ поруч з пасыўным протэстам супроць гэтага дому, а „Вяршыні жаданьняў“ прабуюць асэнсаваць гэтую пераможанасьць, ацаніць „балота бруду і мяшчанства“ як такое і выкрываюць вяскоўства і мулярства, як спробу захаваць гэты бруд.

У „Вяршынях жаданьняў“ зьяўляюцца спробы ўсьвядоміць нікчэмнасьць свайго сапраўднага соцыяльнага асяродзьдзя, і таму ў іх ужо назначаецца пераход да новае песьні, патрэбнай здаровай клясе, выяўніком якое імкнецца быць Маракоў.

Гэты пераход тэматычна разьвязваецца так:

„Дзесяць год“ (кастрычнік), „Цыганка“ (атаўбоўваньне цыганоў на зямлі), Беларускай рабоча-сялянскай грамадзе, кітайскія падзеі, крыху пра колгас (Бляха).

Гэтымі пытаньнямі сягоньняшняга дня пачынае займацца Маракоў.

Калі ў зборніку „На залатым пакосе“ верш на сьмерць Сако і Ванцэці зьяўляецца ў значнай меры простым рэагаваньнем на сьмерць як зьяву,--у „Вяршынях жаданьняў“ можна заўважыць сугучнасьць клясавым пачуцьцям пролетарыяту.

„Веру ў песьні свае і ў жыцьцёвую сілу
абудзіў ў нас Кастрычнік“...

(стар. 7)

Гэтыя ці наступныя, надзвычай высокія радкі—

„Цяжка сэрцу поэты маўчаць.
Сёньня нашых братоў
расьпінаюць.
Гляньце,—вобраз паўстаў
Ільліча
І зноў кліча на бой,
на змаганьне“—

(стар. 28)

кажуць, што калі поэт гаворыць: „дзе-ж вы, мае дарагія“, дык слова „дарагія“ ня толькі адрасавана тым дарагім, каторых пакідае поэт, але і тым, да каторых імкнецца.

А імкнецца ён да тых, каго натхняе вобраз Леніна, у каго сілу абудзіў Кастрычнік. Зразумела, што гэтыя дарагія ня могуць жыць у „прыгожым доме“, яны супраць супакою, яны за братоў кітайцаў і супраць рэнэгата Чан-Кай-Шы.

З імі прабуе сьпяваць поэт.

Праўда, „мы“, „нас“—гучыць няўпэўнена, гэта яшчэ схіленьне ніц перад новым, як перад тым, што зроблена бяз удзелу поэта, але, хто такія мы, відаць яскрава.

Чуцён новы гук.

У вершах зьяўляецца ячэйка, пытаньне зямляўпарадкаваньня цыганоў.

„Цыганка“—верш дужа характарны пераходнаму стану поэта. І ў цыганкі ад зямлі сэрца просіцца „за дальні курган“, яе яшчэ вабіць мінулае вандраваньне, гэтак як над поэтам вісіць „прыгожы дом“.

„Цыганка“ перагукваецца з лепшым апавяданьнем „Ілька“ Каваля і нездарма прысьвячана апошняму.

Маракоў прабуе знайсьці новае кола „дарагіх“. Хто яны—поэт ведае, але канчатковага ўсьведамленьня, чаго дамагаюцца гэтыя дарагія, няма.

Прасачыць гэта можна так.

Уступны верш да зборніку дужа хаотычны. Гэта якраз характэрна ломцы поэтавай псыхікі, якая адсоўвае назад пытаньні композыцыйнага афармленьня і гэтым самым зацяняе зьмест.

На пачатку гаворыцца:

„Ёсьць лепшы сьвет
напружнай творчай працы,—

а далей ідзе нечаканае адпіхваньне сказанага:

„Там дзесьці, там у ячэйках
і у школах
жывуць *другім* (курс. мой *М. Л.*)
напружаным жыцьцём“.

Чаму другім жыцьцём? Якраз і ячэйка і школа пакліканы да сказанага ў першай строфе:

„верыць“ (вядома, верыць у перамогу), „змагацца“, „лунаць вольнай думкаю“.

Толькі ячэйка цьвёрда ўсьведамляе, за што яна змагаецца, а для поэта ячэйка, з яе мэтаю, знаходзіцца на ня выразнай адлегласьці:

„Там, дзесьці там у ячэйках“...

Верш разьвінаецца:

А тут туман,
тут пыл стагодзьдзяў душыць...

Успрымальнік заблытваецца.

Ён больш верыць сьвету ячэек, бо добра ведае, што яны значаць і куды вядуць. Яму цяжка орыентавацца ў поэтавым сьвеце, няхай сабе і „напружнай творчай працы“, бо гэтая праца можа быць палкаю на два канцы: служыць і нам і нашым клясавым супаратам. Натуральна, што ўспрымальнік сьвет поэта зьвязвае з „пылам стагодзьдзяў“, бо адпіханьне ад гэтага пылу не падкрэсьлена.

Такім чынам, добрае жаданьне касуецца дрэннаю композыцыяй, і калі поэт кажа:

„Пакуль мне
ў *лепшы* сьвет (курс. мой *М. Л.*)
не адчынілі дзьверы"...—

успрымальнік уяўляе яшчэ адзін сьвет, сьвет лепшы ад сьвету ячэек і сьвету напружнай працы, хоць у пляне аўтарскага заданьня гэтыя тры сьветы тоежсамасьць, якая супроцьставіцца балоту, дзе ня бачаць вясны, за якую галасуе поэт, дзе гавораць—„што ім абрыдла жыць"

Гэтае „абрыдла жыць" вынікае ня проста, яно зьвязана з бязвыходнасьцю соцыяльнае групоўкі, з немагчымасьцю для яе ўдзельнічаць у грамадзкім жыцьці, са сканчэньнем гістарычнага прызначэньня гэтае групоўкі.

Такім чынам, нават композыцыйнае аформленьне становіць постаць поэты як пераходніка. Яно хаотычна, як хаотычна і хістка сьветаадчуваньне аўтара, не прымацаванага да акрэсьленых клясавых дачыненьняў.

Вось чаму поэту душна яшчэ бывае ў жыцьці:

І юнацкаму сэрцу ў грудзёх *стала цесна*
біцца пульсам кіпучым
жыцьцёвай струны (курс. мой *М. Л.*)—
(бал. 7).

стала цесна, не зважаючы на дэкляраваную сувязь з жыцьцём:

„ісьці, гарэць, ўпівацца барацьбой"...—
(бал. 6)

стала цесна ў тым самым вершы, дзе поэт усьвядоміў абуджэньне Кастрычнікам творчае сілы пролетарыяту. „Цесна" гэтае выскачыла таму, што вышэйзгаданае ўсьведамленьне, прышоўшы ад розуму, яшчэ не кранулася сьветаадчуваньня

Ці словамі поэты:

Толькі там ідуць супроць
жыцьця,
дзе ў руках
жывога парываньня
дагарае першая сьвяча.
(бал. 79)

Сьвечка протэсту дагарае, душнае кола, з якога тужыцца вырвацца поэт, не разьбіта, значыць ізноў „просіцца сэрца на дальні курган" у супакой, у тогу маладосьці, балюча адчуваць, што „людзкое сэрца ўсё-ж машына", зьяўляецца жаданьне абвясьціць сябе велічынёю іррацыянальнай:

Жыцьцё,
я думаў,
гэта творчасьць,
а творчасьць—лепшага экран".
(бал. 84)

Тут творчасьць усьведамляецца, як адлюстраваньне чагосьці лепшага за жыцьцё.

Робіцца зусім зразумелым пасыўнае станаўленьне поэта да сьвету. Замест таго, каб адчыняць дзьверы ў лепшы сьвет, ён чакае „пакуль мне ў лепшы сьвет не адчынілі дзьверы", замест таго, каб будаваць культуру, ён толькі ідзе „аднэю паласой". Гэта яшчэ водгук мо' ранейшага, што „жыцьцё пракрычыць", якія трэба песьні.

Гэтак-жа высьвятляецца, чаму песьня, нарадзіўшыся „ў муках" „мукі радзіла другім", чаму „дагарала і нікла вясна", чаму „у агні бунтоўнага натхненьня душа сьпявала, як орган".

Зразумела, чаму ў агні будаўнічых імкненьняў душа сьпявала, як стары касьцельны інструмант. Пасуваючыся да новага разумова, Маракоў ня можа падцягнуць свайго сьветаадчуваньня, душа яго „сьпявае, як орган".

Гэтая няўзгодненасьць адчуваецца і ў прыёмах.

Пафоснасьць залішняя пераходзіць у гіронію:

Жыва!
ня то цябе услаўлю бізуном.
(бал. 59)
Размахнуўся горда,
размахнуўся горда і, што стала сіл,
садануў дырэктару ў сьвіную
морду.

Каб паказаць благога дырэктара, зусім ня трэба рабіць яго ваўкалакам „з сьвіною мордаю", а бунтара прымушаць „размахвацца", горда, як опэрэтачны гэрой.

Гэта танна.

Дырэктар з самаю прыстойнаю „мордаю" можа быць заклятым ворагам рабочых.

Трэба меркаваць, што хісткасьць сьветапогляду палажыла адбітак на апрацоўку вершаў, на ахайнасьць мовы.

Так, „Адноўленая зямля" напісана жудасным жаргонам.

Міжвольнае станаўленьне ў паставу казачнага гэроя, што на хаўтурах сьмяецца („на вашых магілах мы справім вясельле"), шматлікія зьбегі зычных, нескладовае „у", цяжкасьць пры чытаньні вершаў, нават „сьціраньне" такіх глыбока матарыяльных істот, як жывёлы (выраз „бы касьцёр—атрымл. „быка сьцёр) ды шмат чаго іншага вынікла ад разьбежнасьці думак. І тут адгукнулася соцыяльная абумоўленасьць.

Ранейшыя зборнікі Маракова больш апрацаваны.

Але й „Вяршыня жаданьняў" пакідае за ім права называцца адным з моцных поэтаў нашае маладой літаратуры.

Ну, даволі...
Што загаласілі...
Хай падчас я падаў і хварэў,—
Я ўцякаў ад холаду магілы,
Я агнём жаданага гарэў.
(бал. 79)

Дамо веры.
Няхай сабе „не падчас падаў“, а на працягу ўсяе кніжкі.
Няхай сабе не „агонь жаданага“, а толькі агенчык.
Але каб ён ня гас.

Каб новае слова поэзіі Маракова канчаткова высьветліла ягоныя мэты, канчаткова ўліло яго ў шэрагі будаўнікоў соцыялізму.

Каб маладосьць была не на курганах, а ў напорных днёх нашай будоўлі.

І калі

мы пабудуем сьветлы дзень.
дзе новы творца
чалавек
дарогай простаю ідзе
без надламаных
і калек“—

каб гэты сьветлы дзень не абышоўся без поэта.
Каб не застаўся ён у лягеры калек.

Мы павінны заслужыць таго, каб, як сёньня поэт, на магілах адышоўшых, наш радасны нашчадак, прышоў

...на нашых магілках вясной
сьпяваць з захапленьнем пра шчасьце
і волю“!

Поэт—багаты маладосьцю.
Ён сказаў: „я ніколі не гандляваў песьняю“.
„Вяршыні жаданьняў“ сьведчаць пра шчырасьць Маракова.
Запомнім гэтыя словы.

Менск, 1-20/X-30 г.

БІБЛІОГРБФІЯ

А. Звонак—„Каршун“. Белдзяржыдавецтва, Менск, 1930 г. 30 балонак. *Цана 35 кап. Тыраж 3000 экз.*

„Каршун“—вершаванае апавяданьне, якое па характару свайму бліжэй за ўсё стаіць да оэмы. У аснову яго сужэту пакладзена гісторыя двух братоў, з якіх адзін—чырвоны камполк, а другі—правадыр бандытаў. Яны змагаюцца, стоячы на чале двух варожых адзін аднаму атрадаў, змагаюцца, ня бачачы адзін аднаго і ня ведаючы, што яны браты.

Чырвоны камандзір Паддубны перамагае бандытаў. Паддубны і бандыцкі атаман Каршун сустракаюцца твар у твар. Пазнаюць адзін аднаго... І першы, верны пролетарскай справе, забівае брата-бандыта ўласнаю рукой.

Поэма, ня гледзячы на тэму, зусім блізкую да сучаснасьці (змаганьне з бандытамі), мае дзволі выразны характар рамантычнай поэмы. У цэнтры яе стаяць выдатныя асобы. Паддубны, чалавек бяз жадных заган і чалавечых слабасьцяй, сапраўдны гэрой, атулены романтычным орэолам моцнай асобы. Сваёй бязбоязнасьцю, магутнасьцю і нясхільнасьцю сваёй волі ён нагадвае ўлюбёных романтыкамі гэрояў накшталт Корсара, хоць і адыгрывае іншую ролю. Ён і малюецца не такім, якім бываюць звычайныя людзі. Яго голас, нібы голас казачнага асілка, прымушае траву хіліцца да зямлі:

А ў Паддубнага голас грукоча
(гаркне—хіліцца долу трава)...

Вочы Паддубнага „арліныя“, сэрца „суровае“, яму „ці памерці, ці жыць — усё адно“, а ў глыбіні душы яго гарыць „заравы агеньчык“, які здольны запальваць змагарчым імпэтам людзкія сэрцы.

І, ня гледзячы на тое, што ў яго „суровае сэрца“, яму ўласьціва чуласьць і цяплыня. Ён, гэты суровы ваяк, нават плача, убачыўшы труп чырвонаармейца Сяргіенкі, павешанага бандытамі,—радкі, прысьвечаныя напаткаьню Паддубным трупа таварыша, атулены глыбокім лірызмам.

Вобраз Паддубнага выступае на фоне зборнага вобра у чырвонаармейцаў, але гэты апошні ў поэме выпуклен слаба. Масы Чырвонай арміі падаюцца,як нешта магутнае, упартае, адважнае, непераможнае, але разам з тым нешта такое, што ня мае свайго ўласнага твару, фактычна маса чырвонаармейцаў—гэта нешта накшталт рэха волі Паддубнага. І сапраўды, як рэха, паўтараюць словы Паддубнага Ён гаворыць:

Да бою!
Усё зьмяцём гураганам ліхім,
Альбо ў Нёмане коняй напоім,
Альбо голавы зложым над ім.

І чырвонаармейцы адказваюць:

Альбо ў Нёмане коняй напоім,
Альбо голавы зложым над ім.

Але, агульнае ўражаньне ад Чырвонай арміі ў поэме моцна спрыяючае, высокае. Паддубны — ён-жа таксама ад Чырвонай арміі, яе прадстаўнік. Яго моц зьяўляецца адначасова і яе моцаю. У аўтара нават адчуваецца тэндэнцыя даць у вобразе Паддубнага вобраз. у якім-бы гаварылі масы. Але гэта яму дрэнна ўдаецца, цікавасьць да асобы перамагае, і, замест дыялектычнай еднасьці асобы і мас мы маем у поэме іх тоесамасьць, дзе не асоба індывідуальна выражае масы, а масы дакладна адлюстроўваюць асобу і тым яшчэ ўзвышаюць яе.

Мастацка-мэтодолёгічнай устаноўкай аўтара зьяўляецца ўстаноўка на псых лёгізм. Адсюль „квінт-эсэнцыя“ поэмы ў тым псыхолёгічным конфлікце, які перажывае Паддубны, забіваючы свайго брата-бандыта. Гэты конфлікт для аўтара зьяўляецца асноўным вабячым момантам сужэту. Паддубнаму балюча бачыць брата бандытам, балюча забіваць яго, ня гледзячы на ўсю яго нянавісьць да ворагаў рэволюцыі. Аданасьць сваёй чырвонаармейскай справе вышэй за ўсё ў Паддубнага, але гэта ня зьнішчае пакуты ад сумнага здарэньня з братам. І аб гэтым сьведчаць хаця-б такія моцныя па сваёй эмоцыянальнасьці радкі:

І камнем на сэрцы
ліхая туга
скрываўленай ценьню
жахліва лягла...
. . . . . .

І Нёман спакойны
быў сьведкай, калі
крывавыя хвалі
кругамі плылі...

Як сам сужэт поэмы (браты-ворагі—канфлікт крэўных адносін і грамадзкіх абавязкаў, так і ўстаноўка на псыхолёгізм характарны для романтычных твораў і яднаюць поэму з гэтымі апошнімі.

Робраз бандыта Каршуна падаецца ў адмоўным асьвятленьні. Ён—падкулачнік, паддаўся кулацкаму ўплыву: „пад дудку кулацкай зграі па лясох.. загуляў". І дарэмна „журылася маці-сырая зямля" па сваім благім сыне. Характарызуецца Каршун наступнымі рысамі: ён любіць пагуляць, ласы да дзяўчат і да самагону, жорсткі, бязьлітасны, няшчадна мучыць людзей. Такая характарыстыка зьяўляецца трафарэтнай. У мастацкіх адносінах гэты вобраз зусім слабы. Усе словы Каршуна здаюцца нейкімі нацягнутымі і штучнымі не таму, што іх зьмест неадпаведны, а таму што ім неяк не стае мастацкай жыцьцёвасьці. У ім ніводнай рысы жывога чалавека, гэта ўмоўная схэма ворага савецкай грамадзкасьці. якая не вызначаецца нават дасьціпнасьцю карыкатуры. Ня гледзячы на тое, што поэма завецца імем Каршуна, гэты вобраз у творы адыгрывае ролю контрвобраза, які служыць сродкам выяўленьня характару Паддубнага.

Асноўным фонам для гісторыі Каршуна Паддубнага служаць бойкі чырвоных з бандытамі. У апісаньні гэтых боек ёсьць некалькі ўздымных, насычаных патосам месц. Сярод іх асноўныя прыпадаюць на долю заклікаў да змаганьня Паддубнага.

Але гэты змагарчы ўздым неяк контрастуе з агульным эмоцыянальным тонам поэмы, які мае выразную афарбоўку суму, тым больш, што за такімі ўзьнятымі бадзёрымі месцамі ідуць моманты журботнага характару, моманты спаду да абмяклага настрою. Аўтар больш увагі аддае суму па ахвярах справе рэволюцыі, чымся радасьці ад перамогі:

Не забудзем мы гэта ніколі,
Калі несьлі ў ахвяру жыцьцё й маладосьць
І рыдаў па-асеньняму дождж
Над здратаваным полем.

Шчыры і моцны смутак гэтых радкоў супярэчыць патосу змаганьня і будаўніцтва і нясхільнай волі да барацьбы. Боль за страты і руйнаваньні—ён, зразумела, неабходны, але ён не павінен зьніжаць настрою рэволюцыйнай напружанасьці, як гэта мае месца ў поэме, ня гледзячы на вобраз актыўнага змагара Паддубнага.

Характэрна ў поэме гуманістычная чуласьць да цёмных, балючых момантаў, якія нясе з сабой змаганьне; сутычкі чырвоных з ворагамі апісаны пераважна з боку іх крывавасьці і ў іх больш болю за кроў, чым протэсту супроць тых, хто вінаваты ў тым, што яна льлецца. У апісаньнях бойкі факт праліцьця чалавечай крыві і чалавечай пакуты, чалавечай наогул, дамінуе ў яго сьвядомасьці.

Цікавы ў поэме месцы, прысьвячаныя мяжы, што аддзяляе Савецкую Беларусь ад Заходняй Беларусі. Дамінуючы момант у апісаньнях мяжы – пасыуны протэст, сум. боль за тое, што частка радзімы знаходзіцца пад чужою ўладай, уладай чужой клясы.

На захадзе наскай радзімы,
Дзе болем у сэрцы мяжа,
Гарэў халаджава і дзіўна
Зары журавінны пажар...

На захадзе любай краіны,
Дзе горкаю крыўдай мяжа,
Як сумная песьня дзяўчыны
Сьпеў ветру надрыўна дрыжаў...

На захадзе роднага краю,
Дзе ранай балючай мяжа,
Пажарамі дні адгаралі
Адзетыя ў смутак і жаль... і г. д.

Гарачы і сумны лірызм гэтых месц вызначае і агульны характар поэмы, яго падкрэсьліваюць і мімаходныя замалёўкі прыроды, на фоне якіх даюцца падзеі.

Стылістычныя вобразы маюць псыхолёгічны характар і выражаюць зноў жа смутак:

І рэха плача за сялом,
Як ашуканая красуня...

Як сумная песьня дзяўчыны,
сьпеў ветру надрыўна дрыжаў... і г. д.

Гэты выразны псыхолёгізм стылістыкі, які наогул прасякае наскрозь усю поэму, зьяўляецца хваравітым зьявішчам у нашыя дні будаўніцтва і змаганьня, калі ўся ўвага аддаецца знадворнаму, а не нутраному

сьвету. Сучасны момант патрабуе ад поэзіі конкрэтнага прадметнага стылю.

Пабудова поэмы вызначаецца клачкаватасьцю. Пасьлядоўнасьці і неперапыннасьці замалёўкі няма. Даецца непасрэдны рад паасобных малюнкаў, зьвязаных між сабой толькі тэмай, а не пасьлядоўнасьцю. Прынцып пабудовы—шчапленьне, а не разгортваньне. Прамежкі між паасобнымі малюнкамі-кавалкамі запаўняюцца лірычнымі адступленьнямі і лірычнымі зваротамі. Такая будова зьяўляецца тыповай для романтычнай поэмы. Асабліва нагадваюць романтычную поэму лірычныя звароты да дум, да дубраваў, да дзеячых асоб, напрыклад:

Каршун, Каршун, ці не даволі
Гуляць з ліхою галавой?
Ці не даволі ў наскім полі
спраўляць крывавае жніво?
і г. д.

Калі наогул гэтыя лірычныя звароты нагадваюць романтычную поэму, дык у прыватнасьці яны нагадваюць і моцна нагадваюць Пушкіна. Зварот да Каршуна — ці-ж не нагадвае хоць-бы такіх Пушкінскіх радкоў:

Мария, бедная Мария... і г. д.

Нават пушкінскі рытм захаваны ў гэтых лірычных зваротах. Тут ня толькі падабенства з Пушкіным, тут нешта накшталт непасрэднага ягонага ўплыву.

У прынцыпе такога роду перайманьні нельга лічыць недапушчальнымі, і асабліва таму, што яшчэ ня скончыўся пэрыод станоўленьня новых мастацкіх форм і прыёмаў такіх, якія маюць органічнае сваяцтва з псыхо-ідэолёгіяй пролетарыяту. Але ў даным выпадку гэта дрэнна таму, што лірычныя адступленьні, якія ўжывае аўтар, паслабляюць рэволюцыйную напорыстасьць твору, робяць павольным тэмп вонкавай дзеі, што не адпавядае напружанасьці і дынаміцы нашага моманту, і, па-другое, таму, што гэтыя адступленьні не зьяўляюцца толькі гульнёй аўтара формамі, а маюць больш глыбокія падставы (установка на псыхолёгізм, романтычныя дачыненьні да асобы і г. д.).

Пры такім становішчы прыёмы, запазычаныя з літаратуры старога стылю, можна лічыць заганай. Нельга пахваліць аўтара і за тое, што агульным эмоцыянальным тонам поэмы зьяўляецца тон мінорны, а бадзёрыя моманты зьяўляюцца контрастуючымі сьветлымі выспачкамі. Ня гледзячы на вобраз сапраўднага змагара Паддубнага, поэма ня вытрымана ў пляне характару гэтага вобразу. І паколькі ў ёй у ролі асноўнага гэроя на зьмену адно аднаму выступаюць то Паддубны, то лірычнае „я“, мы бачым у ёй на кожным кроку спады то да абмяклага мякка-журботнага настрою, то да сумна-жахлівага, рытмы павольныя, словы мяккія, кволыя і сумныя, якія толькі пяшчотна, паціхутку сумна-сладасным дакрананьнем гладзяць па сэрцы.

Але далёка ня ўсё дрэнна ў гэтым творы. Ён мае свае дадатныя бакі. Хай ня ўзьнімае ён жалезнай змагарчай волі, але ён заражае шчырай і глыбокай сымпатыяй да змагароў, да такіх, якія, як Сяргіенка ў поэме, аддалі сваё жыцьцё справе рэволюцыі, заражае глыбокай прыхільнасьцю да самой гэтай справы. І гэта заражэньне тым мацнейшае, што яму спрыяе вялікая шчырасьць у поэме, якая, праўда, нібы парушаецца нацягнутым і схэматычным вобразам самога Каршуна, але ў асноўным захоўваецца, захоўваецца ў выказваньнях Паддубнага, у лірычных адступленьнях і г. д. Шчырасьць, цяплыня, вялікі лірызм—асноўныя вартасьці поэмы, тым больш, што далёка ня зжыта ў нас тое зьявішча, калі літаратура дае нам гучныя фразы, якія моцна трашчаць, а слаба дзейнічаюць.

Вобраз Паддубнага, ня гледзячы на тое, што на ім адчуваюцца романтычныя дачыненьні да асобы, сваімі словамі:

... як просты баец, як адданы салдат
за сваю рэволюцыю
ўсё я аддам...—

дзейнічае на чытача ў кірунку, патрэбным пролетарскай справе.

Мастацкае афармленьне поэмы, ня гледзячы на зазначаныя запазычаньні, вызначаецца даволі высокай якасьцю. У якасьці аднаго з дадатных бакоў мастацкага афармленьня можна зазначыць прастату мовы і яснасьць яе, што робіць твор шырокадаступным.

В. Зубко.

М. Гольдбэрг „На рыштаваньнях“. Белдзяржвыдавецтва. Менск, 1930. Балонак 110

Цана 45 кап. Тыраж 7000 экз.

Кніжка Гольдбэрга—гэта тое, што завецца літаратурай факту. У сучасны момант такі жанр займае ўсё больш пачэснае месца ў пролетарскай літаратуры. Гэта таму, што наша сучаснасьць, усё тое новае, што вялікай хваляй ідзе разам з рэконструкцыйным уздымам, патрабуе такіх літаратурных форм, якія-б стаялі ў непасрэднай блізкасьці да жыцьця, адлюстроўваючы дынаміку будаўнічых будняў у іх рэволюцыйнай значнасьці.

Літаратура факту будуецца на тым самым матар'яле, што друкуецца на старонках газэты. Але яна адрозьніваецца ад газэтнага артыкулу ці заметкі мастацкім абагуленьнем конкрэтнага грамадзкага зьявішча, што надае ёй вялікае організуючае значэньне.

Зб. „На рыштаваньнях“ зьяўляецца амаль першай спробай „фактычнай“ пабудовы твору ў беларускай літаратуры, адсюль ён мае асаблівую цікавасьць.

Для таго, каб выконваць сваю соцыяльную функцыю, літаратура факту павінна будавацца на матар'яле выключнай актуальнасьці, які мае цікавасьць і каштоўнасьць для шырокіх колаў савецкай грамадзкасьці.

Кніжка Гольдбэрга, бязумоўна, адпавядае гэтаму асноўнаму запатрабаваньню.

Беларуская вёска, якая руйнуе свой векавы індывідуалістычны побыт на падставе колгаснага руху і сучасная буйная фабрыка прамысловага цэнтру, з яго соцспаборніцтвам і новымі тэмпамі работы – вось тыя два стрыжні, вакол якіх пабудаваны зб. „На рыштаваньнях“.

Гэтыя два стрыжні, ня гледзячы на розную настайнасьць тэмы, не зьяўляюцца мэханічна аб'яднанымі. Яны органічна зьвязаны паміж сабой таму, што як вёска, так і фабрыка пададзены аўтарам у стане дынамікі, руху, ломкі старых і шуканьня новых, лепшых форм організацыі працоўнага грамадзтва.

Нарысы, прысьвячаныя вёсцы, усе аб'яднаны пад загалоўкам, які можна лічыць сучасным лёзунгам колгасу—„Руйнуем межы“. Тут, нібы перад вачыма чытача, праходзіць гісторыя зараджэньня колгасаў у раёне суцэльнай колектывізацыі з пачатковага організацыйнага сходу да таго моманту, калі селяніну прыходзіцца весьці сваю жывёлу ў абагулены хлеў. Яскрава паказаны момант клясавай барацьбы вакол новага колгасу. Цікава пададзены першыя крокі селяніна ў нязвычайных яму да гэтага ўмовах колектыўнай працы.

Агульны мотыў нарысаў, прысьвячаных колгасу,—гэта бадзёрасьць і жыцьцярадаснасьць. Аўтар, упэўнены ў посьпехах новае соцыялістычна перабудованай вёскі, падае гэтае перакананьне і чытачу.

Але нарысы ня маюць выгляду сьвяточнага плякату. Аўтар паказвае і цяжкасьці гэтага будаўніцтва. Расказвае ён аб тым, як цяжка было адмовіцца селяніну ад звычак уласьніцтва. Апавядае аб тым, як на кожным новым этапе пройдзенага шляху прыходзіцца змагацца з старымі звычаямі, як „сутыкаліся ілбамі сялянская сквапнасьць і комуністычная навіна“.

Нарыс „Ломка“ цалкам прысьвячаны новаму ў вёсцы, якая скідае з сябе звычаі, набытыя на працягу тысяч год, нібы старое адзеньне, што робіцца ў змаганьні, і змаганьні жорсткім.

„Не даядалі, мерзьлі, марылі і пасылалі праклёны, выкрывалі шкоднікаў і вучыліся політграмаце, і праз шчыльны шэры масыў будняў прабіваўся тоненькі, няпрыкметны раўчок навізны“.

Нарысы пра фабрыку згуртованы пад агульнай назвай „Энтузіястыя варштату“. Тут таксама, як і ў разьдзеле, прысьвячаным вёсцы, чытач знаходзіць жыцьцё, адлюстраванае ў яго дынаміцы. У гэтых нарысах даецца „сягоньня“ буйной фабрыкі прамысловага беларускага раёну. Аўтар расказвае аб падзеях, якія мелі месца на папяровай фабрыцы ў Добрушы.

Усе тыя факты, якія ён сабраў тут, расказваюць пра тое, як крок за крокам разгортваецца соцспаборніцтва на вытворчасьці, як энтузіястыя варштатаў змагаюцца за выкананьне прамфінпляну, уцягваючы ў свае шэрагі і робячы актывістымі тых, што да гэтага часу глядзелі на працу, як на неабходны абавязак.

Ізноў мы бачым што побач з хваляй энтузіязму, працоўным уздымам, які ахапляе сваёй бадзёрасьцю, паказаны перашкоды, з якімі прыходзіцца змагацца „энтузіястым варштату“.

Варожыя адносіны да лепшых ударнікаў з боку адсталай часткі цэху, нявер'е ў магчымасьць вытрымаць узятыя тэмпы да

канца. захапленьне колькасьцю за кошт якасьці -усё гэта знайшло водгук у нарысах Гольдбэрга.

Ужо з першага нарысу гэтага разьдзелу „Скіданьне ланцугоў“ аўтар імкнецца паказаць процэс ломкі старога і нараджэньня новага. Расказваючы пра выпадак антысэмітызму на фабрыцы „Гэрой Працы“, ён робіць гісторычны экскурс у мінулае фабрыкі і выкрывае соцыяльныя карэньні гэтага зьявішча.

Гольдбэрг успамінае тыя часы, калі фабрыка належала „его светлости варшавскому князю Паскевичу Эриванскаму“ і мэтай адказных яе кіраўнікоў зьяўлялася „разлажыць рабочых і зрабіць з іх пакорлівых, прывязаных навек да фабрыкі ўласьнікаў“.

Чытач уводзіцца ў баявыя моманты змаганьня „энтузіястаў варштату“ з старымі шкоднымі і нездаровымі традыцыямі і „стварэньня духу сапраўднай соцыялістычнай працы“.

Паўната з якой падае Гольдбэрг свой матар'ял чытачу, адсутнасьць аднабаковасьці і „сьвяточнага“ захапленьня зьяўляецца вельмі каштоўным бокам зб „На рыштаваньнях“.

Увесь зборнік пабудаваны на сапраўдных фактах, пра якія мы кожны дзень чытаем на балонках газэты. Сапраўдныя лічбы, вытрымкі з лістоў, плякатаў, заметкі з насьценгазэты, заявы, якія ўводзіць аўтар у якасьці дапаможных сродкаў,—усё гэта вельмі конкрэтызуе нарысы і набліжае іх да газэтнага матар'ялу.

Але тое, *як* пададзены гэты фактычны матар'ял, затрымоўвае ўвагу чытача, прымушае запомніць тую ці іншую сытуацыю, робіць моцнае ўражаньне.

Нарысы, ня гледзячы на сваю „фактычнасьць“, вельмі эмоцыянальны. Яны прасякнуты настроем, дзе лейтмотывам зьяўляецца ўпэўненасьць у соцыялістычнай будучыні былой адсталай краіны.

Гэтае палажэньне даводзіць аўтар двума сродкамі. Першы сродак—калі ён, як назіральнік той ці іншай зьявы, выказвае свае ўласныя ўражаньні ад рэчаў і зарэньняў, якія маюць месца вакол яго:

„Сотні, тысячы, мільёны вачэй бачаць ужо агні краіны, да якой мы плывём пад напятымі ветразямі гісторыі“.

Альбо:

„Я ехаў насустрач людзям, якія руйнуюць гэтыя межы, конфіскуюць ветракі і ломяць крыжы, і было радасна думаць, што жывеш на гэтай зямлі і сярод гэтых людзей, і адчуваць, як сьвежы вецер варушыць валасы на ілбе“.

Але яшчэ больш пераканальным зьяўляецца такі момант, калі аўтар, расказваючы пра той ці іншы факт вялікай грамадзкай вартасьці, ужывае зварот да конкрэтнай дэталі, ствараючы жывыя мастацкія малюнкі, паказваючы жывых прадстаўнікоў „энтузіястых варштату“ ці энтузіястых трактару.

Малюнкі з жыцьця новай вёскі, заводу, портрэты прадстаўнікоў актыву працоўных, дыялёгі—усё гэта зроблена некалькімі штрыхамі, узята ў такім выглядзе, як яно прадстаўляецца пільнаму, але занятаму наглядальніку. Гольдбэрг бярэ толькі тую дэталь, што дапамагае яму давесьці палажэньне аб вялікім рэволюцыйным пераломе ва ўсім гаспадарчым жыцьці краіны.

Але недахопамі з мастацкага боку трэба прызнаць тыя выпадкі, калі аўтар адыходзіць ад свайго прынцыпу „конкрэтызацыі дэталі“, пачынаючы называць шматлікія імёны тых людзей, з якімі яму прыходзілася сустракацца, што перашкаджае разгортваньню нарыса і марудзіць тэмп апавяданьня. прымушае чытача вельмі напружваць увагу на дробязях, якія трацяць сэнс „дробязі рэволюцыйнай“.

Таксама дысонансам гучаць у агульным конкрэтным характары нарысаў тыя моманты, калі аўтар нечакана выходзіць за межы компэтэнцыі назіральніка і паглыбляецца ў абмалёўку псыхічнага стану свайго гэроя. (Бяднячка Ганна вядзе каровуку ў абагулены хлеў). Ня гледзячы на жывы мастацкі малюнак, траціцца конкрэтная абалочка нарысу. Трэба сказаць, што такіх выпадкаў вельмі мала.

Зборнік „На рыштаваньнях“ сапраўды адпавядае сваёй назве. Калі чытаеш гэтую кнігу, нібы бачыш сябе на соцыялістычнай пабудове. Факты, узятыя Гольдбэргам, захапляюць і пераконваюць.

Адсюль грамадзкая каштоўнасьць гэтай кніжкі.

З. Мялкіх.

Рэдагуе **Рэдкалегія**. *Выдае* **Беларускае Дзяржаунае Выдавецтва**